СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА НА III КВАРТАЛ І II ПАЎГОДДЗЕ 2010 г.

Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	месяц	III квартал	паўгоддзе
63850 (індывідуальны)	12400	37200	74400
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	11600	34800	69600
63858 (ведамасны)	19900	59700	119400
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	18000	54000	108000

Заставайцеся з намі!

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

22 МАЯ 2010 г. СУБОТА № 98 (26706)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

У БЕЛАРУСІ ЎРЭГУЛЯВАНЫ ПЫТАННІ ВЯДЗЕННЯ БАНКА ЗВЕСТАК АБ ГРАМАДЗЯНАХ, ПРАВА НА ВЫЕЗД ЯКІХ ЧАСОВА АБМЕЖАВАНА

У Беларусі да ўступлення ў сілу адпаведнага закона ўрэгуляваны пытанні, звязаныя з парадкам прыняцця кампетэнтнымі органамі рашэнняў у адносінах да грамадзян, звесткі аб якіх унесены ў банк даных аб грамадзянах нашай краіны, права на выезд якіх часова абмежавана. Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы, Аляксандр Лукашэнка 21 мая падпісаў указ № 271 «Аб некаторых пытаннях вядзення банка даных аб грамадзянах Рэспублікі Беларусь, права на выезд якіх з Рэспублікі Беларусь часова абмежавана».

Дакумент накіраваны на карэкціроўку шэрагу актаў Прэзідэнта ў сувязі з прыняццем закона ад 20 верасня 2009 года «Аб парадку выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў Рэспубліку Беларусь грамадзян Рэспублікі Беларусь».

Уносяцца змяненні і дапаўненні ў наступныя акты кіраўніка дзяржавы:

ва ўказ ад 19 лютага 1996 года № 82 «Аб зацвярджэнні Консульскага статута Рэспублікі Беларусь», у тым ліку ў частцы прадастаўлення консулу права на прыняцце рашэнняў па пытаннях афармлення пастаяннага пражывання за межамі Рэспублікі Беларусь беларускіх грамадзян, якія выехалі з Беларусі для часовага знаходжання за яе межамі;

ва ўказ ад 17 снежня 2007 года № 643 «Аб спрашчэнні парадку выезду з Рэспублікі Беларусь» у частцы выкладання ў новай рэдакцыі палажэння аб банку звестак аб грамадзянах Беларусі, права на выезд якіх з Беларусі часова абмежавана, у сувязі са змяненнем парадку ўнясення ў банк даных звестак, яго вядзення і выкарыстання;

ва ўказ ад 3 чэрвеня 2008 года № 294 «Аб дакументаванні насельніцтва Рэспублікі Беларусь» у частцы ўстанаўлення дадатковых падстаў для адмовы ў выдачы пашпарта для пастаяннага пражывання за межамі Рэспублікі Беларусь, якімі з'яўляюцца прыняцце дзяржаўнымі органамі і іншымі юрыдычнымі асобамі рашэнняў аб часовым абмежаванні права грамадзян на выезд з Рэспублікі Беларусь і невыкананне грамадзянамі абавязкаў, прадугледжаных законам (напрыклад, невыкананне падатковых, аліментных абавязацельстваў). Акрамя таго, удакладняецца парадак выдачы і абмену пашпарта грамадзянам Рэспублікі Беларусь, якія жадаюць выехаць на пастаяннае жыхарства за межы рэспублікі або аформіць пастаяннае пражыванне за межамі Беларусі (для тых, хто часова знаходзіцца за межамі Рэспублікі Беларусь).

Беларусь прапануе актывізаваць увядзенне расійскага рубля ў якасці рэгіянальнай рэзервовай валюты ў ЕўрАзЭС

Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на пасяджэнні Міждзяржсавета ЕўрАзЭС (на ўзроўні кіраўнікоў урадаў) у Санкт-Пецярбургу, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Мінэканомікі Беларусі накіравала ў Адміністрацыю Прэзідэнта план мерапрыемстваў па далейшай лібералізацыі эканомікі

Аб гэтым на семінары для беларускіх парламентарыяў, прысвечаным падтрымцы і развіццю малога і сярэдняга бізнэсу, паведаміў намеснік міністра эканомікі Анатоль Філонаў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

У ліку мерапрыемстваў плана — удасканаленне механізмаў прыватызацыі дзяржмаёмасці, скарачэнне пераліку ліцэнзуемых відаў дзейнасці з 53 да 38. Акрамя таго, магчыма звужэнне сферы дзяржрэгулявання цэнаў. Мінэканомікі таксама перадала і прапановы па Дырэктыве № 4. Анатоль Філонаў таксама паведаміў, што дзякуючы мерам па лібералізацыі плануецца да 2015 года павялічыць долю малога і сярэдняга бізнэсу ў ВУП да 30 працэнтаў (у 2009-м — 11,4 працэнта). На гэты момант, паводле звестак Міністэрства па падатках і зборах, у краіне на ўліку знаходзяцца больш як 80,6 тыс. суб'ектаў малога прадпрымальніцтва (юрыдычных асобаў). У параўнанні з аналагічным перыядам 2009 года іх колькасць узрасла на 14,5 працэнта, а з пачатку года — на 2,5 працэнта. У сферы малога бізнэсу па выніках 2009 года працавала 20,4 працэнта людзей, занятых у эканоміцы. У мінулым годзе суб'екты малога прадпрымальніцтва вырабілі 9,1 працэнта ад агульнага аб'ёму прамысловай вытворчасці (у 2008-м — 8,4 працэнта).

Парадак выдачы швейцарскіх візаў для беларусаў змяняецца з 24 мая

Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага МЗС.

Шэнгенскія візы тыпу A і C (без права работы па найму) для наведвання Швейцарыі беларускім грамадзянам будуць выдавацца Пасольствам Венгрыі ў Беларусі. Кошт шэнгенскай візы — 60 еўра. Афармленне візы будзе весціся на працягу 15 каляндарных дзён.

Консульскі аддзел Пасольства Венгерскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь знаходзіцца па адрасе: 220034, г. Мінск, вул. Платонава, 1/б, тэл. 233 94 16, факс 233 94 17.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ДОБРАЯ ТРОІЦА

Святкаванне Тройцы (Сёмухі) у вёсцы Дабраволя Свіслацкага раёна.

Твае правы

ДАКУМЕНТЫ НЕ «ПСУЮЦЦА»

Збіраць звесткі аб пенсійным стажы і заробках лепш загадзя

Сяргей ГРЫБ

ПАВОДЛЕ звестак Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, летась у Беларусі на пенсію выйшла амаль 131 тысяча чалавек. Прычым не сакрэт, што ў сувязі з дэмаграфічнымі рэаліямі ў будучыні гэтая лічба будзе ўзрастаць, а адсюль — і традыцыйна вялікая цікавасць да тэмы афармлення пенсій. Хто тут павінен збіраць неабходныя дакументы, што залічваецца ў стаж, як можна аднавіць звесткі аб ранейшых заробках і ці абавязкова выходзіць на пенсію адразу ж пасля дасягнення патрэбнага ўзросту? Усе гэтыя і іншыя пытанні сталі галоўнымі падчас спецыяльнай «прамой лініі», якая была наладжаная днямі Камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама.

КАЛІ ПАЧЫНАЕЦЦА ПОШУК?

Для пачатку варта адзначыць: грамадзяне, якія працуюць, павінны звяртацца за прызначэннем пенсіі па апошнім месцы працы. Адпаведна падрыхтоўка неабходных дакументаў і іх перадача ў орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне з'яўляецца абавязкам работадаўцы. І распачынаць гэтую работу той жа работадаўца павінен загадзя — за год да таго, калі ў супрацоўніка з'явіцца права на пенсію па ўзросце, па выслузе, паводле Спісаў № 1 і № 2.

— Калі ж чалавек не працуе, то заняцца зборам дакументаў ён павінен самастойна, і зрабіць гэта зноў жа неабходна загадзя, — распавядае начальнік аддзела прызначэння і выплаты пенсій камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Ала Колбік. — Не адкладваць усё на апошні момант трэба па вельмі простай прычыне. Можа ўзнікнуць сітуацыя, калі таго або іншага дакумента «не хопіць». У такім выпадку пасля звароту ў орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне будзе выдадзена паведамленне і дадзены месяц на збор дадатковых звестак. Калі чалавек укладваецца ў месяц пасля паведамлення і паспявае сабраць гэтыя дадатковыя звесткі, то з іх улікам пенсія прызначаецца з дня падачы заявы або з дня дасягнення патрэбнага ўзросту. А калі месяца пасля паведамлення аказваецца мала, то пенсія прызначаецца выходзячы з дакументаў, якія ёсць. І пераразлік пенсіі робіцца ўжо з больш позняй даты — пасля прадстаўлення дадатковых звестак.

Дарэчы, як правіла, пенсійныя звесткі «не псуюцца». Збіраць іх можна нават за некалькі гадоў да дасягнення неабходнага ўзросту. А часам пачынаць «датэрміновыя» пошукі дакументаў проста неабходна — не сакрэт, што многія арганізацыі былі рэарганізаваныя ці нават ліквідаваныя, і калі-нікалі знайсці іх архівы сёння складана.

— Адно, што няма неабходнасці збіраць дакументы аб працы пасля 1 студзеня 2003 года, — заўважае Ала Колбік. — Менавіта з гэтай даты ў Беларусі ўведзены персаніфікаваны ўлік адлічэнняў на сацыяльнае страхаванне, і, такім чынам, атрымаць усю інфармацыю аб стажы і заробках кожнага чалавека можна па базе Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

КНІЖКА І НЕ ТОЛЬКІ

Асноўны дакумент для пацвярджэння стажу — працоўная кніжка. Аднак тут трэба мець на ўвазе, што калі запісы ў працоўнай кніжцы зробленыя няправільна або калі ў кніжцы ёсць не завераныя ва ўстаноўленым парадку выпраўленні, то будучага пенсіянера могуць папрасіць прынесці дадатковыя даведкі — зноў жа аб працы да 1 студзеня 2003 года.

— Апроч таго, могуць спатрэбіцца дыпломы ці атэстаты, якія сведчаць аб навучанні на дзённых аддзяленнях ВНУ, тэхнікумаў, калежаў, ПТВ, — працягвае Ала Колбік. — Мужчынам давядзецца прынесці вайсковы білет, а пры яго адсутнасці — даведку з ваенкамата. Бацькам або іншым працаздольным асобам, якія даглядалі дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў, неабходна прад'явіць пасведчанні аб іх нараджэнні, былым беспрацоўным — даведкі са службы занятасці, а асобам, якія даглядалі дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў, інвалідаў I групы ці састарэлых ва ўзросце больш за 80 гадоў — дакументальнае пацвярджэнне догляду, якое ўстанаўліваецца раённай камісіяй па прызначэнні пенсій.

Зрэшты, у залежнасці ад канкрэтнай сітуацыі гэты пералік можа быць большым, таму перад падачай заявы на пенсію лепш за ўсё пракансультавацца ў работадаўца, а пры яго адсутнасці — у раённым органе па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Скажам, можа аказацца, што той жа дыплом афармлены на дзявочае прозвішча жанчыны — у такім разе прыйдзецца пасведчанне аб шлюбе.

СТАР. 4

НА ВЫХАДНЫЯ ЯШЧЭ ЦЁПЛА І ДАЖДЖЫ

З серады наступнага тыдня істотна пахаладае

Паведаміла рэдакцыі начальнік аддзела метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Людміла ПАРАШЧУК.

У суботу ўдзень — 20—26. У нядзелю — невялікія навальнічныя дажджы. Уначы — 8—14, удзень — 18—24. З панядзелка пачнуцца дажджы. Удзень — да 13 на поўначы і 20 на поўдні краіны, уначы 8—14. У сярэдзіне наступнага тыдня ўвогуле істотна пахаладае, ўначы будзе не больш за 2—9, удзень — 10—17. Такое халоднае і няўстойлівае надвор'е захаваецца да апошніх дзён мая.

Сяргей КУРКАЧ.

У Полацку адкрылі адноўлены помнік героям вайны 1812 года

— Полацк — гістарычны цэнтр Беларусі, цэнтр праваслаўя, — адзначыў старшыня Полацкага гарвыканкама Уладзімір ТАЧЫЛА. — Гісторыя Полацка — гэта гісторыя войнаў, адвагі і мужнасці... Праз 160 гадоў мы адкрываем адноўлены помнік героям.

Дарэчы, аналагічны помнік адкрыецца хутка ў расійскім горадзе Малаяраслаўец. І што паказальна, зробяць яго ў Полацку. Ад Полацка да Малаяраслаўца больш за 620 кіламетраў. Дэталі помніка дастаўляць на чыгунцы і грузавікамі. Падчас цырымоніі адкрыцця сваё майстэрства паказалі ваеннаслужачыя роты ганаровай варты. А члены клубаў гістарычнай рэканструкцыі нават стралялі з гарматы часоў вайны 1812 года.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«КІРЫЛІЦА»: ЗРОБЛЕНА ДЛЯ СЛАВЯН

Навучыся пісаць і чытаць — станеш чалавекам

Так лічаць цяпер. Лічылі і нашы продкі больш за 1000 гадоў таму. Дзеля таго, каб чытаць святыя кнігі, прынялі азбуку ад асветнікаў Кірыла і Мяфодзія, якія накіраваліся ў славянскія землі, каб данесці людзям гісторыю ахвярнасці Хрыста на зразумелай ім мове. Дзеля гэтага давялося нават спецыяльны алфавіт скласці. Вынаходніцтвам братоў, якія былі прызнаная святымі за сваё асветніцкае служэнне, мы карыстаемся дагэтуль. Таму і маем свята ў гонар СВЯТЫХ, якое адзначаецца 24 мая — царквой і грамадствам: Дзень славянскага пісьменства.

Славяне шукалі «вестак ад Бога»: ёсць паданне, што візантыйскі цар Міхаіл даручыў вучоным братам важную справу, адгукнуўшыся на просьбу славянскіх князёў. Канстанцін, можна сказаць, паклаў жыццё на гэта: з імем Бога шчыраваў над адмысловым алфавітам і, магчыма, атрымаў сапраўднае азарэнне, бо нават прыняў манаства з імем Кірыл. Спачатку для перадачы гучання была створана сістэма з 38 літар — «глаголіца», якая не была падобная ні на адно пісьмо, якое ўжо існавала. Лічыцца, што праца была скончана да 863 года. А ўжо напрыканцы IX — пачатку X стагоддзяў паслядоўнікамі асветнікаў быў створаны новы славянскі алфавіт, у які ўвайшлі таксама літары з глаголіцы. Пераемнасць захавалася нават у назве — у гонар першага стваральніка пісьма для славян. Менавіта ім пісаліся потым летапісы, царкоўныя кнігі, а далей і свецкія... Пішуцца і цяпер. Так, у пэўныя перыяды ў пэўных рэгіёнах — у тым ліку на тэрыторыі нашай краіны — было распаўсюджана і лацінскае напісанне. Аднак самыя першыя і галоўныя веды пра тое, як жыць чалавеку ў гэтым свеце, прынесла кірыліца, стварыўшы глебу для развіцця літаратуры і культуры народа. Таму 24 мая ёсць у нас гэтае свята. Царква ўслаўляе святых Кірыла і Мяфодзія. Ладзяцца культурныя мерапрыемствы да Дня славянскага пісьменства. Але каб кожны мог усвядоміць сваю пісьменнасць, варта ў гэты дзень хоць бы адкрыць кніжку.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ЗА ГОД КРЭДЫТЫ ПАТАННЕЛІ НА 3,24 ПРАЦЭНТА

Поўная працэнтная стаўка па новых крэдытах юрыдычным, фізічным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам у сёлетнім красавіку склала 18,41 працэнта і ў параўнанні з красавіком мінулага года зменшылася на 3,24 працэнтнага пункта, паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі Міхаіл ЖУРАВОВІЧ.

За год патаннелі і крэдыты ў СКВ юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам на 2,92 працэнтнага пункта: поўная працэнтная стаўка па іх у мінулым месяцы склала 10,6 працэнта. Нагадаем, прадугледжанае зніжэнне да канца 2010 года стаўкі па новых крэдытах нефінансаваму сектару да 12—15 працэнтаў. Што ж датычыцца агульнай сумы крэдытаў, выдадзеных банкамі сёлета за чатыры месяцы, то яна ўзрасла ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 41,2 працэнта, ці на 8,94 трыльёна — да 30,63 трыльёна рублёў. У цэлым запазычанасць эканомікі і насельніцтва па банкаўскіх крэдытах на 1 мая дасягнула 68,05 трыльёна рублёў і ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам узрасла на 17,07 трыльёна рублёў, ці на 33,5 працэнта. Пры тым запазычанасць па кароткатэрміновых крэдытах павялічылася на 4,38 трыльёна рублёў, ці на 32,1 працэнта, і склала 17,96 трыльёна рублёў, па доўгатэрміновых крэдытах — на 12,71 трыльёна, ці на 34 працэнты, і склала 50,1 трыльёна рублёў. Узрасла і доля рублёвага складніка ў агульным аб'ёме крэдытнай запазычанасці: калі год таму ён складаў 72,6 працэнта, то цяпер — 84,4 працэнта.

Ігар ГРЫШЫН.

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»,

расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 31 МАЯ 2010 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 28 мая), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 31 мая) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

Дата окончания приема бюллетеней – 28 мая 2010 года.

Телефоны для справок: (8 017) 218 84 65, 218 84 73.

УНП 100325912.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ГЕРМАНІЯ ЗНОЎ РАТУЕ ЕЎРА

Нямецкі бундэстаг у пятніцу, 21 мая, ухваліў шматмільярдныя асігнаванні ў агульны еўрапейскі антыкрызісны стабілізацыйны фонд, заснаваны для ўмацавання еўра і падтрымкі тых дзяржаў ЕС, якія ў адзіночку не могуць справіцца з ростам дзяржаўнай запазычанасці, паведамляе Spiegel.

Унёсак нямецкага боку ў антыкрызісны фонд, аб'ём якога ацэньваецца ў 750 мільярдаў еўра, павінен скласці 148 мільярдаў. Адзначаецца, што законапраект атрымалася прыняць з перавагай усяго ў сем галасоў: пры неабходнай абсалютнай (канцлерскай) большасці ў 312 галасоў за асігнаванні прагаласавалі 319 дэпутатаў.

РАСІЯ ПРАПАНАВАЛА ПОЛЬШЧЫ РАЗАМ БУДАВАЦЬ АЭС

Расія прапанавала Польшчы разам будаваць Балтыйскую атамную электрастанцыю ў Калінінградскай вобласці. Пра гэта заявіў міністр інфраструктуры Польшчы Цезары Грабарчык пасля пасяджэння расійска-польскай міжурадавай камісіі па эканамічным супрацоўніцтве.

Паводле слоў Грабарчыка, Расія плануе экспартаваць электраэнергію з АЭС у Еўропу, у чым ёй можа дапамагчы Польшча. Пры закладцы першага каменя Балтыйскай АЭС кіраўнік «Расатама» Сяргей Кірыенка ўжо заяўляў, што Расія гатовая прыцягнуць да будаўніцтва замежных фундатараў, але адзначаў, што абавязковай задачы прадаць долю у АЭС у «Расатама» няма. У перспектыве Расія можа аддаць інвестарам да 49 працэнтаў электрастанцыі.

Чакаецца, што першы энергаблок Балтыйскай АЭС будзе пабудаваны ў 2016 годзе, а другі — у 2018-м. Разам яны дадуць 2,3 тысячы мегаватаў магутнасці.

ВІСЛА ПАГРАЖАЕ ЗАТАПІЦЬ ВАРШАВУ

Вада ў Вісле ў Варшаве перавышае максімальна дапушчальны ўзровень на адзін метр, паведамілі інфармагенцтвам у антыкрызісным штабе Мазавецкага ваяводства.

Узровень вады ў Вісле ўчора складаў 753 сантыметры. Паводле падлікаў адмыслоўцаў, да 19.00 па сярэднееўрапейскім часе ўзровень вады ў рацэ мог дасягнуць адзнакі 800 сантыметраў. Пры такім узроўні з'яўляецца рэальная пагроза прарыву вялікай вадой ахоўных валаў уздоўж ракі. Калі вада прарве зямельныя ўмацаванні, пад пагрозай апынуцца да 100 тыс. жыхароў Варшавы і яе прадмесцяў.

Мэр польскай сталіцы ўчора звярнулася да варшавян з заклікам не паддавацца паніцы і захоўваць спакой. Паводле яе слоў, сітуацыя сур'ёзная, але пакуль рана казаць пра пагрозу. Для ўмацавання берагоў Віслы і ахоўных валоў вылучана 1,5 тыс. тон пяску і 90 тыс. мяшкоў. Акрамя пажарных, паліцыі і гарадской варты ва ўмацаванні берагоў найбуйнейшай польскай ракі дапамагаюць скаўты, салдаты і жыхары сталіцы. Гарадское кіраванне адкрыла адмысловую тэлефонную лінію для добраахвотнікаў, якія жадаюць дапамагчы ва ўзвядзенні ахоўных бар'ераў ад вады.

Сітуацыя ў паўднёвай Польшчы, якая найбольш пацярпела ад паводкі, паступова стабілізуецца, узровень вады ў рэках не павялічваецца. Колькасць смерцяў у краіне ў выніку паводкі павялічылася да 9 чалавек, трое лічацца зніклымі без вестак.

Ходзяць чуткі, што...

ЕЎРА ЎПАДЗЕ НІЖЭЙ ЗА ДОЛАР

З СЯРЭДЗІНЫ гэтага тыдня назіраецца ўзнаўленне курса еўра, учора еўра на сусветных пляцоўках падаражэў да 1,26 долара з папярэдніх 1,24 долара. Тым не менш выказваюцца меркаванні, што падзенне еўрапейскай валюты ў далейшым немінучае.

Што ж датычыцца апошніх падзей, то, паводле ацэнак экспертаў, удзельнікі рынку разлічваюць на тое, што будуць выпрацаваныя захады па стрымліванні даўгавога крызісу ў еўразоне на пасяджэнні міністраў ЕС. Між тым розныя спецыялісты прадказваюць розныя сцэнары далейшага развіцця падзей: ад парытэту долара да еўра да падзення апошняга ніжэй парытэту з доларам. Прынамсі, многія з іх схіляюцца да думкі, што дно еўра пакуль не дасягнутае. Разам з тым, гэтыя ж эксперты кажуць пра тое, што гэтае дно дзесьці побач. Таму доўгатэрміновы прагноз па еўра згаданых спецыялістаў вагаецца ў межах ад 1,1 да 1,2 долара за еўра. Праўда, ёсць і іншыя меркаванні, больш аптымістычныя, паводле якіх еўра ўдасца «дакарабкацца» ўжо сёлета да ўзроўню ў 1,3 долара і нават вышэй. Аднак ёсць і такія, што, як было адзначана вышэй, кажуць — еўра будзе каштаваць менш за долар.

Як бачна, прагнозы ў аналітыкаў розныя, але не трэба забываць, што яны не абавязковыя «да выканання», гэта значыць, не заўсёды спраўджваюцца. Згадаем толькі, чаго былі вартыя заявы, падавалася б, некаторых сур'ёзных эканамістаў наконт краху долара, якога так і не адбылося. Таму, раяць эксперты нашай газеты, не трэба нервова рэагаваць на цяперашнія валютныя ваганні, таму што перавод еўра ў тыя ж долары прынясе толькі страты. Дарэчы, учора на таргах Беларускай валютна-фондавай біржы курс еўра таксама вырас — крыху больш як на 30 беларускіх рублёў, і яго афіцыйны курс на сёння вызначаны на ўзроўні 3 747,94.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

ПРАС ЯК РЭЧАВЫ ДОКАЗ

канфіскаваны з месца злачынства — прыватнага дома ў вёсцы Дабрынь Ельскага раёна.

Яго адбітак у выглядзе апёку знойдзены на жываце 72-гадовай грамадзянкі, якая знаходзіцца на вылячэнні ў мясцовай бальніцы. А пачыналася ўсё з таго, што раніцай сталая жанчына разам з 54-гадовай знаёмай сумесна ўжывалі алкагольныя напоі. Потым, каб «дагнацца», маладзейшая запатрабавала ў бабулькі грошай на спіртное — з дапамогай праса. Грамадзянцы, якая асэнсоўвае зробленае ў ізалятары часовага ўтрымання, прад'яўлена абвінавачванне ў разбойным нападзе.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

«ЗАРАБІЎ» СЁМЫ ТЭРМІН

Зладзюжка, якога раней судзілі шэсць разоў за кватэрныя крадзяжы, зноў наступіў на тыя ж граблі.

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» прэс-афіцэр Фрунзенскага РУУС Ала Галубовіч, да крымінальнага «заробку» 38-гадовы мінчанін вярнуўся пасля таго, як адчуў вострую патрэбу ў грошах: апошнія паўгода ён бадзяўся па здымных кватэрах, а бывала, што начаваў нават у пад'ездах. Разжыўшыся неабходным інструментам — манціроўкай, фомкай і іншым «інвентаром», зладзюжка вырашыў паспытаць шчасця на новабудоўлі па вуліцы Кунцаўшчына. Выбраўшы кватэры, дзе пакуль няма жыхароў-наваселаў, ён узламаў 9 з іх у двух пад'ездах. Здабычай рэцыдывіста ў асноўным стаў будаўнічы інструмент, які ён склаў у спартыўныя сумкі і прыхаваў на чорным ураходзе аднаго з пад'ездаў. Раніцай ажаступнага дня злодзей наведаў рынкі горада, каб даведацца, дзе можна збыць крадзенае. А калі вечарам вярнуўся па сумкі, яго ўжо чакалі супрацоўнікі крымінальнага вышуку... Чарговы «залёт» абыдзецца яму ў тэрмін да чатырох гадоў пазбаўлення волі.

Ігар ГРЫШЫН.

БРАКАНЬЕРЫ ПАЙШЛІ НА ТАРАН

Пачуўшы чатыры стрэлы ў паляўнічых угоддзях, работнікі Мастоўскай міжрайінспекцыі разам з прадстаўнікамі арандатара — ТАА «Белая сцежка» арганізавалі засаду.

Паспрабавалі спыніць легкавы аўтамабіль «Масквіч-2141», які выехаў з лясного масіву з боку, адкуль прагучалі стрэлы. Аднак вадзіцель толькі павялічыў хуткасць. Пры гэтым ён зачапіў службовы аўтамабіль дзяржінспектараў, пашкодзіўшы яму бампер. Праз 300 метраў «Масквіч-2141» спыніўся і людзі, што былі ў ім, збеглі ў лясны масіў. У багажніку знайшлі тушу самкі дзіка з агнястрэльным раненнем, а ў салоне — аптычны прыцэл.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

24 мая 2010 г. у 14.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) працягне работу чацвёртая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.05.2010 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 995,00	1 чэшская крона	144,83
▲ 1 еўра	3 747,94	1 польскі злоты	903,06
1 латвійскі лат	5 290,12	▼ 1 расійскі рубель	96,43
1 літоўскі літ	1 083,87	1 украінская грыўня	377,99

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	31,0576
10 UAH	39,1968
1000 BYR	10,3664
EUR	39,0115

Агенцтва Уладзіміра Грыўцова

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» ИНФОРМИРУЕТ

В извещении о проведении 28 мая 2010 года 99-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды (сроком на 5 лет) зданий, сооружений и помещений коммунальной собственности г. Минска (газета «Звязда» от 15 мая 2010) внести следующие изменения, изложив строки № 26 и 78 в следующей редакции:

26	Ул. Цнянская, 1, помещение на первом этаже, имеется отопление, санузел, отдельный вход, требуется ремонт. Под административные цели (офис).	24,6	1 000
78	Д. Острошицкий городок, Минский р-н, спальный корпус № 6 в четырехэтажном кирпичном здании, имеется отопление, канализация, водоснабжение и энергоснабжение, требуется ремонт. Под административные цели (офис).	937,0	16 400

Телефон для справок 227 40 22.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «КУЗНЕЧНЫЙ ЗАВОД ТЯЖЕЛЫХ ШТАМПОВОК» (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже незавершенных строительством незаконсервированных объектов, расположенных по адресу: г. Жодино, ул. Кузнечная, 26, в составе:

цех крупного литья, об. пл. 40 224 кв.м; административно-бытовой корпус, об. пл. 2 146 кв.м; блок мокрой очистки, об. пл. 2 383 кв.м. Начальная цена с НДС (снижена на 20 %) – 6 992 287 680 бел. руб. Задаток – 100 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 03.03.2010. Аукцион состоится **10.06.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 09.06.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12. Сайт в интернете: www.rlt.by.

«ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ» КАМІТЭТА ДЗЯРЖАЎНАГА КАНТРОЛЮ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

У Камітэце дзяржаўнага кантролю Мінскай вобласці ў перыяд з 01.06.2010 па 02.07.2010 па тэлефонах 284 13 38, 202 11 57, 284 03 42 будзе праводзіцца «гарачая лінія» з насельніцтвам вобласці па пытаннях, якія датычацца жыццядзейнасці Барысаўскага раёна. Па гэтых тэлефонах вы можаце паведаміць пра існуючыя праблемы ў Барысаўскім раёне і магчымых шляхах іх вырашэння, недахопы ў працы службовых асобаў органаў дзяржаўнага кіравання і арганізацый пры вырашэнні вашых надзённых праблем, факты валакіты і бюракратызму пры разглядзе зваротаў, выпадкі незаконнага і неэфектыўнага выкарыстання дзяржаўных сродкаў і маёмасці, разбазарвання дзяржаўнай уласнасці, іншыя парушэнні і злоўжыванні.

Нас таксама цікавяць звесткі пра нядбайнае стаўленне да зямельных і прыродных рэсурсаў (уключаючы незахаванне культуры землекарыстання), нерацыянальнае расходаванне дзяржаўных сродкаў і ўласнасці, неналежнае выкананне Дырэктывы Кіраўніка дзяржавы аб эканоміі і беражлівасці, факты вытворчасці і рэалізацыі няякаснай прадукцыі, працы са стратамі і на склад і інш.

Будзем удзячныя за ўнесеныя прапановы па ўдасканаленні працы мясцовых органаў улады і па паляпшэнні ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця гэтага рэгіёна.

Камітэт дзяржаўнага кантролю Мінскай вобласці.

ЛЕПШАЯ ДЫПЛАМАТЫЯ — ЭКАНОМІКА

Гандлёва-эканамічнае і інвестыцыйнае супрацоўніцтва паміж рэгіёнамі Беларусі і Літвы павінна ўмацоўвацца ўзаемавыгаднымі праектамі. Канкрэтныя крокі ў гэтым кірунку зрабілі ўдзельнікі VI беларуска-літоўскага эканамічнага форуму, які прайшоў на Гродзеншчыне.

У першы дзень каля шасцідзесяці мэраў літоўскіх органаў тэрытарыяльнага самакіравання азнаёміліся з эканамічным патэнцыялам Лідскага рэгіёна, пабывалі на прадпрыемствах «Лідаграпрамаш», «Лідсельмаш» і «Лідскае піва». А затым яны накіраваліся ў Гродна, дзе ўчора адбыўся эканамічны форум з удзелам кіруючых работнікаў міністэрстваў, ведамстваў і дзелавых колаў абедзвюх краін.

Пасля леташняга спаду сёлета таваразварот Беларусі з Літвой павялічваецца. Суседзі зацікаўленыя ў цесным супрацоўніцтве, пра што сведчыць, напрыклад, пашырэнне дылерскай сеткі прадпрыемстваў Гродзенскай вобласці ў Літве. А таксама той факт, што дзякуючы літоўскаму капіталу на Гродзеншчыне працуюць 23 сумесныя прадпрыемствы і 38 — стапрацэнтна літоўскія.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

З ГАНДУРАСАМ І ПАЎДНЁВАЙ КАРЭЯЙ РЫХТУЕМСЯ ДА ФРАНЦЫІ

Футбалісты нацыянальнай каманды натрэніруюць хуткасныя контратакі і «пас-забойцу»

УПАНЯДЗЕЛАК, 24 мая, нацыянальная зборная па футболе накіруецца ў Аўстрыю, дзе правядзе два таварыскія матчы з камандамі-фіналісткамі сёлетняга чэмпіянату свету па футболе ў Паўднёвай Афрыцы. Імёны гэтых суперніка ў даўно вядомыя — каманда Паўднёвай Карэі і зборная Гандураса. А потым у нашу сталіцу прыедзе зборная Швецыі, і 2 чэрвеня мы пабачым яе на стадыёне «Дынама» ў матчы з нашай камандай. Напярэдадні гэтых сустрэч галоўны трэнер каманды Бернд Штанге расказаў, што нам чакаць ад гэтых каманд і як сябе адчуваюць нашы лепшыя футбалісты.

«Прайшло тры месяцы пасля нашага апошняга таварыскага матчу, і мы з цікавасцю чакаем, як згуляе нацыянальная каманда супраць двух фіналістаў чэмпіянату свету і знакамітай каманды Швецыі», — распачаў сустрэчу з журналістамі як заўсёды ў аптымістычным настроі Бернд Штанге. Спачатку ён расказаў пра нашу каманду: «Мы запрасілі 21 гульца. Былі і адмовы. Цімафей Калачоў траўмаваны. З ім, дарэчы, у Магілёве падчас тыдня футбола мы выпілі па кубку кавы і абмеркавалі нашы планы. 7 чэрвеня ён прыступае да рэабілітацыі. Пасля яго страшнай траўмы мы думалі, што ён вылятае з каманды на паўгода, але ён прагне вярнуцца ў строй. Не будзе Кутузава, які 7 месяцаў не гуляў і пакуль не можа. Медыцынскія аддзяленні «Штутгарта» і «Барселоны» прынялі рашэнне, што аперацыя Аляксандру Глебу патрэбная менавіта зараз. І ўсім скептыкам я магу пярэчыць, што гэта дасць нам шанс атрымаць Глеба ў вераснi на гульню супраць Францыі. Выпадае Ковель, не атрымаў дазволу пакінуць свой кітайскі клуб Слава Глеб. Такім чынам, 5 гульцоў не прыме ўдзел у таварыскіх матчах», — паведаміў галоўны трэнер. У каманду на гульню са Швецыяй будзе запрошаны Ягор Філіпенка, акрамя яго выкліканы нападаючы кіеўскага «Дынама» Андрэй Варанкоў.

У варотах нашай каманды дзве гульні, хутчэй за ўсё, правядзе Юрый Жаўноў. Бернд Штанге растлумачыў, што нягледзячы на адсутнасць гульнявой практыкі ў «Зеніце», варатар трэніраваўся на топ-узроўні. І трэба яму давяраць. А Юрый у сваю чаргу павінен даказаць свой высокі клас. У адборачных матчах галоўны трэнер збіраецца разлічваць на трох варатароў: Жаўнова, Амельчанку і Верамко.

Наконт будучых суперні каў у таварыскіх матчах Бернд Штанге падкрэсліў, што Гандурас і Паўднёвая Карэя, фіналісты планетарнага першынства, у футбольным свеце зусім не экзотыка. Экзотыка ў такім выпадку там хутчэй Беларусь. «Паўднёвая Карэя ў свеце футбола мае высокі рэйтынг. Яе гульцы вядомыя ва ўсім свеце, яны выступаюць за «МЮ», «Шальке», у чэмпіянаце Іспаніі. Гэта моцная каманда, і з ёй мы будзем мець праблемы. Пра Гандурас мы не так шмат ведаем. Яны гуляюць у паўднёваамерыканскі футбол, з кароткім пасам. А мы будзем імкнуцца правесці нашу гульню».

Далей галоўны трэнер расказаў пра саму гульню. «У нашай каманды ёсць свой твар. Але 1-2 кампаненты я яму дадам. Гэта хуткія контратакі. І калі параўноўваць нас з Францыяй, нашым першым суперні кам у кваліфікацыі, то ў гэтым кампаненце мы аўтсайдары. Таксама нам трэба якасна палепшыць апошні пас, так званы «пас-забойцу».

Падчас чэмпіянату свету ў Паўднёвай Афрыцы Бернд Штанге будзе знаходзіцца там і сачыць за Францыяй. Супраць гэтай зборнай у якасці трэнера нямецкі спецыяліст згуляў ужо чатыры разы. І напрыканцы галоўны трэнер звярнуўся да ўсіх балельшчыкаў. «Хочацца, каб такія суперні кі, як Аргенціна, Італія, Швецыя, якія могуць выбіраць, з кім гуляць, пакідаючы Беларусь, казалі: «О, Мінск! Гэта было класна!». Калі ж яны скажуць: «Стадыён быў пусты, поле — дрэннае», то як у наступны раз нам атрымаць топ-суперніка?»

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Спорт-тайм

ШВЕЦЫЯ З ЧЭХІЯЙ, РАСІЯ З ГЕРМАНІЯЙ

У паўфіналах 74-га чэмпіянату свету па хакеі ў Германіі сёння Швецыя згуляе з Чэхіяй, а Расія — з гаспадарамі першынства.

20 мая ў чвэрцьфіналах Швецыя перамагла Данію — 4:2 (1:0, 2:1, 1:1), Чэхія — Фінляндыю — 2:1 (0:1, 0:0, 1:0, 0:0, буліты — 2:1), Расія — Канаду — 5:2 (1:0, 2:0, 2:2), а Германія — Швейцарыю — 1:0 (0:0, 1:0, 0:0).

У «ДЫНАМА» НОВЫ ТРЭНЕР

Станоўчыя навіны парадавалі балельшчыкаў сталічнага футбольнага клуба. Галоўным трэнерам футбольнага мінскага «Дынама» прызначаны Уладзімір Гольмак. Камандзе новы настаўнік будзе прадстаўлены 24 мая, паведамляе прэс-служба клуба. 43-гадовы спецыяліст змяніў на гэтай пасадзе Сяргея Гурэнку. У камандзе ён працаваў з 2009 года і займаў пасаду асістэнта галоўнага трэнера. Раней Уладзімір Гольмак працаваў з дынамаўскімі дублёрамі.

У той жа час стала вядома, што апеляцыйны камітэт Беларускай федэрацыі футбола знізіў памер штрафу, які быў накладзены 6 мая дысцыплінарным камітэтам на сталічны клуб, — з 7 тысяч да 850 базавых велічынь. Калі раней трэба было аплаціць 245 мільёнаў (каля 82 тысяч долараў), то цяпер усяго 29 мільёнаў 750 тысяч (каля 9,9 тысячы долараў). Нагадаем, што штрафам клуб быў пакараны за фашысцкі банер з выявай Рудольфа Геса, які з'явіўся на фанацкім сектары на хатнім матчы клуба супраць «Віцебска». Акрамя таго, двое балельшчыкаў, якія прызналіся ў размяшчэнні нацысцкага банера, не маюць права наведваць матчы на працягу чатырох гадоў.

Алена КРАВЕЦ.

Открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж» приобретает на баланс Общества простые (обыкновенные) акции, выпущенные ОАО «Сантехэлектромонтаж», в количестве до 4400 штук по цене 25000 рублей за одну акцию с оплатой денежными средствами с целью дальнейшей продажи инвесторам. Выкуп простых (обыкновенных) акций будет производиться в период с 24.05.2010 г. по 25.06.2010 г. с оформлением сделок купли-продажи акций пропорционально поданным заявлениям.

Оплата приобретенных Обществом акций будет производиться не позднее 60 (Шестидесяти) банковских дней с момента заключения договора купли-продажи. Форма оплаты– наличными денежными средствами или путем безналичного расчета. Срок, в течение которого акционеры должны предоставить предложение о продаже принадлежащих им акций, – с 24.05.2010 г. по 04.06.2010 года. Срок, в течение которого осуществляется совершение сделок купли-продажи акций, — с 07.06.2010 г. по 25.06.2010 года. Сделки заключаются по адресу: 246007, г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8а. Конт. тел. 8 0232 57 41 91.

УНП 400052115

Выпрабавана на сабе

Пры рамонце на ЖЭС спадзявайся, але і сам промаху не давай

Сяргей РАСОЛЬКА

...ЦІКАВІЦЦА цэнамі на рамонтныя работы, як і магчымасцю іх хуткага ўвасаблення ў жыццё, мы пачалі практычна з самага пачатку года. І невыпадкова: летась пасля вядомых фінансавых падзей ва ўсім свеце, якія не абышлі і нас, на рынку рамонтна-будаўнічых паслуг на пэўны час устрывожылася зацішша з боку ўладальнікаў жылля. І кожны, нават даведачны, зварот майстры шпатэля і пэндзля імкнуліся перавесці ў практычнае рэчышча, абяцаючы хуткасць, якасць і зніжкі. Сёлета сітуацыя была зусім іншай. За рамонт яны, вядома, браліся, але, па-першае, абяцалі прыступіць да яго не раней, чым праз тры-чатыры тыдні пасля дамовы, па-другое, тэма зніжак з іх боку асабліва не мусіравалася. Але пра ўсё — па парадку.

Чыімі б рукамі ўсе работы выканаць?

Рамонт, як вядома, можна зрабіць уласнымі рукамі. А можна — «рукамі» фірмы, ІП, прыватніка або ЖЭСа. Ад першага варыянту адмовіліся адразу: апошні раз перад гэтым пераключацца з асноўнай працы на рамонтную па вечарах давялося на працягу больш за два месяцы. Пры гэтым «наразаць» ад працы да кватэры, што рамантавалася, і паміж крамамі і домам даводзілася даволі прыстойныя адлегласці. Спалучаць пры такім раскладзе і асноўную творчую працу, і дадатковую было, скажам шчыра, дастаткова цяжка. Таму ці варта гаварыць як усе, хто быў задзейнічаны ў рамонце, уздыхнулі нарэшце з палёгкай пасля яго завяршэння? Ды і пытанне эканоміі пэўнай часткі грашовых сродкаў, дарэчы, у такой сітуацыі выглядала трохі рытарычным: не аддадзеныя ў рукі прафесійнага майстра грошы за паслугу нівеліраваліся ненапісанымі ў вольны час дадатковымі матэрыяламі.

Таму сёлета разглядаліся толькі астатнія тры варыянты. Тым больш, як высветлілася, паміж імі было штосьці агульнае. Так, і фірмы, і ІП, і прыватнікі, і ЖЭС маглі распачаць рамонт не адразу пасля замовы, што сведчыла пра тое, што іх занятасць вярнулася, а толькі праз некаторы час — не раней чым прыкладна праз месяц. Таму рэальна прыступіць да нашых планаў атрымалася толькі ў першай дэкадзе красавіка. Выканаць усё патрэбнае падрадчыкі таксама абяцалі недзе за тры-чатыры тыдні.

Што рабіць, калі няма аб'ёмаў рамонту...

Нашы выходныя ўмовы былі наступныя. Патрабаваўся касметычны рамонт у стандартнай двухпакаёвай кватэры-«хрушчоўцы»: давесці да ладу столь, пафарбаваць падлогу, вокны (гэта быў адзіны нестандартны момант — эксперыментальныя чэшскія «шклопакеты» 1950-х гадоў) і дзверы, паклеіць шпалеры. Карацей кажучы, нічога, на першы погляд, складанага. Але апошняя акалічнасць адразу ж крыху знізіла цікавасць да заключэння дамовы з боку як фірмаў і ІП, так і прыватнікаў. Натуральна, у жыллі з другаснага рынку не магло быць такога маштабу рамонтна-будаўнічых работ (а дзе аб'ёмы, там і грошы), як у новабудоўлі пры капітальным рамонце (хто бачыць тут супярэчнасць, не здзіўляйцеся: нават у новым жыллі цяпер модна пераносіць усю электрыку, не кажучы пра замену вокнаў на шклопакеты, дзвярных блокаў на свой густ і іншага). Гэта па-першае. Па-другое... Як прамым тэкстам патлумачыла жанчына — добры спецыяліст-прыватнік, яна толькі заканчвае працу ў падобнай «хрушчоўцы». А яны традыцыйна лічацца цяжкімі аб'ектамі (дарэчы, не беспадстаўна). Таму надалей жанчына хацела б трохі «адпаспаць», працуючы менавіта ў новабудоўлі. Пра брыгаду тут і гаварыць не даводзіцца: што пры няпоўных (з таго поўнага спектру, што характэрны для капітальнага рамонту) аб'ёмах рамонтна-будаўнічых работ у кватэры будзе рабіць частка работнікаў?.. Заставаўся ЖЭС, які ў нашых вачах ужо не толькі выконваў рамонтныя работы, але і фактычна адыгрываў сацыяльную ролю — і ў прамым, і ў пераносным сэнсе. Тым больш, што рамонт трэба было рабіць у кватэры, дзе жыў 90-гадовы чалавек. Прычым гаспадыня катэгарычна адмовілася з'язджаць на час яго правядзення з жылля... Так што тут пра ролю — сур'ёзна: іншыя ж адмовілі.

Аплата — у растэрміноўку на тры месяцы

«Сацыяльнасць» дапамогі ЖЭСа напачатку бачылася нам і ў расцэнках на паслугі. Самы дарагі варыянт, як вядома, — заказаць рамонтную брыгаду. Пасля па расцэнках ідзе прыватнік (хоць у некаторых выпадках яго паслугі могуць каштаваць не менш, а нават больш за «брыгадныя»). Каштарыс, складзены ў ЖЭСе, выглядаў, на першы погляд, дастаткова прывабна. Так, агульная сума за выкананне рамонтна-будаўнічых работ і платных паслуг (продаж неабходных матэрыялаў) агулам складала напачатку крыху больш за 1,6 мільёна рублёў (прычым самі тарыфы па відах работ за адзінку вымярэння былі меншымі, або ў асобных выпадках такімі ж, як у іншых «гульцоў-майстроў» на будаўніча-рамонтным «полі»). Праўда, без кошту фарбы-водаэмульсіёнкі для часткі столі і шпалераў з клеем, якія адразу вырашылі набываць самастойна. Заплаціць ЖЭСу да таго ж можна было не адразу цалкам усю суму за паслугі і матэрыялы, а ў растэрміноўку — роўнымі часткамі на працягу трох месяцаў. Таксама пры жаданні патрэбныя матэрыялы можна было замовіць і апляціць у бліжэйшых крамах, а ЖЭС потым бы іх забраў і даставіў на патрэбны адрас бясплатна.

З вышэйназванай агульнай сумы ўласна на аплату рамонтна-будаўнічых работ прыпадала 1,4 мільёна рублёў (з іх толькі за зняцце старых шпалераў і паклейку новых, напрыклад, трэба было аддаць больш за 400 тысяч, за афарбоўку столі, сцен, вокнаў, дзвярэй, радыятараў эмаллю — амаль 600 тысяч рублёў, — дзве найбольш значныя пазіцыі са спісу). Аднак крыху здзівіла сума за матэрыялы, патрэбныя на правядзенне вызначанага аб'ёму работ — ледзьве за 200 тысяч рублёў. Падавалася б, радавацца трэба? Але падлік матэрыялаў у кілаграмах і суадносіны іх з цэнамі выклікалі шэраг пытанняў. Белай эмалі, напрыклад, згодна з падлікамі інжынера з ЖЭСа, трэба было 19 кілаграмаў, эмалі для падлогі — 10 кілаграмаў. Нават толькі гэтая фарба,ераведзеная ў стандартныя бляшанкі (2—2,2 кілаграма) і памножаная на кошт з крамы ці рынку за адзінку давала большую суму, чым усе матэрыялы з каштарысу разам узятыя.

Крамы і рынкі: парытэт цэнаў на матэрыялы

Як патлумачылі нам у ЖЭСе прычыну адноснай таннасці, усе матэрыялы — беларускай вытворчасці, гэта па-першае. Па-другое, яны закупляюцца оптам, таму і спажыўцу ў выніку абыходзяцца менш па грашах. Нічога не маючы супраць айчынных матэрыялаў, пацікавіліся ў работнікаў ЖЭСа, маўляў, хто канкрэтна вытворца? Якую фарбу прапануеце: бліскучую або матавую, чысцюткa белую або з адценнем?.. Па красамоўным маўчанні стала зразумела, што такое пытанне для іх прагучала ўпершыню. Таму ўсе патрэбныя матэрыялы вырашылі набываць самастойна. Тым больш, як высветлілася, у рэкамендаваных крамах бракаваў і ён выбар і, што здзівіла, не было патрэбнай нам колькасці, напрыклад, фарбы або шпаклёўкі.

Аналіз цэнаў у крамах сталіцы і на будаўнічых рынках засведчыў іх парытэт. Напрыклад, практычна аднолькава і там і там каштавала жодзінская шпаклёўка: 5 кілаграмаў — крыху больш за 10 тысяч, 20 кілаграмаў — амаль 35 тысяч рублёў. Эмаль у бляшанцы вагой 2 кілаграмы (у залежнасці ад колеру) прадавалася па 19—22 тысячы рублёў, вагой 1 кілаграм — па 10—11 тысяч. Праўда, у крамах пераважна была прадукцыя айчынных вытворцаў, а на рынку за тыя ж грошы можна было набыць яшчэ і ўкраінскую або расійскую («ленінградскую») фарбу. У іх выбар адценняў, падалося, быў большым. Водаэмульсіённая фарба «Кондар» (7,5 кілаграма) каштавала амаль 28 тысяч, «Экаснежка» (5 і 10 кілаграмаў) — адпаведна 39 і 71,5 тысячы рублёў... У асобных буйных будаўнічых крамах за дастаўку матэрыялаў бралі 35 тысяч, на рынку мы дамовіліся за 10 тысяч (плюс вадзіцель у нашу адсутнасць бясплатна сам падняў матэрыялы ў кватэру).

У выніку агулам будматэрыялы абышліся нам у 1,5 раза даражэй, чым налічыў ЖЭС. Але мы свядома бралі прадукцыю вядомых фірмаў, што потым не прамінулі адзначыць майстры-работнікі.

«Трэба ісці заказчыку насустрач...»

Як было заўважана, матэрыялы каштавалі нам крыху даражэй. А вось па аб'ёме іх выйшла амаль... удвая менш, чым прапісалі ў каштарысе ў ЖЭСе. Агульная колькасць, як і кожны асобны радок, ужо напачатку выклікалі здзіўленне: няўжо на такую плошчу столькі патрэбна? Сумненні пацвердзілі і на рынку: не патрэбна. Прычыны такой сітуацыі бачу дзве. Першая, як асабіста думаю, у якасці прапанаваных нам матэрыялаў. Другую патлумачыла інжынер. Афарбоўку мы аплачвалі па тарыфе як палепшаную, двайную, адпаведна, і расход матэрыялу быў закладзены двайны. Але навошта пры якасных матэрыялах двайная афарбоўка? Тым больш што на паверхнях за мінулыя дзесяцігоддзі было пакладзена столькі пластоў той фарбы, што яшчэ адзін будзе дакладна залішнім — тыя ж вокны, ёсць рызыка, пасля афарбоўкі могуць не зачыніцца.

У адным з аддзелаў Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі нам патлумачылі, што палепшаная афарбоўка мае на ўвазе найперш не ўласна двайное фарбаванне, а папярэднюю падрыхтоўку паверхняў. Але калі заказчык супраць такой паслугі — трэба пайсці яму насустрач і на месцы вырашыць пытанне. Кіраўніка ЖЭСа, галоўнага інжынера і інжынера па побыце гэтая навіна ўвагнала літаральна ў ступар. Пасля працяглай і красамоўнай паўзы апошні спецыяліст прапанаваў зрабіць... запыт у праектны інстытут, каб там пералічылі тарыф, бо ў іх для карыстання маецца толькі двайны. Але майце на ўвазе, што тарыфы з пачатку сакавіка павялічыліся на 30 працэнтаў, патлумачыла інжынер. Каштарыс у вас складзены раней згодна з папярэднімі, але калі дачакаемся адказу, будзем яго перапісваць хоць і з «адзінарнымі», але ўжо на 30 працэнтаў большымі тарыфамі ўвогуле... Мы заплацілі як па двайных, але сказалі фарбаваць столькі разоў, на колькі хопіць фарбы.

Рамонт нельга скончыць. Яго можна толькі спыніць

Рамонт яшчэ не скончаны, на што ёсць розныя прычыны (з філасофскага: рамонт увогуле не часта заканчваецца тады, калі было запланавана). Напрыклад, каб сам яго рабіў, новыя шпалеры наклеіў бы на ранейшыя. У майстроў (яны ж даюць гарантыю) так зрабіць не дазволіла тэхналогія (з улікам змыўкі фарбы са столі). А зачапілі ў старым доме сцены — яны і пасыпаліся (эх, прасілі ж, папярэджвалі...). Значыць, вырас аб'ём работ, павялічыўся спектр і расход матэрыялаў. Адпаведна, зрушылі з месца і грашовыя выдаткі.

На сёння калькуляцыя па праведзеным аб'ёме рамонтных работ і набытых матэрыялах выглядае так. Увогуле паслугі ЖЭСа з улікам скарэктаванага каштарысу абыходзяцца ў крыху больш за 1,3 мільёна рублёў. Будаўнічыя матэрыялы запатрабавалі «капіталаўкладанняў» у памеры каля 600 тысяч. Такім чынам, касметычны рамонт двухпакаёвай агульнай плошчай крыху больш за 40 квадратных метраў «на выхадзе» павінен абысціся ў два мільёны рублёў. Пра якасць зробленага, напэўна, больш правільным будзе меркаваць пасля заканчэння рамонту (на жаль, некаторыя выкананыя работы майстрам ужо даводзілася перарабляць)...

Хуткасныя чыгуначныя зносіны паміж Мінскам і абласнымі цэнтрамі плануецца адкрыць у 2012—2013 гадах

Пра гэта паведаміў міністр транспарту і камунікацый Беларусі Іван Шчэрба.

Мяркуецца, што хуткасць руху чыгуначных саставаў на гэтых участках будзе даходзіць да 160 км/г. Паводле папярэдніх падлікаў, на рэалізацыю праекта спатрэбіцца каля 1,3 млрд долараў. Акрамя таго, у першым квартале 2011 года плануецца адкрыць рух гарадскога электрацягніка па маршруце Ждановічы — цэнтр горада.

Таццяна ЛЕБЕДЗЕВА, «Мінск—Навіны».

МЕТАН НЕБЯСПЕЧНЫ НЕ ТОЛЬКІ Ў ШАХТАХ

Два слесары аварыйнай брыгады КУП «Жыткавіцкі камунальнік» раніцай пачалі ачыску каналізацыйнага калектара па вуліцы Сацыялістычнай у Жыткавічах. Яны адкачалі нечыстоты, а потым маладзейшы, 34-гадовы, палез у калодзеж, дзе раптоўна страціў прытомнасць. Старэйшы і спрактыкаваны, якому 52 гады, палез услед, пры гэтым абодва не выкарыстоўвалі неабходныя пры такіх работах страхоўчыя тросы для пад'ёму наверх. Сродкаў абароны органаў дыхання ў абодвух таксама не было, і таму другі супрацоўнік таксама не змог выбрацца. Кіроўца іх службовага аўтамабіля рызыкаваць не стаў, патэлефанаваў «103» і пабег да выратавальнікаў, чый будынак размешчаны ў суседнім дварэ. Супрацоўнікі МНС часу не марнавалі і хутка выцягнулі людзей, якія забылі правілы тэхнікі бяспекі, з каналізацыйнага калодзежа. Абодва слесары тэрмінова дастаўлены ў рэанімацыю мясцовай раённай бальніцы. Ім пастаўлены дыягназ: атручэнне таксічным газам (хутчэй за ўсё, метанам), як паведамляюць у прэс-службе Гомельскага абласнога МНС.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

РУП «ВИТЕБСКИЙ ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

- оценка имущества (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, вреда от залития, пожара и пр.)
- организация и проведение аукционов

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «АВТОТРАНСПОРТНОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ № 14» г. ЛЕПЕЛЬ

ЛОТ: Капитальное строение, инв. № 232/С-13384, площадь 214,46 кв. м, расположенное по адресу: ул. Ленинская, 49, Докшицы Витебской области с начальной ценой продажи **155 569 440 (Сто пятьдесят пять миллионов пятьсот шестьдесят девять тысяч четыреста сорок)** рублей с учетом НДС. Для обслуживания здания выделен земельный участок площадью 0,3561 га, кадастровый номер 222150100001000988.

Хар-ка объекта (здание бывшей автостанции) согласно техническому паспорту и справки-описания: фундамент – ж/б плиты; стены – кирпич. оштукатур. побел. окрашен.; перегородки – кирпич. оштукатур. побел. окрашен.; перекрытия чердачн. – деревян. утеплен.; крыша – совмещен.рулонная; полы – цемент; проемы: окон. – двойные окрашен., дверн. – филенчат. окрашен.; отделка: наружн. – оштукатур. окрашн., внутр. – окрашен. побел. обои; электроосвещение – открытая проводка; вентиляция – естеств.

1. Аукцион состоится **22 июня 2010 в 12.00** по адресу: Витебская область, Докшицы, ул. Ленинская, 49. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 до 21.06.2010 (включительно) по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заключительная регистрация участников 22.06.2010 с 11.30 до 12.00 по месту проведения аукциона.

2. Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением, разработанным в РУП «Витебский институт недвижимости и оценки». Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Порядок участия и проведения аукциона опубликован на сайте www.Ocenka.by.

3. Для участия в аукционе приглашаются юр. лица и физ. лица, подавшие в установленном порядке заявление с приложением следующих документов: заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка в размере 10 % стоимости лота; юр. лицом РБ или индивидуальным предпринимателем – копии учредительных документов и свидетельства о госрегистрации; иностранным юр. лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка д/быть подготовлена в течение 6 месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия.

4. Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012215570013 в ГФ по Витебской области ОАО «Белинвестбанк» Витебска, код 701. Получатель – РУП «Витебский институт недвижимости и оценки», УНП 390343677.

5. Победитель возмещает затраты по организации и проведению аукциона, которые сообщаются участникам до начала проведения аукциона и подлежат уплате в течение 20 рабочих дней после проведения аукциона.

6. Победитель аукциона обязан заключить договор купли-продажи с Продавцом, не позднее 20 рабочих дней после проведения аукциона. Платежи за объект осуществляются согласно договору купли-продажи.

Дополнительную информацию можно узнать по телефонам: 8 (0212) 435 435, 435 495; 8 (029) 591 00 02.

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (организатор аукциона) 23 июня 2010 года проводит открытый аукцион по продаже зданий, сооружений и иного имущества, находящегося в собственности ОАО «Белпромтара» (продавец)

На аукционные торги выставляются:

Номер лота	№ 1	№ 2	№ 3	№ 4	№ 5
Наименование и характеристики имущества, входящего в состав лота	- здание конторы, инв. номер 630/С-42877, площадь – 278,8 кв.м; - здание котельной с сушилкой, инв. номер 630/С-42872, площадь – 170,0 кв.м; - здание цеха новой тары, инв. номер 630/С-42874, площадь – 476,4 кв.м; - здание склада хранения тары, инв. номер 630/С-42875, площадь – 993,0 кв.м; - здание гаража, инв. номер 630/С-42876, площадь – 318,9 кв.м; - здание склада хранения тары, инв. номер 630/С-42879, площадь – 655,9 кв.м; - здание лесопильного цеха, инв. номер 630/С-42855, площадь – 481,7 кв.м; - здание производственного цеха тары, инв. номер 630/С-42869, площадь – 597,7 кв.м; - асфальтовое покрытие, инв. номер 630/С-50723, площадь – 6199,8 кв.м; - водоем пожарный, инв. номер 630/С-50720; объем – 158.4 куб. м, диаметр – 7,0 м, глубина – 3,6 м; - участок водопроводной сети, инв. номер 630/С-50721, протяженность – 159,5 м; - линия электропередач, инв. номер 630/С-50726, протяженность – 656 м; - насаждения производственных площадей инв. номер 051/09	- административное здание (в том числе: уборная, ограждение, ворота металлические, ворота металлические, забор деревянный, колодец ж/б), инв. номер 443/С-1626, площадь 82,0 кв. м; - склад тары № 1, инв. номер 443/С-1627, площадь – 99,6 кв.м; - склад тары № 2, инв. номер 443/С-1628, площадь 98,6 кв.м; - склад прочей тары, инв. номер 443/С-1629, площадь – 973,4 кв.м; - навес для хранения тары, инв. номер 443/С-1630, площадь – 412,6 кв.м; - насаждения производственных площадей, инв. номер 052/09	- здание конторы (в том числе: беседка, беседка, уборная, забор, ворота, калитка), инв. номер 450/С-5923, площадь 54,1 кв. м; - производственный цех, инв. номер 450/С-5926, площадь – 1220,9 кв.м; - асфальтобетонное покрытие, инв. номер 450/С-20691, площадь – 1091,1 кв.м; - канализационный выпуск, инв. номер 450/С-20693; - водопроводный ввод, инв. номер 450/С-20694; - сеть электроснабжения, инв. номер 450/С-20695, - зеленые насаждения	- здание специализированное иного назначения (здание административно-хозяйственное с пристройкой – 8 кв. м, дворовым покрытием – 3200 кв.м, забором, воротами, калиткой), инв. номер 640/С-26358, площадь – 91,0 кв. м; - здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (склад с котельной с пристройкой), инв. номер 640/С-26363, площадь – 831,0 кв. м; - здание специализированное иного назначения (цех ремонта возвратной тары со складом и навесом), инв. номер 640/С-26356, площадь – 233 кв. м; - здание специализированное иного назначения (цех новой тары с механической мастерской и пристройкой), инв. номер 640/С-26361, площадь – 708,0 кв. м; - сооружение специализированное энергетики (кабельная линия электропередач), инв. номер 640/С-50116; - сооружение специализированное коммунального хозяйства (водопровод), инв. номер 640/С-50117; - зеленые насаждения производственной территории, инв. номер 070/09	- здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения (склад стройматериалов), инв. номер 110/С-87280, площадь – 493,6 кв. м; - зеленые насаждения
Местонахождение имущества	Минская область, г. Молодечно, ул. Либаво-Роменская, д. 54	Гродненская область, г. Сморгонь, ул. Железнодорожная, д. 7	Гродненская область, г. Слоним, ул. Железнодорожная, д. 3	Минская область, Слуцкий район, г. Слуцк, пер. Пролетарский 2-й, д. 12	Брестская область, г. Барановичи, пер. Водопроводный 2-й, д. 25
Сведения о земельном участке	площадь – 2,6213 га, кадастровый номер 642000000003001231; площадь – 0,1816 га, кадастровый номер 642000000003001230, назначение – содержание и обслуживание зданий и сооружений	площадь – 0,9336 га, кадастровый номер 425650100001000935, назначение – размещение производственной базы	площадь – 0,5614 га, кадастровый номер 425450100001001503, назначение – обслуживание зданий и сооружений	площадь – 1,0180 га, кадастровый номер 624650100001005929, назначение – содержание и обслуживание зданий и сооружений	
Начальная цена с учетом НДС	875 038 800 белорусских рублей	217 383 600 белорусских рублей	220 362 120 белорусских рублей	580 914 154 белорусских рубля	201 156 667 белорусских рублей
Сумма задатка	85 000 000 белорусских рублей	20 000 000 белорусских рублей	20 000 000 белорусских рублей	58 000 000 белорусских рублей	20 000 000 белорусских рублей
Обременение договорами аренды: номер, дата (срок действия)			Договор № 40 от 12.02.2010 г. по 11.02.2013 г. (произ. цех – 58,8 м²)		

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект (лот). Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем

АДРАДЖЭННЕ ХУТАРОЎ: спроба першая

БОЛЬШ за год таму Мінсельгасхарч выступіў з ініцыятывай адраджэння хутарскіх гаспадарак. Гэта, па задумцы кіраўніцтва міністэрства, павінна было дапамагчы ў справе выхавання гаспадара на зямлі. Ідэя шырока абмяркоўвалася ў СМІ: адны лічылі вяртанне хутароў утопіяй альбо падманам, іншыя — «добрым падмуркам для развіцця грамадства, станаўлення і ўмацавання роднай краіны». І тыя, і тыя выказвалі асцярогі, розныя, але была і агульная — наўрад ці сёння знойдуцца добрасумленныя людзі, тым больш маладыя, якія сапраўды адважацца падтрымаць ідэю Мінсельгасхарча. Муж і жонка Наталля Шыліна і Франц Янкоўскі, фермеры і гаспадары аграэкасядзібы «Конны фальварак» са Смілавічаў Мінскага раёна («Звязда» пісала пра іх 08.10.2005) і ў дадатак да ўсяго — шматдзетныя бацькі 5 цудоўных бландзіністых дзетак з васільковымі вачыма, аказаліся менавіта такімі. Год таму яны разам з дзецьмі з'ехалі туды, куды ім прапаноўвалі ў Мінсельгасхарчы — на поўнач Віцебскай вобласці, у Расонскі раён, амаль на мяжу з Расіяй. За 320 кіламетраў ад Мінска! Днямі ўслед за Шылінымі-Янкоўскімі паехалі карэспандэнты газеты «Звязда». Каб пабачыць, што ў іх атрымалася.

— Тады на прапанову міністэрства адгукнуліся чалавек 120, — узгадвае Наталля. — З іх абралі чалавек 12, у тым ліку і нас. Я так разумею, выбіралі, каб людзі займаліся рознымі кірункамі. Нехта вырошчвае буйнаплодную маліну, нехта трымае пчол... Нас запрасілі на сустрэчу з міністрам. Міністр сказаў: «Вось, ёсць свабодныя землі на поўначы Віцебскай вобласці і ў Палессі. Хто гатовы туды паехаць?». А людзі не чакалі, што ім прапануюць некуды ехаць. Яны ўжо альбо жылі на хутарах, альбо мелі на ўвазе нейкія канкрэтныя і не так далёка ад свайго месца. Яны сталі расказваць міністру, як там добра і прыгожа. Якая буйная ў іх расце маліна... Міністр, у сваю чаргу, спрабаваў упэўніць людзей у тым, што варта рызыкнуць і паехаць. Нагадваў пра Сталыпіна. Размова не мела нейкай канкрэтнай мэты, гэта быў пажытак для роздуму.

Наталля з Францам таксама не збіраліся з'язджаць так далёка са сваіх Смілавічаў. Яны спадзяваліся на нейкі хутар паблізу. У саміх Смілавічах яны не бачылі перспектывы для аграэкатурызму. Гарадскі пасёлак з 5 тысячамі насельніцтва, аўтамагістраль пад вокнамі дома, ды і сам дом не разлічаны на прыём туристаў... Яны і для ўласных дзяцей хацелі іншых умоў — бліжэй да прыроды.

Да таго ж, у Смілавічах Наталлі бракавала аднадумцаў. Чатыры гады таму яна распрацавала зялёны маршрут «Ігуменскія конныя сцежкі», у які ўвайшоў палацава-паркавы комплекс, мемарыял, музей Манюшкі і вуліца, на якой у дзяцінстве жыў вядомы мастак Хаім Суцін. Пазней з яе падачы ў Смілавічах быў адчынены і музей Суціна. Аднак турысты валам не павалілі, бо коні, экспанаты і помнікі — гэта здорава, але калі няма дзе спыніцца, колькасць ахвотных прыехаць турыстаў рэзка скарачаецца. Нават 30-кіламетровая адлегласць ад Мінска асаблівай ролі не адыгрывае.

— Падумаўшы, мы сталі абзвоньваць знаёмых гаспадароў аграсядзіб на поўначы Віцебскай вобласці, — узгадвае Наталля. — Пазванілі і Аляксандру Кролу — гаспадару сядзібы «Кролава хата» з Расонскага раёна. Пытаемся: «Ёсць у вас хутар?» Ён кажа: ёсць, і цудоўны. Прыязджайце!

Спачатку паехаў Франц са старэйшым сынам — шасцігадовым Раманам. Расоншчына яму спадабалася адразу. Яна нагадала малую радзіму — Браслаўшчыну. Але тут было яшчэ лепш, бо яшчэ больш некранутых лясоў, менш людзей і гэтак жа шмат азёраў. Ідэальнае месца для развіцця экатурызму.

Праз месяц у вялікую фуру былі пагружаны чатыры кані, самаробная брычка і ўсе рэчы сям'і Наталлі і Франца. На леташнім «Заборскім фэсце» — традыцыйным штогадовым фестывалі аграсядзібаў, які адбываецца на Расоншчыне ў першыя выхадныя чэрвеня, іх коні і брычка ўжо былі прадэманстраваныя ўдзельнікам фестывалю.

А ў летні сезон Наталля і Франц адчулі першую аддачу ад абслугоўвання турыстаў, якія спыняліся на сядзібе «Кролава хата».

— Аляксандр заўсёды марыў пра коней, — расказвае **гаспадыня сядзібы Вера КРОЛ**. — Таму, калі пазваніла Наталля, у яго вачах загараэўся агеньчык. Мы расказалі ім пра хутар Шарстова, у якім з нядаўняга часу ніхто ўжо не жыве. Прыгожае месца за шэсць кіламетраў ад Забор'я. Дом стаіць на ўзгорку, вакол прастора і бязлюддзе, закінутыя палі і лес. Электрычнасць ёсць, калодзежы ёсць. Там толькі дарога ў адным месцы дрэнная, але ж ім у міністэрстве абяцалі з дарогай дапамагчы. Аднак усё аказалася не так проста.

Наталля і Франц з дзецьмі часова пасяліліся ў памяшканні былой саўгаснай бібліятэкі вёскі Забор'е. Гэты будынак на два ўваходы: колішнія бібліятэка і клуб — Кролы хацелі ў будучыні перабудаваць пад гасцініцу і шынок для турыстаў. Вера стамілася ўжо частаваць удзельнікаў і гасцей «Заборскага фэсту», а колькасць іх немалая, у сваім доме. Цяпер з шынком даводзецца пачакаць. Але праблема не ў гэтым. Амаль год Шыліны-Янкоўскія не маглі зарэгістравацца ў мясцовым сельсавеце. Афіцыйная прычына для адмовы — няма належных умоў для пражывання сям'і з дзецьмі. Неафіцыйная — да прыезджых паставіліся з недаверам.

— Неяк да нас прыйшлі людзі, вельмі ветлівыя, кажуць, вы зразумейце, гэта выклікае падазрэнне: маладая сям'я з-пад Мінска разам з маленькімі дзецьмі едзе ў глуш і хоча пасяліцца ў бязлюднай вёсцы. А можа вы сектанты? — пераказвае колішнюю размову Наталля.

Апроч усяго, для мясцовых уладаў сям'я са Смілавічаў утварала новыя праблемы: дазвол сяліцца на кінутым хутары азначаў новы галаўны боль і клопат пра годныя ўмовы жыцця гэтых людзей — дарога, бяспека, асвятленне, падвоз дзяцей да школы, аўтакрама, расчыстка дарогі зімой, а значыць — грошы, грошы, грошы... Дзеля адной сям'і!

— Як толькі ў райвыканкаме даведаліся, што Шыліны-Янкоўскія хочуць зарэгістравацца ў Шарстове, сталі мяне прымушаць: тэрмінова спісвай вёску, — усміхаецца **былы старшыня сельскага Савета Аляксандр МАЦУЛЕВІЧ**. — Падставы на гэта былі — ніводны дом у Шарстове не быў афармлены. І вось Кролы і Шыліна сталі за вёску змагацца. На гэта спатрэбілася каля года. Ім удалося Шарстова адстаяць. Спачатку Аляксандр Крол выкупіў адзін з дамоў, а потым, пасля доўгага перыяду высвятлення законных падстаў, прапісаў туды ўсю шматдзетную сям'ю Наталлі і Франца. Цяпер вёску ніхто не мае права спісаць.

На Расоншчыне такая вёска не адна. За 5 апошніх гадоў было ліквідавана дванаццаць. Сёння чатыры лічацца пустымі (гэта калі ў іх ніхто не жыве больш чым паўгода).

У інтэрнэце можна знайсці водгукі турыстаў, уражаных вялікай колькасцю ў гэтым раёне бязлюдных населеных пунктаў, якія нагадваюць фільмы ў жанры містыка. На афіцыйным сайце Расонскага райвыканкама змешчана інфармацыя пра амаль тры сотні свабодных зямельных участкаў для будаўніцтва аднакватэрных жылых дамоў у розных вёсках раёна. Будуйся — не хачу. Дарэчы, пяць з іх — у Шарстове.

Падобным чынам Кролы выратавалі яшчэ адну вёску — Локці, за 2 кіламетры ад Забор'я. Некалькі гадоў таму купілі там дом для абслугоўвання турыстаў, праўда, дом гэты амаль адразу спатрэбіўся сыну, які ў гэты час ажаніўся. Цяпер у сезон плануюць здаваць яго гасцям, а ў міжсезонне туды будзе вяртацца сын з маладой жонкай і маленькім дзіцем. У Локцях, дарэчы, сёння 7 свабодных і прыдатных для будаўніцтва жылога дома участкаў аддадзены насельніцтву. Так аграэкатурызм садзейнічае захаванню населеных пунктаў.

Праўда, наконт Шарстова Шыліны ўсё ж такі перадумалі (а ўлады ўздыхнулі з палёгкай). Літаральна напярэдадні візіту да іх карэспандэнтаў «Звязды» Наталля і Франц абралі для будаўніцтва свайго дома іншую вёску — Перавоз.

— Год мы думалі і вагаліся, а ўчора за 20 хвілін вызначыліся, — смяецца Франц. — Паехалі, пакажам!

Мы саджаем чатырох старэйшых дзяцей у машыну (двухгадовая Паўліна часова выхоўваецца ў бабулі ў Мінску) і едзем за сем кіламетраў у самую блізкую да расійскай мяжы вёску. Дзеці едуць глядзець будучае месца свайго дома ўпершыню. Наталля і Франц — у другі раз.

Большая частка дарогі праходзіць па вельмі прыгожым сасновым лесе, высланым рознакаляровым мохам.

— Па гэтай дарозе мы будзем катаць на конях турыстаў, вазіць іх на пляж «Залатыя пяскі» — гэта ўлюбёнае месца адпачынку ўсіх жыхароў раёна, — каментуе нашу дарогу Франц.

І сапраўды, ехаць сярод такой прыгажосці на машыне падаецца злачынствам. Пешшу, на роварах альбо конях — і ніяк інакш. Каб чуць спевы птушак, удыхаць водар ігліцы, каб нахіляцца за буякамі...

Перад вёскай моцны і вельмі каларытны драўляны мост. Перавоз знаходзіцца на месцы ўпадзення ракі Уша ў Дрысу і амаль пасярэдзіне ланцуга азёраў, якія ўтварае рака. Франц тлумачыць, чаму яны аддалі перавагу гэтаму месцу перад вёскай Шарстова. Тут яшчэ застаюцца на зіму людзі ў трох дамах, а летам да іх далучаюцца некалькі дачнікаў. Таму дарогу даглядаюць, зімой чысцяць ад снегу, два разы на тыдзень ездзіць аўтакрама. Да таго ж, у вёсцы, і гэта не меней для іх важна, захаваліся яшчэ моцныя былыя канюшні, і ёсць дастатковая колькасць заліўных лугоў для выпасу коней.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Бацькі гэтых дзетак ні хвіліны не шкадавалі пра тое, што з-пад Мінска прыехалі сюды, на самы край Беларусі. Але сэнс усяго — каб і дзеці не захацелі з'ехаць адсюль, калі вырастуць.

Наталля і Франц відавочна натхнёныя. Ім спадабаецца ўсё. Наталлю некалькі хвалюе толькі прыкметная ажыўленасць вёскі з-за дачнікаў. Усё ж такі, гэта — не хутар. Але іх участак знаходзіцца на ўскрайку, ля самага лесу, на яго тэрыторыі расце шмат шчаўя і маладзенькіх елачак. «Елкі перасадзім, — плануе Франц, — будзе свой асабісты ельнік!»

Вёска Перавоз сама па сабе нямала цікавіць турыстаў. Яна ляжыць уздоўж старажытнага шляху Невель — Полацк. Паводле падання, на гэтым месцы было гарадзішча і крэпасць князя Рагвалода. На востраве каля вёскі захаваліся могілкі з тых часоў, там жа знаходзіцца Рагнедзін курган, у якім, згодна з легендай, пахаваныя княгіня і яе бацька.

Нам не ўдаецца патрапіць на востраў, бо мост у гэту зіму сарвала і знесла рака, а лодачніка пакуль няма. Але мы плануем усё ж такі ажыццявіць свой намер у найбліжэйшы час. Бо хутка — чэрвень, а значыць — «Заборскі фэст». І упершыню ў яго праграму будзе ўключаны Фестываль беларускага каня, які арганізуе Наталля.

— Мы прысвячаем яго 10-годдзю афіцыйнага прызнання беларускай запражной пароды, — расказвае яна. — Спадзяёмся, што фестываль дапаможа ў справе папулярызацыі айчыннай пароды коней, якія ідэальна падыходзяць для выкарыстання ў вясковым турызме і іпатэрапіі. Яны вельмі прыгожыя, працавітыя і разам з тым міралюбівыя, прадказальныя. Па характары — сапраўдныя беларусы.

Фестываль стане своеасаблівым іспытам для Наталлі як прафесіянала. Яна не проста захапляецца коньмі, яна прысвячае ім сваё жыццё: скончыла Горацкую сельгасакадэмію, мае вопыт работы ў дзяржаўных і прыватных гаспадарках, якія спецыялізуюцца на конегадоўлі. Цяпер вырашыла зрабіць усё ад яе магчымае, каб беларуская запражная адрадзілася і заняла годнае месца і ў нашай краіне, і за мяжой.

На фэст прыедзе некалькі дзясяткаў удзельнікаў з конямі, будуць прадаўцы і пакупнікі, навукоўцы, аматары і спецыялісты, адбудуцца семінары і шоу... Зрэшты, мы паабяцалі Наталлі ўсё гэта пабачыць на свае вочы, а потым расказаць чытачам «Звязды». Тым, хто не зможа прыехаць у Забор'е 5-6 чэрвеня...

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
Расонскі раён.

КАМЕНТАРЫЙ МІНІСТЭРСТВА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ І ХАРЧАВАННЯ:

— Праграма адраджэння хутароў, на жаль, не склалася, — сказала «Звяздзе» **прэс-сакратар міністэрства Дар'я КАЗЛОЎСКАЯ**. — Па-першае, адгукнуліся адзінкі, і то гэта былі ў абсалютнай большасці людзі, якія ўжо жывуць на хутарах і, як правіла, займаюцца фермерствам. Таму пра нейкую спецыяльную падтрымку хутарскіх пасяленняў мы гаворку ўжо не вядзём. Сваю адмоўную ролю ў гэтым адыграў і сусветны фінансавы крызіс. Сёння знайсці грошы на добраўпарадкаванне дарогі, а тым больш для правядзення альбо рамонту ліній электрапередачы ў населены пункт, дзе жыве адна сям'я, даволі праблематычна. Што датычыцца Шыліных-Янкоўскіх, то яны, калі зарэгіструюцца на новым месцы жыхарства ў якасці фермераў, змогуць разлічваць на адпаведную падтрымку, якая прадугледжана заканадаўствам. Гэта датычыцца і іх статусу як суб'ектаў аграэкатурызму.

НА КОЖНЫ ПАДВОРАК КАРОВУ?
А ці магчыма такое?

Зніжэнне пагалоўя кароў у прыватных гаспадарках працягваецца, а з гэтай прычыны падае і закупка малака ад насельніцтва. А ці можна спыніць гэты працэс?

Я выйшаў на Жарабковіцкі сельсавет Ляхавіцкага раёна, бо ён — адзін з лідараў на Брэстчыне па закупцы малака. Летась тут прыватнікі прадалі дзяржаве 1284,9 тоны малака, хоць гэта і ніжэй чым у 2008 годзе, але лічба ўсё ж салідная.

Алена Махнач здала амаль 21 тону малака і трымае пяць кароў. Ларыса Новік прадала менш, бо ў той год трымала 4 каровы, але ж 17 тон з гакам таксама нямала. А лідарам можна назваць Генадзя Туціна з 19,3 тоны малака ад 3 кароў.

Безумоўна, калі б і іншыя вяскоўцы былі такімі гаспадарамі і трымалі па столькі кароў, то ад малака мы захлынуліся б. Але ж размова ў нас ідзе пра асобна ўзяты паспяховы ў гэтым плане сельсавет і апантаных гаспадароў, у якіх засталася ад бацькоў і дзядоў прага да работы, здабытку...

Патэлефанаваў у Жарабковічы і з усіх лідараў дома заспеў толькі Ларысу Новік.

— *А я вось на хвілінку ў хату забегла, а так нашых людзей не ўбачыш. Летам тэлевізар глядзець нам няма калі,* — сказала гаспадыня.

— Сёння ў вас пяць кароў — статак павялічыўся, а як у перспектыве?

— *Хопіць і гэтых, бо цяжка і з імі ўпраўляцца.*

— Я чуў, што з кармамі сельгаскааператыў дапамагае. Накосіць, высушыць і зграбе сена, то чаму б не трымаць.

— *Сена нам даюць сапраўды, але толькі на адну карову, а на астатнія трэба здабываць. Летась у фермераў купілялі. Ды і які сэнс надоі павялічваць, калі пры атрыманні за малако больш за 17,5 млн рублёў у год ужо неабходна плаціць падаткі?*

— Вы плацілі?

— *Летась мы яшчэ да гэтых мільёнаў не дацягнулі ды і зарабіць на малацэ не так проста. З аднаго боку, паднялі цану на малако, а з другога — паднялі і базавую тлустасць малака. Раней яно павінна было мець 3,4 %, а сёння ўжо 3,6 % тлустасці.*

— Павялічылі не дужа, каб...

— *Можа і не вельмі, але штомесяц з-за гэтага падняцця тлустасці мы губляем прыкладна 200 літраў малака.*

— Ларыса Аляксееўна, некалькі слоў пра сваю сям'ю.

— *Я працую ў сельсавеце, а муж — галоўны інжынер у мясцовай гаспадарцы. У нас дзве дачкі — старэйшая Лена ў дзявятым класе, а малодшая Каця — у трэцім.*

— Дочкі дапамагаюць, бо кароў трэба падаіць, на пашу выгнаць?

— *Старэйшая доіць, а з пашай асаблівых праблем няма. У нашай вёсцы кароў шмат, то чаргу прыходзіцца за сезон адбыць двойчы — за кожную карову — дзень чаргі.*

— Продаж малака — для сям'і істотная падтрымка? Дарэчы, а для сябе малако застаецца ці ўсё здаяце?

— *Мы раней быкоў трымалі, але ад малака большы прыбытак. У нас свой дом, і калі яго будавалі, патрэбны былі грошы... Вось так і круціліся. Для сябе малако ёсць, а вось смятану і масла купляем у краме... выгадней купіць. Ад малака вялікая падтрымка — жывём як у горадзе. Маем аўтамашыну, пральную машыну, камп'ютар... усё неабходнае, каб жыць цывілізавана.*

Звычайная працавітая сям'я, і менавіта на такіх сем'ях свет трымаецца. Нялёгка бывае адпрацаваць на рабоце, а затым яшчэ кожную вольную хвіліну аддаваць сваёй гаспадарцы.

А вось што сказаў **старшыня сельсавета Аляксандр ТРЫБУХОЎСКІ**:

— *У нас 346 прыватных кароў, а гэта больш, чым у іншых сельсаветах раёна, і калі пагалоўе не зменшыцца, то будзе малака закуплена столькі ж, як летась, а магчыма і больш. Хто хоча трымаць карову, то трымае — з кармамі асаблівых турбот няма. Сёння сельгаскааператыў дапамагае, вунь прашу, каб могілкі абкасілі — трава ў пояс, то ніхто не хоча — чакаюць гатовага.*

СВК «Жарабковічы» знаходзіцца на багатых землях, на «радзівілаўскай градзе», а якая сітуацыя ў палескай зоне Ляхавіцкага раёна? Там землі бедныя — наўкол лясыды нізіны.

Але і там ёсць свае рэкардсмены па продажы малака. Напрыклад, Тамара Вітко з Крывошынскага сельсавета ад адной каровы здала 6,5 тоны малака, а Святлана Зубік — 6,15 тоны. Але на тэрыторыі гэтага сельсавета па 5 кароў не трымаюць, як правіла, 1-2 каровы. Мясцовыя СВК, а іх два, дапамагаюць траву скасіць ды за здадзенае цяля даюць тону сена, а карове на зіму патрэбна 2,5 тоны. Сельгаскааператывы ў гэтай зоне больш бедныя, а гэты факт уплывае на сітуацыю.

— *Прыватны статак сёлета зменшыўся. Маладыя жывёлу трымаць не хочуць ды і цяжка. Карову раніцой трэба выгнаць, а ў абед загнаць у хлеў, увечары — таксама, вось і трэба яе пільнаваць, цэлы дзень як прывязаны. А механізатару летам не дыхнуць, а калі яшчэ жонка ў штаце, то паспрабуй упраўся з каровай,* — растлумачыў **старшыня Крывошынскага сельсавета Георгій БУЙКЕВІЧ**.

— А вы трымаеце карову?

— *У мяне карова ёсць, яшчэ трымае Трыбухоўскі, і калі не памыляюся, то ў раёне ўсяго 4 старшыні сельскіх Саветаў ад кароў не адмовіліся.*

Думаю, што малюнак з прыватным статкам даволі выразны. Кароў з кожным годам менее па дзвюх прычынах: вясковае насельніцтва старога гарту адыходзіць ці становіцца нямоглым, а маладое хоча жыць інакш — больш свабодна і не быць звязаным жывёлай. Калі ў хляве стаіць нейкая худоба, то ад хаты ты ўжо не адыдзеш. Хоць «свабода» залежыць і ад наяўнасці ў кішэні грошай. У гэтым плане пяць кароў даюць магчымасць манеўраваць, але як мы ведаем — маладое пакаленне замест малака выбірае «пепсі», хоць і на «пепсі» патрэбныя грошы.

Такая тэндэнцыя (скарачэнне прыватнага статка) склалася невыпадкова. Чаму нашы фермеры не займаюцца малаком, а найперш аддаюць перавагу садавіне, агародніне ды збожжу? Ад агульнага аб'ёму вытворчасці асноўных відаў сельгаспрадукцыі па краіне ўнёсак фермерскіх гаспадарак па малацэ складае ўсяго 0,2 працэнта. Прычына ў тым, што вытворчасць малака — працэс даволі цяжкі.

Насельніцтва ж з прыватных гаспадарак дало ад агульнага аб'ёму 15,2 % малака, а бульбы аж 88,2. Можа, мы сапраўды бульбяная нацыя? Інакш чаму гэтая культура амаль цалкам знаходзіцца ў прыватных руках? А ўсё даволі проста. Бульбу для сваіх работнікаў ды пенсіянераў вырошчваюць, як правіла, сельгаскааператывы. Чалавеку пасадзілі і да восені ён клопату не ведае. Няхай толькі СВК не стануць апрацоўваць для вяскоўцаў бульбу — і «прыватны» працэнт рэзка знізіцца.

Калі б (па аналогіі з бульбай) прыватных кароў даглядаў кааператыў, а вяскоўцы іх толькі даілі, то і ў апошняга абібока была б карова.

А так што мы маем? Сёння, па афіцыйных звестках, на 56 % прысядзібных падворкаў увогуле няма ніякай жывёлы, а адсутнасць кароў дасягнула 84,6 працэнта.

У 2009 годзе ў параўнанні з 2008-м колькасць прыватных кароў скарацілася на 24,4 тысячы галоў, альбо на 10,8 %.

Калі такімі тэмпамі зніжэнне статка будзе працягвацца, то ў найбліжэйшы час у нашай краіне здзейсніцца задума Мікіты Хрушчова. Гэта пры ім хацелі, каб вёска зраўнялася з горадам. У той час не дазвалялі трымаць больш за адну карову, забіралі цялят, не давалі сена — дзевяць коп у калгас, а дзясятую сабе. Няма кароў — не трэба і сена. Тады быў прымус, а сёння — усё ідзе натуральным шляхам.

А якое выйсце? Назад у прыватныя хлявы кароў не вярнуць ды і не трэба гэтага рабіць. Неабходна падтрымаць тых, хто кароў яшчэ мае, а хто не хоча — то іх не заставіш.

У жыцця свой кірунак.

Сымон СВІСТУНОВІЧ, *Ляхавіцкі раён.*

ПАЛЕТКІ — У ВАДЗЕ

На пачатку гэтага тыдня ў Брэсцкай вобласці прайшлі моцныя ліўні. У Брэсце, Кобрынскім, Іванаўскім, Камянецкім і некаторых іншых раёнах за дзве-тры гадзіны выпала да 80 % нормы ападкаў за 10 дзён.

Вельмі моцна пацярпелі палеткі ў Высокаўскай зоне Камянецкага раёна, у Кобрынскім раёне шквалісты вецер пашкодзіў жыта ды іншыя культуры. Вада стаіць і на многіх палетках Пружанскага раёна.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ЯК «КУЛАКА» Ў ВЁСЦЫ АДРАДЗІЦЬ?

З падручнікаў гісторыі мы ведаем, як у 20—30 гады мінулага стагоддзя раскулачвалі гаспадаркі, якія мелі «зашмат», на погляд тагачасных уладаў: зямлі, жывёлы, птушкі... Калі пачаць адмотваць кінастужку жыцця ў адваротны бок, атрымаецца сюррэалістычная карціна: прыйшоў час аддаваць тое, што было калісьці прымусова адабранае ў людзей... Вось толькі ці возьмуць? Пра гэта мы разважаем са старшынёй Жлобінскага Савета дэпутатаў Міхаілам КАСЮКОВЫМ, для якога падтрымка асабістых падворкаў — балючая тэма сучаснага жыцця.

— Ведаеце, я вельмі перажываю за тыя ацэнкі, якія ў апошні час гучаць у адрас мясцовых уладаў па выкананні праграмы падтрымкі асабістых падворкаў грамадзян. Так, сёння вельмі складана растлумачыць, чаму паказчыкі, якія былі закладзены ў праграме, разлічанай на 2006-2010 гады, не былі выкананы. Разам з тым, я дазволю сказаць, што мінулая праграма па падтрымцы асабістых гаспадарак была прынята без уліку тых працэсаў, якія ішлі і ідуць у грамадстве: насельніцтва ў вёсцы хутка старэе, маладыя людзі не хочуць займацца сваёй гаспадаркай, няма шматдзетных сем'яў, якія ёю раней займаліся... У 2006-м размова павінна была ісці хоць бы пра стабілізацыю сітуацыі — каб не было рэзкага памяншэння колькасці асабістых гаспадарак, а не тое, што прагназаваць іх значны рост.

— Дэмаграфія ў вёсцы так ці інакш мяняецца не ў станоўчы бок...

— На працэсы дэмаграфічныя нам сёння паўплываць складана, тым больш што яны аднолькавыя для ўсіх еўрапейскіх краін. Сёння ў Мінску пад 2 мільёны жыхароў, і іншыя буйныя гарады хутка растуць. А яны ж прырастаюць за кошт вёскі: адсюль імкнуцца з'ехаць людзі. І ўсё ж, у апошнія 5-7 гадоў, пасля прыняцця рэспубліканскай праграмы адраджэння вёскі, на фоне агульнага пад'ёму ўзроўню сельскагаспадарчай вытворчасці, стабільнай выплаты заработнай платы, будаўніцтва жылля — адток жыхароў з вёскі прыпыніўся. Што датычыцца Жлобінскага раёна, то ў шэрагу выпадкаў бліжэйшыя да горада вясковыя населеныя пункты сталі актыўна асвойваць гараджане. Гэта дазваляе з аптымізмам казаць пра будучыню вёскі. Пытанне развіцця асабістых падсобных гаспадарак на ўзроўні Прэзідэнта краіны паднята своечасова. Калі мы хочам мець станоўчую дынаміку ў іх развіцці, то павінны вызначыцца з мерамі падтрымкі гэтаму сектару эканомікі — бо яна павінна сёння быць значна большай, чым 10-15 гадоў таму. Да таго ж, усе гэтыя гады ішла палеміка: трэба нам асабістыя падворкі ці не трэба? Хопіць дзяржаве малака ад вялікіх гаспадарак ці не хопіць? Будзем ці не будзем развіваць асабістыя падворкі... Рэальна ніхто не вызначыўся з мэтамі і прыярытэтамі... На самых вярхах уносіліся нават прапановы ўлічваць валавую вытворчасць у сельскай гаспадарцы без сектара асабістых гаспадарак грамадзян. Лічылі так: хочуць людзі — няхай трымаюць жывёліну. А вось каб прадумаць і зацікавіць людзей, улічваючы адмоўныя тэндэнцыі, якія ідуць у грамадстве... Я калісьці выступаў у Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання на нарадзе па пытанні развіцця асабістых падсобных гаспадарак. Мне не спадабалася, што ўсё звялося да пытання, як малако ў насельніцтва збіраць. Кажу і зараз: гэта другасная задача — сабраць. Першасная — трэба зрабіць, каб чалавек захацеў карову трымаць і сядзібу апрацоўваць. А калі карова будзе, малако мы збяром абавязкова — ці то прыватнікі, ці малаказавод...

— Чым сёння можна зацікавіць прыватніка трымаць сваю гаспадарку, на сябе працаваць?

— Людзі павінны адчуць неабходнасць мець сваю гаспадарку. Сёння ж не так, як раней: далі зямлю — і чалавек будзе глядзець за ёй, таму што інакш не можа. Так было заведзена спакон веку. Зацікавіць можна цаной на прадукцыю, якую яны вырабляюць. Было ж калісьці прынята рашэнне — знізіць цану на малако ад уласніка. Знізілі — і колькі мы на гэтым страцілі? Потым сталі больш жорсткімі патрабаванні па якасці, па тлустасці. А чаму ў людзей прадукцыя павінна менш каштаваць, чым у вялізнай гаспадаркі? Шарахаліся з аднаго боку ў другі, а цяпер спрабуем знайсці выйсце... Між тым, у вёсцы сёння з'явіліся і сем'і, якія хочуць і могуць трымаць пяць кароў і болей. Гэта амаль што фермерскія гаспадаркі. Магчыма, ім трэба перагледзець умовы працы. Выкарыстоўваць венгерскую практыку: калі людзі займаюцца асобнай гаспадаркай у вялізных маштабах, ім у стаж залічваюць гэты тэрмін. Сацыяльная абарона павінна быць для гэтых людзей. Калі ў вёсцы няма іншай працы, а чалавек трымае жывёлу і жыве добра, чаму б дзяржаве яго не падтрымаць?

— Якая канкрэтна падтрымка патрэбна сёння гаспадару невялікай уласнай сядзібы?

— Я перакананы: вялізныя гаспадаркі павінны дапамагаць невялікім працаваць. Расцэнкі на паслугі павінны быць мінімальныя — на ўзроўні сабекошту, не вышэй. І роўныя для ўсіх слаёў насельніцтва — і сваіх, і не сваіх. Выпас жывёлы можна арганізаваць цэнтралізавана. Бо гэты працэс адцягвае шмат часу. Калі ў вёсцы 10 кароў, гэта ж чалавеку тры разы на месяц выпадае пасвіць — калі па чарзе. У гэты час ён адрываецца ад асноўнай працы. У нашай гаспадарцы «Шчадрынскае» арганізавалі цэнтралізаваны выпас жывёлы. Чалавек плаціць 28 тысяч у месяц і задаволены, што і яго карова пад прыглядам, і ён ад працы не адрываецца. Іх практыку мы хочам распаўсюдзіць. Прыём малака будзем арганізоўваць цераз малаказавод — каб з адпаведным халадзільным абсталяваннем і своечасова было. Меры дапамогі павінны быць сур'ёзныя — не проста іх дэкларацыя. Крэдыты трэба прадугледжваць таннейшыя. Тыя, хто хоча трымаць жывёлу — і 3, і 4, і 5 галоў, ім жа і хлявок адпаведны трэба пабудаваць, і іншае. Калі людзі хочуць аб'яднаўвацца ў кааператывы па інтарэсах, такія, як садова-агародныя, іх трэба толькі падтрымліваць — і даваць пэўныя льготы. А пашы ў нас павінна хапіць на ўсіх — мы калісьці жывёлы трымалі ў два разы больш.

— Як у раёне падтрымліваюць асабістыя гаспадаркі?

— Мы аналізуем такую работу разам: кіраўнік сельсавета з кіраўніком гаспадаркі трымаюць справаздачу пра тое, як яны працуюць з кожным прыватнікам. У нас жа праводзіцца раённае спаборніцтва сярод асабістых падворкаў. Заахвочваем лепшых здатчыкаў мяса, малака. Кіраўнікоў падтрымліваем тых, у чыіх гаспадарках не знізілася пагалоў'е жывёлы на асабістых падворках. Падводзім вынікі спаборніцтва як на ўзроўні кожнага сельсавета, так і на ўзроўні раёна. Мы за мінулы год далі 102,3 % закупак малака па раёне — некалькі павялічылі. Але ж пагалоў'е на сто галоў знізілася. Несумненна, павінна лепш працаваць сістэма райспажыўсаюза па прыёме прадукцыі ад насельніцтва: бульбы, яблыкаў, ягад...

— Вы лічыце, што магчыма вярнуць тое, што было сістэмна знішчана 80 гадоў таму — адносіны да зямлі як каштоўнасці?

— Я лічу, што асобная гаспадарка — гэта не толькі эканоміка. Гэта ўклад жыцця, выхаванне працавітасці ў дзяцей, стан моладзі, будучыня вёскі, вырашэнне праблем з п'янствам... Гэта — аснова нашай дзяржаўнасці...

Ірына АСТАШКЕВІЧ, *Жлобінскі раён.*

ЭЛЕКТРАПАСТУХ для асабістага статка

НЕЯК падчас камандзіроўкі ў Пружанскім раёне давялося гаварыць з адным кіраўніком сельгаспрадпрыемства. Ён між іншым заўважыў, што ездзіць сам за рулём, бо вадзіцель пасе «калейку». У вёсцы чарга пасвіць кароў разглядаецца як уважлівая прычына на любой рабоце. Больш за тое, дырэктар СВК тады сказаў, што, бывае, камбайнер у гарачую пару ўборкі просіць адгул з гэтай прычыны. Таму ў сельсаветах і сельгаскааператывах Пружаншчыны даўно прыйшлі да высновы, што неабходна наймаць пастуха для асабістага статка.

Вяскоўцы, як правіла, складваюцца, і атрымліваецца нядрэнная зарплата для пастуха. Так робяць у Гарадзечне, іншых вёсках. Праўда, ёсць тут іншая праблема: бывае, пастух працуе да першай зарплаты. А там? А там, як пойдзе гэтую зарплату «адзначаць», то кароў пасвіць няма каму. Бо цяпер і для грамадскага статка не так проста знайсці адказнага пастуха. Апошнім часам сельсаветы — дзе за свае грошы, дзе з прыцягненнем сродкаў насельніцтва — купляюць электраагароджы для свойскіх кароў. Зараз у раёне набылі ўжо 24 такія агароджы.

Хоць статак на падворках сельскіх гаспадароў прыкметна «мялее». Так, паводле статыстычных звестак, у Пружанскім раёне ў 2005 годзе налічвалася 4397 кароў у гаспадароў, а на пачатак 2010 года — 2086. І з гэтых з пачатку года прадалі ўжо 33 галавы. Такія паводзіны нехарактэрныя для сельскага гаспадара: калі ўжо пераймавала карова, то яе выпускаюць на пашу, здаюць кароў звычайна ўвосень. Старшыня раённага Савета дэпутатаў Віктар Макарэвіч папрасіў старшынь сельсаветаў даведацца, чаму ад жывёл пазбаўляюцца вясной. Аказалася, абсалютная большасць з названых 33-х — пажылыя пенсіянеры, якія па стане здароўя проста не могуць далей даглядаць жывёлу.

Старшыня райсавета расказаў, што яшчэ летась прэзідыум Пружанскага раённага Савета і райвыканкам прынялі сумесную пастанову аб сістэме работы з асабістымі падсобнымі гаспадаркамі, якая, па сутнасці, з'яўляецца раённай праграмай падтрымкі вясковага гаспадара. Тады ж былі выдаткаваныя грошы з раённага бюджэту для догляду пашы. На гэтыя сродкі 1403 гектары перазалужылі, акультурылі, падкармілі. Практычна ўсе асабістыя кароўкі пасуцца на культурных пашах. Хіба толькі ў малых вёсках, на хутарах, дзе засталося па адной, дзве, тры каровы, гаспадары самі знаходзяць пашу. Часцей карову прывязваюць недалёка ад дому. Цяпер травы хапае.

Названай «сістэмай» альбо праграмай прадугледжана таксама дапамога па нарыхтоўцы кармоў, закупцы малака і маладняку, ветэрынарная дапамога, паслугі тэхніка-асеменатара. Паводле слоў Віктара Макарэвіча, скаргаў на гэтую тэму апошнім часам практычна не было.

Вясной прайшла пашыраная нарада выканкама і Савета менавіта па пытаннях пасадкі бульбы, апрацоўкі прысядзібных участкаў. Кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў атрымалі ўказанне раённай улады аказаць усебаковую дапамогу людзям. Таму скаргі былі хіба толькі на тое, што пад бульбу выдзелілі ўчастак на адным полі, а чалав

ДАКУМЕНТЫ НЕ «ПСУЮЦЦА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«ЛІМІТ» ДЛЯ БЕСПРАЦОЎНЫХ

Час навучання на дзённых аддзяленнях з атрыманнем прафесіі пойдзе ў стаж цалкам. Гэтаксама як і час тэрміновай службы ў арміі. А вось з перыяду догляду за дзецьмі будзе залічана не больш за 9 гадоў. Своеасаблівы «ліміт» вызначаны і для перыяду атрымання дапамогі па беспрацоўі — не больш за 6 месяцаў.

РАБОТА ЗА МЯЖОЙ — СТАЖ НЕ ЗАЎСЁДЫ

Многія з патэнцыяльных пенсіянераў некалі працавалі на тэрыторыі рэспублік былога СССР. Таму трэба падкрэсліць: незалежна ад канкрэтнага месца працы яна цалкам ідзе ў стаж за перыяд да пачатку 1992 года. З перыядамі працоўнай дзейнасці пасля пачатку 1992 года малюнак крыху іншы.

З пераважнай большасцю постсавецкіх краін Беларусь мае пагадненні, якія вызначаюць прынцып узаемнага заліку стажу. Аднак такіх пагадненняў сёння няма з Латвіяй, Эстоніяй, Азербайджанам і Грузіяй — працоўная дзейнасць на тэрыторыі гэтых дзяржаў пасля 1992 года пры прызначэнні пенсіі ў Беларусі ў разлік не прымаецца.

Гэтаксама як не прымаюцца ў разлік і заробкі пры працы на тэрыторыі былых савецкіх рэспублік пасля пачатку таго ж 1992 года. І выключэнне тут адно — праца ў Расіі.

— У дачыненні з Расійскай Федэрацыяй дзейнічаюць увогуле асаблівыя правілы, — распавядае Ала Колбік. — Грамадзяне гэтай краіны, якія пражываюць у Беларусі, могуць атрымліваць расійскую пенсію. У такім разе мы накіроўваем дакументы ў Пенсійны фонд Расійскай Федэрацыі, чалавеку адкрываецца банкаўскі рахунак у Беларусі, на які раз у квартал пералічваецца расійская пенсія — яе выплата робіцца ў беларускіх рублях па курсе Цэнтрабанка. А тут ёсць і іншы варыянт. За работу да 13 сакавіка 1992 года на тэрыторыі былога СССР або пасля гэтай даты на тэрыторыі Беларусі пенсію будзе плаціць наша краіна, а за работу пасля 13 сакавіка 1992 года на тэрыторыі Расіі выплаты зробіць Расійская Федэрацыя.

Ці не самае складанае пытанне пры рабоце за межамі Беларусі — пошук неабходных пацвярджальных дакументаў. Пры жаданні нашы органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне могуць накіраваць у іншыя краіны запыты. Вось толькі гарантыі, што былыя работадаўцы ўсё ж адгукнуцца, на жаль, няма.

АПОШНЯЯ НАДЗЕЯ — СУД

Звесткі аб заробках да 1 студзеня 2003 года павінны пацвярджацца даведкай работадаўцы, яго правапераймальніка ці архіва. Прычым сёлета індывідуальны каэфіцыент заробку разлічваецца за любыя 16 гадоў запар з 26 апошніх гадоў працы, у 2011 годзе будзе працаваць формула «17 з 27», у 2012 годзе — «18 з 28» і г.д. Словам, гаворка ідзе пра тэрміны вельмі працяглыя. Таму верагоднасць, што звесткі пра зарплату за пэўны час не захаваліся, вялікая. І ў такім разе застанецца звяртацца ў суд па месцы жыхарства.

У сваю чаргу для вызначэння памеру заробку суд можа ўзяць пад увагу некаторыя ўскосныя доказы — прафсаюзны білет з пазначэннем сумы выплачаных узносаў, разліковыя лісткі, штатныя расклады, паказанні сведак. Аднак тут ёсць адзін нюанс: калі пацвярджаецца заробак за перыяд з 1 ліпеня 1998 года да 1 студзеня 2003 года, то будзе абавязковым прадстаўленне даведкі з Фонду сацыяльнай абароны аб тым, што былы работадаўца быў тут зарэгістраваны і плаціў сацстрах. У адваротным выпадку звесткі аб «страчаным заробку» ў разлік прымацца не будуць.

— Адначасова работнікам недзяржаўных прадпрыемстваў хацелася б параіць наведацца ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва і адсачыць сумленнасць свайго работадаўцы, праверыць, ці робіць ён адлічэнні на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне і ў якіх памерах, — заўважае Ала Колбік. — Бо сустракаецца такое: работадаўца плаціць зарплату з дзвюх частак — большай неафіцыйнай у «канверце» і меншай афіцыйнай, з якой і плаціцца сацстрах. Прычым усе застаюцца нібыта задаволенымі. Але толькі да пэўнага часу: калі супрацоўнік прыходзіць па пенсію, аказваецца, што сума яго заробку паводле звестак Фонду значна адрозніваецца ад рэальнай. У выніку атрымліваецца вельмі нізкім індывідуальны каэфіцыент, а значыць, — і малая пенсія.

ЦІ ВАРТА СПЯШАЦЦА?

Звяртацца па прызначэнне пенсіі па ўзросце ў орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне можна за месяц да атрымання права на такую пенсію. Зноў жа да гэтага часу пажадана і падрыхтаваць неабходны пакет дакументаў. Аднак ці варта спяшацца выходзіць на заслужаны адпачынак адразу ж — ужо тэма для роздуму.

— Вырашаць, пайсці на пенсію, як кажуць, «дзень у дзень» або крыху пазней, кожны павінен сам, — зазначае Ала Колбік. — Бо наша заканадаўства прадугледжвае: за кожныя два месяцы работы без атрымання пенсіі яе памер павялічваецца на 1 працэнт заробку. Скарыстацца такой магчымасцю можна як адразу пасля дасягнення пенсійнага ўзросту, так і пазней — калі напісаць заяву на часовае прыпыненне выплат. Безумоўна, пытанне, выгадны гэты варыянт або не, пралічваецца ў кожным канкрэтным выпадку. Аднак нярэдка вынікам рашэння крыху пажыць на адну зарплату становіцца павелічэнне пенсіі на 20-40 тысяч рублёў, прычым падобная прыбаўка забяспечваецца стабільна — на ўсё жыццё.

Парламенцкі дзённік

СВАЯ ЧУЖАЯ ЭНЕРГІЯ

У развіцці альтэрнатыўных крыніц пакуль больш аксюмарана, чым гармоніі

ВЕТРУ, а разам з ім і іншым крыніцам, якія патэнцыйна могуць даваць энергію, дадзены ход! Такі неабходны галіне закон нарэшце спраектаваны, і над ім ужо карпеюць парламентарыі. Дакумент рыхтуюць да другога чытання, і дэпутаты профільнай камісіі (па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве) асабіста знаёмяцца з альтэрнатыўнай энергетыкай. Пакуль нязвыклай для нашай краіны. І вельмі шкада: разам з экалагічнай бяскрыўднасцю яна абяцае энергетычную незалежнасць. Я ўжо не кажу пра «пабочныя» пазітыўныя эфекты: некаторыя крыніцы пастаўляюць яшчэ і якасныя ўгнаенні. А нашы лясы ды вадаёмы тым часам фактычна «прастойваюць»: на ўсе ўзнаўляльныя энергарэсурсы ў паліўным балансе прыпадае менш за дзесяць адсоткаў. І ўласныя, свае крыніцы для нас пакуль незнаёмыя, чужыя. Аднак пункты «збору» жывой энергіі пакрысе даказваюць сваю жыццяздольнасць. Не выключэнне і ўстаноўкі, пабачаныя народнымі абраннікамі на Міншчыне.

Лёс лесу

Пасёлак Бараўляны — выдатны ўзор таго, як можна абыходзіцца выключна мясцовым палівам (газ са старой кацельні тут задзейнічаюць толькі пры форс-мажоры — як мінулай зімой, калі ўдарылі моцныя маразы). Новая кацельня, якая задзейнічае адходы дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў, у сваю чаргу можа прапанаваць адходы сельскай гаспадаркі. Штомесяц гэта ўзнаўляльная крыніца апроч цяпла «вырабляе» яшчэ і некалькі кубоў попелу. Чым не ўгнаенне?! Праўда, пакуль што ідзе яно выключна на палігон — для ўтылізацыі. Аднак, відаць, не за гарамі той час, калі кацельня будзе не толькі ацяпляць навакольныя дамы ды амбулаторыю, але і ў літаральным сэнсе карміць іх! А калі так, то ці можна быць спакойнымі за радыяцыйную чысціню таго, што збіраюцца «пусціць» па полі? Словы **галоўнага інжынера ЖКГ Мінскага раёна Рамана ШВЕДА** надаюць упэўненасць: «Праводзіцца двухузроўневая праверка якасці трэсак. Пастаўшчыкі нясуць адказнасць за якасць свайго матэрыялу, ён суправаджаецца сертыфікатам. Ёсць яшчэ выбарачныя аналізы — раз на два тыдні возіцца на радыяцыйны кантроль». Устаноўка экалагічная і ў плане выкідаў: згараннe поўнае, СО ў межах нормы — усё пад кантролем.

Цікавая дэталь: як ні дзіўна, паводле тэхналогіі, трэскі павінны быць злёгку ўвільготненыя (улетку, калі шчэпкі настолькі сухія, што могуць загарэцца ад аднаго позірку, іх нават спецыяльна ўвільгатняюць). Проста хуткасць згарання ўплывае на цеплааддачу, яе павелічэнню садзейнічае і нахіл транспарцёра, па якім паступае матэрыял.

Важкім грузам пераканальнасці кладзецца на шалі яшчэ і эканамічнае «за»: вытворчасць адной гігакалорыі цяпла нетрадыцыйным спосабам таннейшая за атрыманую на газавай кацельні (146 тыс. рублёў супраць 158 тыс. па сабекошце).

Плюс на плюсе атрымліваецца, як ні круці. Ды і лесу нам, балазе, адмерана шчодра. «Во як зажывём, калі ўсё гэта пусцім у ход!» — першая думка, якая наведвае простага смяротнага. Але ж кожнага змагара за прыроду турбуе лёс самога лесу — як бы ён наогул не скончыўся з-за такіх наватарскіх «падкопаў»... Усім экалагічна заклапочаным тлумачым: лясы займаюць больш за траціну тэрыторыі краіны, у запасе — 1340 млн кубоў, і — што самае галоўнае — ён прырастае штогод на 25 млн кубаметраў у сярэднім (пры спажыванні 14 млн метраў кубічных). Калі верыць лічбам, то прычын для трывогі няма. Ды і мясцовыя ўлады супакойваюць цвярозасцю разваг. «Толькі разлік», — зазначае **намеснік старшыні Мінаблвыканкама Валерый СКАКУН**, абмяркоўваючы з дэпутатамі памылковаcць насаджэння такіх кацельняў агулам.

Не схільны да масавага падыходу і **дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Леанід ШЭНЕЦ**:

— Важна не кідацца ўсім будаваць крыніцы на мясцовых відах паліва, важна знізіць спажыванне рэсурсаў.

Ён кажа, што ў зніжэнні энергаёмістасці сваёй вытворчасці Беларусь ужо прайшла вялікі шлях, аднак яшчэ ёсць да чаго імкнуцца. У планах на 2020 год — знізіць энергаёмістасць ВУП на 60 адсоткаў (адносна ўзроўню 2005 года) і павысіць долю ўласных энергарэсурсаў у балансе да 26,6 адсотка. Важнасць задачы цяжка недаацаніць:

— Калі браць вялікую энергетыку, то сёння 95—96 % — гэта выпрацоўка электраэнергіі на прыродным газе, — кажа дырэктар дэпартамента. — А цяпер давайце ўявім сітуацыю, што аднойчы мы можам не атрымаць такога віду паліва...

Калі так глядзець,то альтэрнатыўныя крыніцы — ну проста наш выратавальны круг. У галіне самой нетрадыцыйнай энергетыкі найбольш трывалыя пазіцыі займае, дарэчы, менавіта лес! Паліўная драўніна і трэскі — 43,8 %, а калі дадаць яшчэ і драўнінныя адходы (8,4 %), то атрымліваецца абсалютнае лідарства (для параўнання: «лепта» вады — усяго 0,24 адсотка, ветру — 0,01 адсотка). Атрымліваецца, дрэваапрацоўчая галіна — сама сабе энергетык! У будучыні так і будзе, прычым у вельмі блізкай: кіраўнік дэпартамента разлічвае, што недзе да 2014 года ўся галіна пяройдзе на ўласныя крыніцы.

Грошы на вецер — не на вецер

Для лоўлі ветру Міншчына — хіба не самая прывабная мясцовасць (тут найвышэйшы пункт краіны — гара Дзяржынская — з усімі сваімі 345 метрамі). І цалкам лагічна, што ў Дзяржынскім і Лагойскім раёнах плануецца ўзвесці самыя магутныя ветрапаркі (да 150 МВт і 100 МВт адпаведна). Неблагія перспектывы адкрываюць для такіх збудаванняў Валожынскі, Лёзненскі і Гарадоцкі раёны. Падаюць надзею Навагрудчына, Ашмяншчына ды Смаргоншчына. У маштабах краіны выяўлена 1840 пляцовак для ветраўстановак. Наогул беларускага ветру магло б хапіць на 6,5 млрд кВт/г электраэнергіі штогод. Справа за малым — выкарыстаць той патэнцыял...

Круціцца сабе невялічкі ветрачок. У сэнсе, на фоне ЛЭП, ён гіганцкі, аднак у плане энергетычных паказчыкаў... хутчэй, вучэбны, чым прамысловы. Магутнасці 6,5 кВт для эканамічнай эфектыўнасці было б недастаткова, а для падрыхтоўкі спецыялістаў хапае. Будучым выпускнікам БАТУ — навука. Не кожны ўніверсітэт можа пахваліцца наяўнасцю ўласнага ветрака на вучэбнай базе.

Чаму ў баі памеры важнейшыя, чым у вучэнні? «Са змяншэннем вышыні падае энергаэфектыўнасць», — тлумачыць **Уладзімір ПАШКОЎ, намеснік дырэктара «Аэрола энерга»** (адзінага беларускага вытворцы ветраўстановак, які і выканаў замову ўніверсітэта). — «Ветрапаркі трэба будаваць, аднак з вышынёй апор мінімум 60 метраў». Пераборлівай ветраэнергетыцы падавай не проста ўзвышшы, але і пажадана яшчэ свабодныя ад лясных насаджэнняў.

Так, першапраходца ў вырабе айчынных агрэгатаў для ўзнаўляльнай энергетыкі ёсць. А як наконт стымулаў? Цікавімся ў **Яўгена КАЗІМІРЧЫКА** (намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве), які курыруе законапраект аб узнаўляльных крыніцах.

Яўген КАЗІМІРЧЫК, які курыруе законапраект аб узнаўляльных крыніцах, не выключае, што некалі выбера нетрадыцыйную энергетыку для ўласнага дома.

— Сфера законапраекта закранае не толькі выпрацоўку электраэнергіі і выкарыстанне крыніц, але і вытворчасць абсталявання для гэтага. Думаю, што стымуляцыя будзе, аднак яна не прапісана так дакладна, як для вытворцаў энергіі.

Яны могуць разлічваць на пэўныя падатковыя палёгкі, гарантаванае падключэнне да электрасетак, набыццё ўсёй створанай імі электраэнергіі і бонусы па тарыфах. У адрозненне ад дзейных нормаў (калі павышаючы каэфіцыент 1,3 даецца на 5 гадоў), тэрмін стымулявання павялічаны: 10 гадоў — павышаючы каэфіцыент, а пасля яшчэ столькі ж — стымулюючы). Чаму абралі менавіта такую працягласць падмогі?

— У сярэднім акупнасць аб'ектаў узнаўляльнай энергетыкі — якраз 20 гадоў, — тлумачыць парламентарый. — А далей паглядзім, як яно будзе развівацца. Цэнасная палітыка можа змяняцца.

Ён падзяліўся з намі і яшчэ адным цікавым фактам — тарыфы будуць рознымі: скажам, для ветру адна надбаўка, для вады — другая. Распрацоўшчыкі зыходзілі з таго, што адрозніваюцца затраты. Дарэчы, затраты на падключэнне да сеткі прыватніку таксама даваздзецца ўзяць на сябе. Наўрад ці гэта выкліча энтузіязм, — падумалася нам, аднак дэпутат кажа, што выдаткі невялікія, паколькі «даецца найбліжэйшая, недыскрымінацыйная, кропка, а ўсё астатняе бярэ на сябе Мінэнерга».

Яшчэ адзін зацікаўлены бок — спажывец. Павышаныя тарыфы, якімі будуць стымуляваць вытворцаў электраэнергіі, уключаныя ў сабекошт, а значыць... аплачваць гэта будзем мы самі. Чаму б не браць розніцу з бюджэту, які зноў жа фарміруецца намі?

— Павышэнне тарыфаў у любым выпадку ўплывае на спажыўца, аднак пра істотнае павышэнне наўрад ці даводзіцца казаць. Калі ў перспектыве гэта будзе значная доля, магчыма, недзе падключыцца і бюджэт, — разважае народны абраннік.

Не можам не пацікавіцца ў яго, чаму так мала ўвагі надаецца цеплавой энергіі?

— Адносна вытворчасці электраэнергіі ўжо ёсць пэўныя напрацоўкі, і, відаць, правільна абмежаваць сферу дзейнасці законапраекта менавіта гэтым відам энергіі, тым больш што законапраект так доўга распрацоўваўся... Развіццё цеплавой энергіі, не выключана, стане наступным этапам. У будучыні, калі з'явіцца вопыт, можна будзе пашырыць сферу дзеяння гэтага закона ці распрацаваць новы нарматыўны акт.

Карысная ўцечка

Калі ход вады нясе не растрату, а карысць... значыць, размова ідзе пра ГЭС. Гідраэнергетыка для Беларусі — бадай, адзіны «стары знаёмы» ў разнастайнасці альтэрнатыўных крыніц. Засталося толькі аднавіць былую раскошу ды ўліць свежы струмень. Тры дзясяткі ГЭС — багацце ў 13 МВт (ці 28 млн кВт/г электраэнергіі штогод) пры патэнцыйнай магутнасці вадатокаў у 850 МВт. І хоць тэхнічна даступныя толькі 520 МВт, а эканамічна мэтазгодныя і таго менш — 250 Мвт, усё яшчэ ёсць куды плыць. У планах — каскад з трох ГЭС на Заходняй Дзвіне, і ўдвая больш — на Дняпры. Малыя ГЭС — самыя перспектыўныя, не ў апошнюю чаргу і таму, што на Беларусі ў іх багатае мінулае. Дэпутаты на свае вочы пабачылі, як працуе малая гідраэлектрастанцыя на вадаскідзе мінскай ЦЭЦ-2.

Цікавая дэталь: здавалася б, у паводку выпрацоўваецца максімум электраэнергіі — столькі вады. Аказваецца, наадварот: для ГЭС гэта самы неспрыяльны час. Магутнасць залежыць ад перападу вышыняў, а калі вады зашмат, гэта розніца фактычна нейтралізуецца: верхні ўзровень падняць нельга, інакш горад затопіць, падымаецца ніжні. Выпрацоўкі няма, вада фактычна сцякае...

Залаты памёт

Энергетыкам не дае спакою «добро» жывёлагадоўчых комплексаў. Племптушказавод «Беларускі» ператварае ў карысную энергію... памёт улясных гадаванцаў. Як кажуць, чым багатыя... Ва ўсёй краіне такога багацця — перапрацоўваць-не пераварацаваць! Комплексаў буйной рагатай жывёлы — 6300, свінагадоўчых — з сотню, птушкагадоўчых — пад 50.

Да важнай ролі прыдатныя і іншыя адходы: біягазавыя ўстаноўкі можна будаваць на ачышчальных збудаваннях, смеццеперапрацоўчыя заводы і міні-ЦЭЦ — на звалачным газе.

На племптушказаводзе пераканаліся: «гэта не выгадная, а вельмі выгадная справа». Прыбытак ад рэалізаваных летась кВт/г перасягнуў 200 млн рублёў. Падрабязнасцямі падзяліўся **намеснік дырэктара Мікалай ТУЖЫНСКІ**. Атрыманую пікантным спосабам электраэнергію прадпрыемства цалкам аддае ў сетку, а для сваіх патрэбаў закупляе на выгадных умовах (гэта больш выгадна, чым трымаць унутраныя сеткі і выкарыстоўваць менавіта тую энергію, якую выпрацоўваеш). Акрамя таго, установка забяспечвае цяпло, яно куранятам увесь год патрэбнае. Ды і экалагічныя перавагі несумненныя: «Метан — адзін з самых разбуральных газаў для азонавага слою. У газгольтарах за суткі перапрацоўваецца прыкладна 3,5 тыс. кубаметраў газу. А калі б яны траплялі ў атмасферу?» — задае рытарычнае пытанне намеснік дырэктара.

І нарэшце, угнаенне ладнае — ні шкодлікаў, ні паху... У Германіі, кажуць, на яго няма адбою ад кветкаводаў. Іх спакушае адсутнасць традыцыйнай для такой прадукцыі «духмянасці». Ля самой установкі «водар», паверце, усё ж ёсць. Аднак дапытлівасці дэпутатаў ён не перашкода. Ніколі не бачыла, каб людзі з такой цікаўнасцю разглядалі гной — вось што значыць антураж: усё ж такі не кожны дзень пабачыш пераўтварэнне... самі ведаеце чаго... у энергію, а па сутнасці — у грошы!

Цікавая дэталь: здаецца, ну што там складанага — прырода зробіць сваю справу. Аднак ёй даводзіцца дапамагаць — «карміць» бактэрыі, падтрымліваць спрыяльную тэмпературу. Так што ў біялагічным плане працэс пераўтварэння — вельмі і вельмі далікатны.

Нявыгаднасць выгады

Плоскасцяў для аналізу ў альтэрнатыўнай энергетыцы вельмі шмат. Шырока абмяркоўваецца і законапраект. Пажытак для розуму падкінулі ўдзельнікі выязнога пасяджэння. **Выканаўчы дырэктар асацыяцыі «Узнаўляльная энергетыка» Уладзімір НІСЦЮК** акцэнтаваў вартасць супрацоўніцтва дзяржавы, бізнэсу і грамадзянскай супольнасці. І падкрэсліў значэнне будучага закона, які «футболіўся ў міністэрствах і ведамствах шмат гадоў», для інвестараў:

— Даведаўшыся пра тое, што законапраект прайшоў першае чытанне і рыхтуецца да другога, інвестары больш актыўна і энергічна адгукаюцца на ўсе нашы прапановы. Яны бачаць, што дзяржава гатова даць гарантыі, і пад гэтыя гарантыі яны гатовы прыйсці. Вядома ж, калонамі не стаяць і не адтоптваюць адзін аднаму ногі ў чэргах, аднак тое, што іх шмат (некаторыя прыходзяць разведку правесці, а некаторыя напрамую зацікаўленыя працаваць), — факт неаспрэчны.

Цікавыя прапановы агучыў **дырэктар НВА «Малая энергетыка» Анатоль СМІРНОЎ**:

— Прашу звярнуць увагу на нашага суб'екта гаспадарання, прыцягнуць яго, каб уладальнік быў наш! Я не супраць прыходу інвестараў, і ў іх трэба вучыцца, аднак яны бяруць крэдыты ў сваёй краіне, і грошы ідуць туды...

Сапраўды, так можна прыйсці да таго, што свае крыніцы стануць па сутнасці чужымі. Дапамагчы можа, на яго думку, падключэнне айчыннай банкаўскай сістэмы:

— Каб не пад 7% плюс стаўка рэфінансавання, а пад 5 — 6 %, як за мяжой. І тады, скажам, мне як юрыдычнай ці фізічнай асобе будзе выгадна ўзяць гэты крэдыт, укласці атрыманыя грошы, напрыклад, у ветраўстаноўку, быць дзясятым ці тысячным там уладальнікам і кампенсаваць свае затраты на жыллёва-камунальныя паслугі. Магчыма такое зрабіць менавіта для гэтай галіны (галіны ўзнаўляльнай энергетыкі. — **Аўт.**)?

Вельмі слушна ўзняў ён праблему самога ўспрыняцця новай энергетыкі:

— Давайце шчыра, у нас ва ўсіх, і ў мяне ў тым ліку, існуе супраць гэтай энергетыкі псіхалагічны бар'ер. Усур'ёз яна асабліва не ўспрымаецца. Як да часткі энергетычнай галіны мы да яе не адносімся. Гэты бар'ер вельмі перашкоджае і ў побытавым плане, і абсалютна непераадольны ў плане суб'ектаў гаспадарання, асабліва буйных. Так, у нас ёсць шчаслівае выключэнне: сумесна з Водаканалам мы пабудавалі каскад ГЭС, сумесна іх эксплуатуем. Аднак скажыце, якія яшчэ буйныя прадпрыемствы гэта робяць?.. Закон найперш для таго, каб пераадолець псіхалагічны бар'ер унутры краіны, не для інвестараў...

У профільнай камісіі спадзяюцца, што паспеюць абагульніць усе заўвагі, выказаныя падчас работы над законапраектам, да восені — каб прыняць яго ў другім чытанні ўжо на наступнай сесіі. Мо, і дачакаемся таго часу, калі альтэрнатыўная энергетыка будзе нам не ў навіну — нам самім...

Ала МАЧАЛАВА.

Мінская вобласць.

Погляд з канверта

«ПЕНСІЯ — ПА ПРАЦЫ»

Сацыяльна арыентаваная дзяржава немагчымая без працы, а праца — без чалавечага патэнцыялу. Гэты фактар у Беларусі застаецца важным ва ўсе часы: калі ў параўнанні з суседзямі мы бедныя на прыродныя рэсурсы, то тым больш павінны быць на галаву вышэй за іх па інтэлектуальных здольнасцях і ўмелых руках. Аднак усё ж хачу спыніцца на стаўленні да такой катэгорыі грамадзян як пенсіянеры. У цэлым адносіны да гэтага слоя грамадства з боку дзяржаўных органаў станоўчыя, але бянтэжыць адно... Давайце паглядзім на ўсіх нас вачыма пабочнага назіральніка. Вайскоўцы, супрацоўнікі МУС, сілавых структур і г.д. выходзяць на пенсію ва ўзросце 45—50 гадоў. Атрымліваюць пры гэтым немалыя пенсіі. Цывільныя спецыялісты, асабліва спецыялісты рабочых прафесій, вымушаныя працаваць да пенсіі яшчэ 10—15 гадоў, а ў найбліжэйшы час гэтая планка яшчэ можа змяніцца (невядома, у які бок).



Не сакрэт, што за кошт рабочых спецыяльнасцяў ствараюцца ў асноўным нацыянальнае багацце, бюджэт дзяржавы, а ўсе астатнія — карыстальнікі. Дык чаму ж людзі, якія ствараюць нацыянальнае багацце і каштоўнасці, атрымліваюць у 2—3 разы пенсіі меншыя, чым вайскоўцы і тыя ж дзяржслужачыя?! Прапаную прывесці планку пенсіянераў да аднаго (за некаторым выключэннем) назоўніка: гэта значыць афіцэр запасу, які стаў пенсіянерам у 45 гадоў, і цывільны чалавек, які працаваў да 60—65 гадоў, павінны атрымліваць пенсію практычна на роўных. Тады кожны грамадзянін у нашай дзяржаве будзе сапраўды роўны, а справядлівыя адносіны да працы — шлях да павелічэння таго ж чалавечага патэнцыялу. У гэтым плане ў нашай дзяржавы ёсць усе шанцы быць у авангардзе сярод іншых краін, я заўжды лічыў, што ў Беларусі самыя лепшыя спецыялісты ва ўсіх сферах. Таму вельмі важна, каб так заставалася і надалей, каб у кожнага быў стымул да працы.

Уладзімір КСЁНЗ, *г. Ліда.*

03 июня 2010 г. в 12.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Универсам «Северный».

Повестка дня:

1. Об уменьшении уставного фонда Общества.
2. О внесении и утверждении изменений в Устав Общества.
3. О материальном вознаграждении членов совета директоров.

Собрание будет проходить по адресу: г. Минск, ул. Мирошниченко, 3.

Начало регистрации участников собрания: 12.00. УНП 100356386.

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА без условий по продаже имущества предприятия, находящегося в процедуре банкротства с ликвидацией

Адрес объекта и его наименование	Расположен по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Городокская, д. 100«А». Объект продается одним лотом. - ремонтные мастерские и административно-бытовой корпус, общей площадью **592,4 кв. м**, год постройки ремонтных мастерских – 1994; административно-бытового корпуса – 2007 г. - ограждение железобетонное (плиты размером 4 × 2 м в кол-ве 18 шт., **начальная цена объекта** 473 748 000 (четыреста семьдесят три миллиона семьсот сорок восемь тысяч) рублей, в т.ч. НДС 78 958 000 (Семьдесят восемь миллионов девятьсот пятьдесят восемь тысяч) рублей. Решение об отводе земельного участка, пл. 0,2780 га, имеется. Порядок проведения аукциона и подробный перечень имущества оговорен в условиях проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Задаток 5 % от начальной цены лота перечисляется на р/с 3012203400038 в отделении ОАО «Белагропромбанк» в г. Молодечно код 914, УНП 600077843, ОКПО 05414829, получатель: СУП «МПМК № 197» ОАО «Забудова-строй». Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» № 164 от 02.09.09 г.
Конечный срок и адрес приема заявок	**03.06.2010 г.** до 16.00, г. Вилейка, ул. Горького, д. 7, кв. 8, управляющий СУП «МПМК № 197» ОАО «Забудова-строй», тел. (8 01771) 5 36 77 (факс), МТС 8 029 578 36 77; vel. 8 029 685 36 77.
Дата, время и место аукциона	**04.06.2010 г.** в 12.00, г. Молодечно, ул. Городокская, д. 100 «А»

Працяг тэмы

Суд не знайшоў вінаватых у справе па незаконнай адсідцы ў турме



ЗА КОЖНЫ ДЗЕНЬ НЕСПРАВЯДЛІВАЙ АДСІДКІ Ў ТУРМЕ — 34 400 РУБЛЁЎ

У сакавіку на старонках «Звязды»распавядалася, што за незаконную адсідку ў калоніі суд Фрунзенскага раёна Мінска пастанавіў сплаціць Леаніду Тарасенку кампенсацыю ў 15 мільёнаў рублёў.

Гэту суму мужчына лічыць ганебнай і настойвае на больш справядлівай, як ён лічыць, кампенсацыі — у 200 мільёнаў рублёў.

— Гэта і страчанае здароўе, і маральныя пакуты. Пакуль сядзеў у СІЗА і калоніі, абясцэніліся грошы, на якія я збіраўся купіць кватэру, — падлічвае Леанід Тарасенка. — 200 мільёнаў — гэта самыя сціплыя падлікі. Нядаўна я быў у намесніка старшыні Вярхоўнага суда Валерыя Вышкевіча, ён сказаў, што асабіста будзе разбірацца з маёй справай.

Трэба адзначыць, што службовыя асобы, якія паўдзельнічалі ў лёсе Леаніда Тарасенкі, дагэтуль не прыцягваліся да адказнасці. Толькі самы першы суддзя, які ўляпіў Леаніду Тарасенку «хуліганства» і «нанясенне цяжкіх цялесных пашкоджанняў», быў звольнены з пасады. Затое міліцыянер, які ў 2004 годзе вёў у чыне капітана «следства» па справе Тарасенкі, зрабіўся падпалкоўнікам, стаў следчым па асабліва важных справах....

— З-за гэтых службовых асобаў дзяржава панесла страты, з-за іх «працы» мне будуць сплочваць кампенсацыю. Лічу нармальным, калі і за іх возьмецца пракуратура. Няхай уся краіна пра іх ведае, — сказаў на развітанне Леанід Тарасенка.

Леанід Тарасенка быў асуджаны да пяці гадоў пазбаўлення волі ў калоніі. Але праз два гады адсідкі змог цалкам даказаць сваю невінаватасць.

На думку следства, у турму ён трапіў з-за лжывага даносу грамадзяніна А., на якога праз гады і завялі крымінальную справу.

Але суд нечакана апраўдаў падазраванага. Атрымліваецца, за скрадзеныя ў Леаніда Тарасенкі свабоду і здароўе ніхто не адкажа?..

Гісторыя Леаніда Тарасенкі пасапраўднаму ўзрушыла многіх прыстойных беларусаў. Мужчыну абвінавацілі ў хуліганстве і нанясенні цяжкіх цялесных пашкоджанняў, кінулі ў калонію на пяць гадоў. Але Леанід Тарасенка аказаўся апантаным змагаром за сваю праўду, дайшоў да кіраўніцтва Генпракуратуры і Вярхоўнага суда. Тады справу Тарасенкі пераглядзелі і жахнуліся: міліцэйскае следства праводзілася некампетэнтна, нанесці ўдарамі рук і ног такія цяжкія цялесныя пашкоджанні грамадзяніну А. мужчына не мог, а першая судова-медыцынская экспертыза была праведзена з парушэннямі... Праз 14 месяцаў адсідкі Леаніда Віктаравіча вызвалілі.

Аказалася, падчас канфлікту грамадзянін А. першым ударыў нагой па машыне Леаніда Тарасенкі і зрабіў увагнутасць на крыле (пазней за гэтыя хуліганскія дзеянні Леаніду Тарасенку была сплочана кампенсацыя). Верагодна, з-за таго хуліганскага ўдару грамадзянін А. і атрымаў закрыты пералом дна вяртлужнай упадзіны. І больш ніводнай гематомы, ніводнага сінячка на целе. Якое тут збіццё рукамі і нагамі...

Следства абвінаваціла грамадзяніна А. па двух артыкулах Крымінальнага кодэкса — «загадзя лжывы данос» (артыкул 400, частка 2) і «загадзя лжывыя паказанні» (артыкул 401, частка 2).

Але прысуд, які 13 мая зачыталі ў судзе Дзяржынскага раёна, пакінуў шмат пытанняў.

«Ацаніўшы прыведзеныя доказы, суд прыходзіць да высновы, што яны ў сваёй сукупнасці не могуць быць прызнаныя дастатковымі для высвятлення віноўнасці А. у здзяйсненні злачынства», — пазначана ў пастанове суда.

Атрымліваецца, у незаконнай турэмнай адсідцы Леаніда Тарасенкі ніхто не вінаваты. Такое судовае рашэнне многім падалося як мінімум нелагічным.

— Я лічу, што гэты прысуд незаконны і мы працягнем яго апратэставанне. Мы ў гэтым непахісныя. Лічым, што віна абвінавачанага даведзена цалкам, — абураецца пракурор Мінскай вобласці Эрнест КОЙРА. — Што ж атрымліваецца? Суд кажа, што адзін невінаваты і другі невінаваты. Любы звычайны чалавек разумее — нешта тут не так.

У самога Леаніда Тарасенкі, нягледзячы на прысуд, рукі не апускаюцца. Яго шлях да справядлівасці быў занадта цярністы — з 2004 года давялося прайсці болей за дваццаць судовых працэсаў, і толькі летась Леаніду Віктаравічу ўдалося цалкам давесці сваю невінаватасць. Упэўнены мужчына, што і гэтае судовае рашэнне па грамадзяніну А. не стане канчатковым.

— Мой адвакат адзначыў, што ў прысудзе маюцца шматлікія парушэнні, рыхтуецца скарга ў касацыйныя інстанцыі. Я буду да канца свайго жыцця змагацца за справядлівасць, — разважліва і рашуча выказаўся Леанід ТАРАСЕНКА праз тыдзень пасля суда. — Лжэпацярпелы, які пасадзіў мяне ў турму, павінен быць пакараны па законе. Буду зноў звяртацца ва ўсе інстанцыі...

Суд пастанавіў апраўдаць грамадзяніна А. (злева), але пракуратура збіраецца абскарджваць гэта рашэнне і «на 100%» упэўнена ў яго віноўнасці.

«Звязда» будзе паведамляць пра гучную крымінальную справу.

Яўген ВАЛОШЫН.

ПОГЛЯД ЗБОКУ

Каб паступіць на юрыдычны факультэт і потым працаваць у судовых, следчых ці адвакацкіх структурах, неабходна здаваць матэматыку. Лічыцца, што гэтая навука развівае лагічнае мысленне.

Таму пагаджацца з падобнымі судовымі рашэннямі цяжка. З аднаго боку, невінаваты чалавек трапіў у калонію, з другога — ніхто за гэта не адказвае. Нелагічна.

У момант, калі дзяржава спрабуе ўмацаваць праваахоўную сістэму, такія рашэнні па гучных справах ставяць палкі ў колы.

*Што ж атрымліваецца? Сёння я магу стукнуцца галавой аб сцяну, напіс

Краіна здароўя

Выпуск № 19 (188)

Падарожжа на поўдзень — без «экзатычных» наступстваў

Набліжаецца час масавых летніх адпачынкаў. Многія беларусы па традыцыі накіруюцца ў паўднёвыя краіны. Аднак для таго, каб не сапсаваць сабе цікавае падарожжа, медыкі настойліва раяць турыстам перад паездкай прайсці медыцынскі агляд і атрымаць заключэнне ўрача. Асабліва гэта датычыцца людзей з хранічнымі захворваннямі, цяжарных жанчын і сем'яў, якія збіраюцца ўзяць з сабой на адпачынак маленькіх дзяцей. Спякотны вільготны клімат, нязвыклае харчаванне і мясцовыя традыцыі культурнага адпачынку падыходзяць далёка не ўсім, таму ўражанні ад паездкі могуць аказацца рэзка адмоўнымі. Каб падчас далёкага падарожжа не здарылася непрыемнасцяў, карысна будзе прыслухацца да наступных рэкамендацый:

1. Пры выездзе ў замежныя краіны трэба памятаць, што ў некаторых з іх існуе рэальная пагроза заражэння інфекцыйнымі і паразітарнымі захворваннямі, якія характарызуюцца цяжкім клінічным цячэннем, паражэннем жыццёва важных органаў і сістэм і нават могуць прывесці да лятальнага зыхода. Да іх адносяцца халера, вірусныя гемарагічныя ліхаманкі, жоўтая ліхаманка, ліхаманкі Эбала, Ласа і Марбург, вострыя кішэчныя інфекцыі і малярыя. Напрыклад, малярыя шырока распаўсюджана ў краінах Азіі, Афрыкі, Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыкі, а таксама на тэрыторыі некаторых краін СНД (у Азербайджане і Таджыкістане). Чалавек, які аказваецца ў небяспечным рэгіёне, рызыкуе захварэць ужо на другім тыдні свайго там знаходжання, але хвароба можа праявіцца і праз 1,5 года пасля вяртання на радзіму.

Выязджаючы ў краіны, небяспечныя па малярыі, неабходна атрымаць у свайго ўрача інфармацыю аб прафілактычных лекавых прэпаратах і спосабах іх прымянення. Перад паездкай сфарміруйце аптэчку, якая зэканоміць ваш час на пошукі лекавых сродкаў і пазбавіць ад праблем зносінаў на замежнай мове з мясцовым насельніцтвам. Прафілактыка захворвання ўключае як абарону ад укусаў насякомых, так і прыём па прызначэнні ўрача лекавых супрацьмалярыйных прэпаратаў (хіміяпрафілактыку), пачынаючы за тыдзень перад выездам у небяспечны рэгіён, увесь час знаходжання там і яшчэ 4-6 тыдняў пасля вяртання на радзіму.

Пры выездзе ў краіны, небяспечныя па жоўтай ліхаманцы (а гэта Паўднёва-Амерыканскі і Афрыканскі кантыненты), абавязкова трэба зрабіць прафілактычную прышчэпку ў 19-й цэнтральнай раённай паліклініцы г. Мінска і атрымаць пасведчанне міжнароднага ўзору аб вакцынацыі супраць жоўтай ліхаманкі. Прафілактычная прышчэпка з'яўляецца адзінай мерай папярэджання гэтага небяспечнага захворвання. Прышчэпка робіцца не пазней, чым за 10 дзён да выезду, а імунітэт захоўваецца на працягу 10 гадоў.

Пільнасць трэба праявіць і накіроўваючыся ў рэгіёны, дзе актывізаваўся поліямізліт: Таджыкістан, Індыю, Афганістан, Пакістан. У групе рызыкі — непрышчэпленыя асобы.

2. Людзям з краін умеранага клімату патрабуецца адаптацыя ў краінах з трапічным і субтрапічным кліматам. Для папярэджання сонечнага і цеплавога ўдараў неабходна насіць адзенне з лёгкіх і натуральных тканін, летні галаўны ўбор, змазваць адкрытыя ўчасткі скуры крэмам ад загару, павялічыць спажыванне вадкасці і абмежаваць прыём алкагольных напіткаў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

3. Асаблівую асцярожнасць трэба праяўляць пры кантактах з жывёлінамі, бо апошнія з'яўляюцца крыніцай многіх інфекцыйных і паразітарных захворванняў. Не чапайце кошак і сабак! Гэта небяспечна практычна ва ўсіх краінах. Калі пры кантакце з жывёлай вы атрымалі ўкус, драпіны ці проста асліненне, старанна прамыйце гэтую частку цела вадой з мылам і адразу звярніцеся да ўрача для вырашэння пытання аб правядзенні прышчэпак супраць шаленства і слупняку.

Сур'ёзную небяспеку ўяўляюць сабой укусы змей, насякомых (скарпіёна, каракурта, тарантула), ядавітых медуз, п'явак, рыб, якія могуць прывесці да сур'ёзных парушэнняў вашага здароўя. Большасць небяспечных для чалавека насякомых-крывасмокаў (блохі, клышчы, камары, слепні, мошкі і мухі) з'яўляюцца пераносчыкамі трапічных інфекцыйных і паразітарных захворванняў. Напрыклад, праз укусы крывасмокаў можна заразіцца гліснымі захворваннямі, узбуджальнікі якіх паразітуюць у лімфатычнай сістэме чалавека, сценках поласцяў цела і падскурнай клятчатцы. Для многіх з гэтых захворванняў характэрныя працяглы інкубацыйны перыяд і цяжкае хранічнае цячэнне. Заразіцца паразітарнымі захворваннямі можна таксама праз садавіну, зеляніну, мяса, рыбу і марскія прадукты.

Каб абараніць сябе ад непатрэбных праблем, на прыродзе трэба апранаць адзенне з доўгімі рукавамі, штаны, чаравікі са шчыльнымі гетрамі ці шкарпэткамі і прымяняць рэпеленты. А ў вячэрні і начны час трэба карыстацца электрычным ліхтарыкам нават у гарадах, каб не сустрэцца з тым жа скарпіёнам.

4. Для пражывання трэба выбіраць гасцініцы, забяспечаныя цэнтралізаваным водазабеспячэннем і каналізацыяй. Пры выяўленні ў пакоі камароў, блох, грызуноў неабходна паведаміць пра гэта адміністрацыі для прыняцця неадкладных мераў па іх знішчэнні. У месцах канцэнтрацыі насякомых патрабуйце сетку (на вокны, дзверы, над ложкам) і наяўнасць у пакоі электрафумігатараў.

5. Харчавацца трэба толькі ў тых месцах, дзе выкарыстоўваюцца прамысловыя прадукты гарантаванай якасці. Для піцця дазваляецца выкарыстоўваць толькі бутыляваную ці гатаваную ваду, напіткі і сокі прамысловай вытворчасці і гарантаванай якасці. Для мыцця садавіны і гародніны таксама трэба выкарыстоўваць толькі бутыляваную і гатаваную ваду.

Ні ў якім разе нельга купляць лёд для ахалоджвання напіткаў у прадаўцоў на вуліцах, і прадукты, якія не прайшлі гарантаваную тэхналагічную падрыхтоўку, у месцах вулічнага гандлю.

Пры набыцці прадуктаў захоўвайце тэмпературны рэжым і не спажывайце прадукты пасля завяршэння тэрміна іх прыдатнасці.

Строга захоўвайце правілы асабістай гігіены. Старанна мыйце рукі пасля вяртання з вуліцы, перад харчаваннем і пасля наведвання прыбіральні.

6. Не рэкамендуецца наведванне экскурсій і іншых мерапрыемстваў, напрыклад, палявання або рыбалкі, у месцах, не пазначаных у афіцыйнай праграме. Купанне турыстаў дазваляецца толькі ў басейнах і спецыяльных вадаёмах.

Не рэкамендуецца ляжаць на пляжы без падсцілкі і хадзіць па зямлі без абутку.

Санітарныя ўрачы не рэкамендуюць таксама набываць футравыя, скураныя вырабы, жывёл і птушак у прыватных гандляроў. Гэта можна быць вельмі небяспечна!

На працягу трох гадоў пасля вяртання з падарожжа пры кожным звароце да ўрача з нагоды захворвання, якое суправаджаецца павышэннем тэмпературы, абавязкова трэба праінфармаваць апошняга пра сваё знаходжанне ў рэгіёне, небяспечным па малярыі. Варта памятаць таксама і пра працяглы інкубацыйны перыяд многіх паразітарных захворванняў, якія з цягам часу набываюць хранічнае цячэнне. Урач павінен ведаць пра ўсе паездкі ў экзатычныя краіны, каб своечасова ўстанавіць першапрычыну вашых сімптомаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Інфарм-укол

Капуста ачышчае

У салернскім кодэксе здароўя XIV стагоддзя выказана такая думка: калі ўрачоў не хапае, няхай урачамі будуць трое: вясёлы характар, спакой і ўмеранасць у ежы.

Паводле слоў **валеолага 2-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Любові ГУРБАН**, характар ежы ў пэўнай ступені ўплывае і на агульнае самаадчуванне, і на настрой, дый на інтэлектуальныя здольнасці таксама. Калі вы вырашылі арганізаваць сваё здаровае харчаванне самі, вазьміце на ўзбраенне некалькі важных прынцыпаў, кажа спецыяліст. Харчаванне павінна быць збалансаваным па бялках, вуглеводах і тлушчах, максімальна натуральным, з выкарыстаннем прадуктаў добрай якасці, з паступовым адмаўленнем ад прадуктаў, якія не ўтрымліваюць вітамінаў, з павелічэннем у рацыёне колькасці свежай садавіны і гародніны. Гэтыя пазіцыі знаходзяць адлюстраванне ва ўсіх аздараўленчых дыетах. І яшчэ адзін важны момант: ежу трэба дасканала жаваць.

Што да той жа гародніны, то дастаткова сказаць хоць бы пра капусту, якая не толькі ўтрымлівае цэлы пералік каштоўных вітамінаў, але яе наогул можна лічыць санітарам нашага арганізма. Калі, напрыклад, правесці аднадзённае галаданне, а затым з'есці салат са свежай капусты з морквай, то гэта будзе сапраўднай генеральнай уборкай у апартаментах кішэчніка. Арэхі і семкі, багатыя на бялкі і высакаякасныя тлушчы, варта ўжываць не часцей за 3 разы на тыдні. Некалькі разоў на тыдні можна ўжываць розныя віды бабовых, багатых на раслінныя бялкі. Цяляціну, ялавічыну, бараніну дыетолагі раяць ужываць не часцей за 2-3 разы на тыдні. З гэткай жа перыядычнасцю рэкамендуецца ўжываць і рыбу, праўда, не салёную і не вэнджаную.

Жуйка прытупляе

Амерыканскія медыкі даследавалі пабочныя эфекты жуйкі. Сярод іх аказаліся разбурэнне пломбаў і стаматалагічных канструкцый, сіндром скроненіжнясківічнага сустава, празмернае развіццё жавальных мышц, павелічэнне ўзроўню ртуці ў арганізме асобаў з пломбамі з амальгамы, павелічэнне праглынутага паветра, непраходнасць трахеі, стрававода і кішэчніка ў выніку трапляння іншароднага цела.

Нельга лічыць цалкам бяспечным праглынанне жуйкі малымі дзецьмі, кажа **валеолаг 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алена ГАРНІЦКАЯ**. Бацькі павінны засвоіць, што нельга даваць дзіцяці жуйку да таго часу, пакуль тыя не зразумеюць, што глытаць яе нельга ні ў якім выпадку. Стаматолагі і педыятры сыходзяцца таксама на тым, што дзецям лепей набываць белую, без фарбавальнікаў, жуйку. Жаваць трэба толькі пасля яды і не даўжэй за 15 хвілін. Нельга жаваць жуйку нашча. Варта мець на ўвазе, што ніводная жуйка не можа замяніць зубную шчотку. І яшчэ: жуйка не дае магчымасці засяродзіцца, прытупляе ўвагу, зніжае памяць і аслабляе працэс мыслення.

Святлана БАРЫСЕНКА.

У МІНСКУ БУДУЦЬ СУДЗІЦЬ... ТЫТУНЬ

У гандлёвым цэнтры «Сталіца» 31 мая адбудзецца «Суд над тытунём».

Так называецца рэспубліканская моладзевая акцыя, пра якую расказаў першы сакратар Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Ігар Бузоўскі. На пляцоўцы пад цэнтральным купалам усім ахвотным прапануюць убіць у стылізаванае пад цыгарэту бервяно вялізны цвік, а таксама стаць удзельнікам судовага працэсу над тытунём. У вялізнай «мясарубцы» здробняць тытунёвыя вырабы, сабраныя валанцёрамі ў працэсе акцыі «Мяняем цыгарэту на цукерку!» і зачытаюць тытуню абвінаваўчы прыгавор. Удзельнікі акцыі будуць таксама прапаноўваць мінчанам і гасцям сталіцы ўдзел у моладзевай «крычалцы»: «Здароўе — гэта крута!». Пад уражаннем ад леташняй аналагічнай акцыі Ігар Бузоўскі, як ён сам прызнаўся, кінуў курыць, маючы стаж курца больш за пяць гадоў.

Ніна ЯНОВІЧ, «Мінск—Навіны».

У **суд Касцюковіцкага раёна Магілёўская вобласці** паступіла заява **Мікруковай Вольгі Міхайлаўны** аб **прызнанні памерлым Елісеенкі Мікалая Іванавіча**, 3 снежня 1975 года нараджэння, ураджэнца вёскі Калодзезскай Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці Рэспублікі Беларусь, апошняе вядомае месца жыхарства і знаходжання са студзеня па лістапад 2006 года: Рэспубліка Беларусь, Магілёўская вобласць, пасёлак Шарэйкі, дом № 7, цяперашняе месца знаходжання невядома.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзяніна Елісеенку М.І., паведаміць іх суду Касцюковіцкага раёна на працягу двух месяцаў з дня публікацыі.

РАТУЕМ СУСТАВЫ

Бывайце здаровыя

«Хочам падзякаваць калектыву навукова-вытворчага прадпрыемства «Дыялек», стваральнікам маслянага раствору «Дыясінол». Маці, я і сястра — усе карыстаемся ім, ён вельмі дапамагае зняць боль. Хацелася б, каб ён каштаваў крыху менш, але што зробіш... Сталай маці прэпарат дапамагае справіцца з астэахандрозам, артрозам, артрытам... Вядома ж, поўнасцю зняць боль не ўдаецца, але становіцца лягчэй... Вялікі дзякуй.

З павагай Яўгенія Крывулец, а таксама Марыя Дзям'янаўна і Галіна Цімафееўна, *г. Брэст.*

Прэпарат «Дыясінол», пра які ідзе гаворка ў лісце, рэкамендаваны пры рэўматычных, траўматычных і іншых дэгенератыўна-дыстрафічных захворваннях і пашкоджваннях суставаў. Ён з'яўляецца эфектыўным сродкам для лячэння артрозаў і артрытаў, аднаўленчага лячэння пасля траўмаў і хірургічных аперацый на суставах.

Паводле слоў **намесніка дырэктара па вытворчасці — галоўнага тэхнолага УП «Дыялек» Ларысы БАБУК**, у якасці асноўнага кампанента ў прэпарате выкарыстаныя вадкакрысталічныя злучэнні. Іх склад падобны на той, які быў выяўлены ў натуральнай змазцы суставаў. Даследаванні паказалі, што «Дыясінол» абараняе храсток ад механадэструкцыі, запавольвае разбурэнне пратэагліканаў храстковага матрыксу і стымулюе сінтэтычную функцыю хандрацытаў. У выніку прымянення прэпарата пашкоджаны храсток аднаўляецца, яго паверхня становіцца гладкай. Клінічна даказана, што хондрапратэктар «Дыясінол» пазбаўляе ад болю, змяншае запаленне і павышае рухомасць хворага сустава.

Прэпарат наносяць тонкім слоем на пашкоджаны сустаў і накладваюць сагравальны кампрэс не менш як на 1 гадзіну. Курс лячэння — 7-10 дзён. Пабочныя дзеянні не выяўлены. «Дыясінол» адпускаецца без рэцэпта ўрача ва ўсіх камерцыйных і дзяржаўных аптэках.

Святлана БАРЫСЕНКА.

СЛЁЗЫ ГОР, СМАЛА ЖЫЦЦЯ

Лечымся без лекаў

З усяго арсенала нетрадыцыйных сродкаў лячэння мумію, бадай, адно з самых таямнічых. Усходняй медыцыне яно вядомае больш як тры тысячагоддзі. У Іране, Аравіі, Індыі, Кітаі пра яго гаючыя ўласцівасці складалі легенды. Арыстоцель, Біруні, Авіцэна сцвярджалі, што па сіле і спектры ўздзеяння мумію шматразова пераўзыходзіць нават корань жыцця — жэньшэнь. Чым жа карысны гэты дар прыроды?

Што такое мумію — дакладна сказаць не возьмецца ніхто. Гэта загадкавая субстанцыя здабываецца высока ў гарах у глыбокіх пячорах і гротах. Яна ўтвараецца ў выглядзе нацёкаў на схілах скал, і аб прыродзе яе паходжання спрачаюцца да гэтага часу. Адна з легендаў сцвярджае, што мумію — гэта кроў тытана Праметэя, які падарыў людзям агонь і якога ў пакаранне за гэта багі прыкавалі да скалы. Тыбетцы ж лічылі, што са скал, распалены пад пякучым сонцам, пачынаюць выступаць сокі шасці відаў металаў: золата, серабра, медзі, жалеза, волава і свінцу, застываючы і ўтвараючы нацёкі. Грэкі называлі мумію горным воскам, арабы — горным потам, які лечыць цела, бірманцы — крывёю гор, алтайцы — каменным алеем.

Што ж уяўляе сабой мумію насамрэч? Дзіўна, але нават пры сённяшнім узроўні развіцця тэхналогій вучоныя ніяк не могуць прыйсці да адзінага меркавання аб яго паходжанні. Тэорый існуе вялікае мноства, аднак ні адна з іх не атрымала дастатковага навуковага абгрунтавання. Адны вучоныя лічаць, што мумію — гэта выкапнёвы мёд з прымессю пчалінага яду. Другія сцвярджаюць, што гэта — смала хвойных дрэў, якая прасачылася ў глебу праз карані з вадой і ўтварыла нацёкі на скалах.

Адна з найбольш верагодных версій дастаткова экстрэмальная: рэч у тым, што мумію звычайна знаходзяць у пячорах і на скалах, дзе жывуць дробныя грызуны, казаны, горныя казлы і дзікія галубы, а таксама растуць пэўныя лекавыя расліны: дзікая шыпшына, мята, палын, чабор і іншыя. Ёсць усе падставы меркаваць, што мумію — не што іншае, як зацвярдзелы канчатковы прадукт жыццядзейнасці гэтых жывёл, якія харчуюцца лекавымі травамі.

Аднак гэты факт ніколькі не бянтэжыць тых, хто ведае пра неверагодныя гаючыя ўласцівасці «смалы жыцця».

ШТО ЛЕЧЫМ?

У сваім «Каноне ўрачэбнай навукі» Авіцэна пісаў: «Горны воск — незаменны сродак пры вывіхах і пераломах, ён лечыць удары, здымае параліч, умацоўвае страўнік і палягчае дыханне, робіць сэрца маладым, а суставы гнуткімі, надае сілу мышцам і бляск вачам. Ён карысны і маладым юнакам, якія сустракаюць сваю вясну, і мужам, якія стаяць на парозе восені свайго жыцця».

Афіцыйная медыцына разглядае мумію толькі як харчовую дабаўку, аднак прызнае, што гэты цудоўны дар прыроды здольны вылечыць ад многіх немачаў. Вось толькі некаторыя з іх: гінекалагічныя і інфекцыйныя захворванні, розныя формы дыябету, экзэма, гемарой, аднаўленне пасля траўмаў і пераломаў, гіпертанія, парушэнні абмену рэчываў, умацаванне сардэчнай мышцы, хваробы крыві і сасудаў. І гэта далёка не поўны спіс.

Аднак самалячэннем займацца нельга катэгарычна, паколькі вельмі важна вызначыць дакладную дозу прыёму, інакш можна атрымаць прама супрацьлеглы эфект. Таму без кансультацыі спецыяліста не абысціся.

А вось выкарыстоўваць мумію ў касметычных мэтах у хатніх умовах цалкам магчыма. Яно акажа амаладжвальнае дзеянне на скуру, ачысціць яе ад вугроў і высыпкі, пазбавіць ад расцяжак.

Каб прыгатаваць маску для скуры твару, трэба змесціва аднаго цюбіка нейтральнага крэму (лепш дзіцячага) змяшаць з 15 г мумію і пакінуць сумесь на суткі, каб рэчыва цалкам растварылася. Абагачаны крэм выкарыстоўваюць у якасці штотыднёвай касметычнай маскі: наносяць на ачышчаную скуру, пакідаюць на 20 хвілін, затым выдаляюць лішкі сурвэткай. Маску захоўваюць у халадзільніку.

Каб папесціць сваё цела, растварыце 5 г сродку ў 0,5 літра гатаванай вады і выліце сумесь у ванну. Такую ванну трэба прымаць на чыстую скуру, каб поры яе былі адкрытымі.

Ад расцяжак дапаможа такі рэцэпт: 4 г мумію развесці ў 50 мл малачка для цела. Наносіць на праблемныя месцы кругавымі рухамі кожны вечар на працягу месяца.

АСЦЯРОЖНА: ПАДРОБКА!

Сапраўднае мумію ўяўляе кавалачак бліскучай масы чорнага або чорна-карычневага колеру. Для вызначэння якасці кавалачак мнуць у руках — высакаякаснае мумію хутка становіцца пластычным і мяккім, без асадку раствараецца ў вадзе, а дрэнна ачышчанае і, значыць, бескарыснае — застаецца цвёрдым.

Другая прыкмета якасці — пах. У гэтага рэчыва ён вельмі спецыфічны і нават крыху рэзкі. Смак — гаркаваты. Адзначым таксама, што спецыялісты вельмі скептычна ставяцца да мумію ў таблетках і капсулах.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Цікава

- Мумію мае надзвычай багаты склад, які ніколі не бывае аднолькавым і залежыць ад месца, дзе яно было здабытае. Кожны ўзор мае свае асаблівыя біялагічныя ўласцівасці.
- У ім утрымліваецца каля 28 хімічных элементаў, 30 макра- і мікраэлементаў, а таксама 10 розных вокісаў металаў, 6 амінакіслот, вітаміны, эфірныя алеі і смолы.
- Каб атрымаць гатовую да ўжывання лекавую форму, мумію неабходна ачысціць ад прымесяў. Але рабіць гэта трэба, строга захоўваючы тэхналогію ачысткі, інакш яно страціць усе свае лекавыя ўласцівасці.
- Запасы мумію ў прыродзе абмежаваныя. Але з-за таго, што аднаразовыя дозы прымянення для чалавека вельмі малыя — звычайна 0,1—0,2 грама за прыём — невялікай колькасці рэчыва хапае на доўгі час.
- Мумію — магутны біястымулятар, які паляпшае функцыі імуннай сістэмы, падаўляе мутацыйныя працэсы і ўзмацняе аднаўленчыя.

Прыміце да ведама

ПЛЯЖ — РАССАДНІК БАКТЭРЫЙ І ГРЫБКОЎ

Вучоныя папярэджваюць: пляжны пясок — сапраўдны рассаднік розных бактэрый і грыбкоў, якія з лёгкасцю пераходзяць на неабачлівых турыстаў.

Традыцыйныя рэкамендацыі ўрачоў для аматараў падарожжаў: не піць ваду з-пад крана, не эксперыментаваць з кухняй, не катацца на экзатычных жывёлах і перад ад'ездам у адпачынак абавязкова зрабіць усе неабходныя прышчэпкі. Амерыканскія вучоныя дадаюць сюды яшчэ адну параду: старанна мыцца пасля купання і ні ў якім выпадку не есці, знаходзячыся на пляжы. Таму што пляжны пясок, сцвярджаюць яны, — кішыць рознымі бактэрыямі і грыбкамі.

Да такой высновы медыкі прыйшлі, вывучыўшы склад пяску на азёрных пляжах Амерыкі. На многіх цудоўна жыла і размнажалася кішэчная палачка, якая можа перабрацца на скуру чалавека пасля аднаго толькі дакранання да пяску. Супаставіўшы колькасць бактэрый з сярэднім працэнтам захваральнасці па краіне, вучоныя палічылі, што з 1000 наведвальнікаў пляжа ад 11 да 33 атрымліваюць захворванні кішэчнага тракта пасля няўдачных канікулаў.

Пры гэтым турыст нават не даведаецца пра тое, дзе менавіта падхапіў заразу — бо на наяўнасць шкодных бактэрый традыцыйна правяраюць толькі ваду, але не глебу вакол яе. Між тым, апошнія даследаванні паказалі, што менавіта на берагах вадаёмаў канцэнтрацыя бактэрый максімальная і можа перавышаць іх утрыманне ў вадзе ў некалькі разоў.

Зрэшты, засцерагчы сябе ад гэтай небяспекі проста, супакойваюць медыкі. Змыць бактэрыі са сваіх рук можна звычайнай вадой і мылам, ніякіх спецыяльных антыбактэрыяльных сродкаў не патрабуецца. Такім чынам, калі вы паляжалі на пляжы або пакупаліся, абавязкова памыйце рукі, калі даберацеся да водаправода. Бо нават з кончыкаў пальцаў бактэрыі могуць патрапіць на любую ежу, якую вы возьмеце, а адтуль — прама у ваш кішэчнік.

Асабліва асцярожнымі трэба быць тым, хто прыводзіць на пляж дзяцей. Па-першае, маленькія гарэзы дакладна не ўтрымаюцца ад узвядзення пясочных замкаў і іншых пляжных забаў і абавязкова не-не дый залезуць рукамі ў рот. Таму мамам і татам ні ў якім выпадку нельга расслабляцца — за дзіцем патрэбна вока ды вока. А па-другое, дзеці пэўна зацягнуць у свае гульні і бацькоў. Малыя асабліва любяць закопваць у пясок сяброў і дарослых. Здагадваецеся, чым гэта заканчваецца? Калі пляж не «стэрыльны», бактэрыі разбягуцца па ўсёй паверхні вашага цела. Медыкі рэкамендуюць: пасля такіх забаў абавязкова трэба вымыць рукі; калі ёсць магчымасць, прыняць душ, або, на крайні выпадак, скарыстацца кампактным гігіенічным сродкам. Балазе, такіх сродкаў сёння ў любой краме шмат.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

Доктар адказвае

На наступным тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

25 мая — намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра гематалогіі і трансфузіялогіі Сяргей Пятровіч ЛЯШЧУК.

26 мая — галоўны ўрач Мінскага абласнога псіханеўралагічнага дыспансэра Таццяна Фёдараўна МАРТЫНАВА.

27 мая — намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра дзіцячай анкалогіі і гематалогіі Аксана Мікалаеўна РАМАНАВА.

28 мая — намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра аталарынгалогіі Святлана Іванаўна СЯДЗЕЛАВА.

31 мая — галоўны спецыяліст аддзела медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі Міністэрства аховы здароўя Тамара Канстанцінаўна МАРТУСЕВІЧ.

«Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25

24 мая — старшыня Мінскай міжраённай МРЭК Элеанора Віктараўна Псацій

25 мая — намеснік галоўнага ўрача Мінскай цэнтральнай раённай бальніцы Аксана Уладзіміраўна Зародава.

26 мая — загадчык кансультацыйнай паліклінікі пры Мінскай абласной клінічнай бальніцы Генадзь Генадзьевіч Буркас.

27 мая — адказны ўрач РКЦ Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Сяргей Мікалаевіч Грыдзін.

28 мая — загадчык гастраэнтэралагічнага аддзялення Мінскай абласной клінічнай бальніцы Аляксандр Гаўрылавіч Сасноўскі.

31 мая — урач арганізацыйна-метадычнага аддзела Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Дзмітрый Мікалаевіч Лазар.

У графіку магчымыя змяненні.

УНП 300039758.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ ИНДИВИДУАЛЬНОГО ЖИЛИЩНОГО СТРОИТЕЛЬСТВА. ОРГАНИЗАТОР: КАМЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

№ лота	Вид аукциона, целевое назначение	Местоположение земельного участка, площадь, кадастровый номер	Условия и ограничения	Расходы по подготовке и изготовлению документов, руб.	Начальная цена, руб.	Сумма задатка, руб.
	В частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома	д. Поземщина, участок № 1-в Лепельского района, площадь 0,2460 га, кадастровый номер 222781711601000028	- водоохранная зона озера «Островно»; - получение победителем в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство	601 192	1 000 000	100 000

1. Аукцион состоится **29 июня 2010 года в 15.00** по адресу: Витебская область, Лепельский район, деревня Камень, улица Ленинградская, дом 25а.

2. Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: деревня Камень, улица Ленинградская, дом 25а, Каменский сельский исполнительный комитет. Последний день приема заявлений **26 июня 2010 года до 17.00.**

3. К участию допускаются граждане РБ, подавшие заявление установленной формы, внесшие задаток в размере 10 % от начальной цены объекта аукциона в кассу Каменского сельисполкома.

4. Для участия в аукционе необходимо предоставить копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования.

Представителем гражданина – нотариально удостоверенную доверенность, удостоверяющую личность, а также предъявляет паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, и копии платежных документов, подтверждающих уплату залога.

5. Оплата стоимости предмета аукциона, расходов по организации и проведению аукциона, публикацию в средствах массовой информации и расходов по подготовке и изготовлению документации, подлежащих возмещению победителем, осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о передаче в частную собственность победителю аукциона земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами и земельным участком в натуре.

Контактные телефоны: 8(02132) 2 39 62; 8(029) 713 99 41.

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА БЕЗ УСЛОВИЙ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ОБРАЩЕННОГО В ДОХОД ГОСУДАРСТВА

Адрес объекта и его наименование	- ангар, расположенный по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. В. Гастинец, 67, инв. №16-00091 общей площадью 394,4 кв. м, год постройки – 1979, фундамент кирпичный, стены металлические, крыша металлическая, полы бетонные. Начальная цена – 121 680 000 рублей. - трехкомнатная квартира, расположенная по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Томилина, 30-2, стены кирпичные, изнутри оштукатуренные; перегородки гипсовые, оштукатуренные; полы – линолеум; двери филенчатые; общей площадью 64,8 кв. м, площадь жилых комнат 44,6 м.кв., площадь подсобных помещений 20,2 м.кв., год постройки – 1974. Начальная цена – 99 540 000 рублей. - одноэтажное кирпичное здание (комплекс состоит из столярного цеха, лесопильного цеха, бытового помещения, кран-балки), расположенное по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Элеваторная, 5 общей площадью 851,1 кв. м, год постройки – 1976. Начальная цена – 230 940 000 рублей. - бокс гаражный, кирпичный, расположенный по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Элеваторная, 5 общей площадью 92,8 кв. м, год постройки – 1978. Начальная цена – 26 640 000 рублей
Продавец	Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Молодечненском райисполкоме
Организатор аукциона	СИКУП «УКС-СЕРВИС»
Сумма задатка	- ангар – 12 168 000 (Двенадцать миллионов сто шестьдесят восемь тысяч) рублей на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-СЕРВИС»; - квартира – 9 954 000 (Девять миллионов девятьсот пятьдесят четыре тысячи) рублей на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-СЕРВИС»; - одноэтажное кирпичное здание – 23 094 000 (Двадцать три миллиона девяноста четыре тысячи) рублей на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-СЕРВИС»; - бокс гаражный, кирпичный – 2 664 000 (Два миллиона шестьсот шестьдесят четыре тысячи) рублей на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-СЕРВИС»
Порядок оплаты	Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 2 месяцев и 25 дней на р/с СИКУП «УКС-СЕРВИС»
Документы, представляемые для участия в аукционе	заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, заверенные нотариально, доверенность, выданная представителю юридического лица; физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, справку ГНИ об отсутствии задолженности по подоходному налогу
Конечный срок и адрес приема заявок	21.06.2010 г. до 16.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», тел. (8 0176) 75 16 09, 75 19 20 (факс)
Дата, время и место аукциона	22.06.2010 г. в 15.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15, СИКУП «УКС-СЕРВИС»

УНН 600182305

Наш культурны асяродак

ЖЫРАНДОЛЯ

Выпуск № 8 (94)

МІФЫ І РЭЧАІСНАСЦЬ

Не веру нікому, пакуль сама не пераканаюся ў нечым. Нават калі разумныя, дасведчаныя людзі, якім давяраю, будуць казаць вельмі аргументавана — вось пра спектакль напрыклад... Напэўна, ніводная тэатральная пастаноўка не выклікала такога розгаласу сярод нашых чытачоў, як спектакль «Пане Каханку» Нацыянальнага драматычнага акадэмічнага тэатра імя Горкага. **На сайце дагэтуль пакідаюць каментары на водгук Глеба ЛАБАДЗЕНКІ, які змясціла газета.** Дык добра гэта ці ўсё-такі дрэнна? Цікава, што вельмі шмат водгукаў тых, хто не бачыў спектакля, але асуджае. Ужо сам падыход: гэты Радзівіл быў зусім не такі!.. Навошта?!..

Не пабаяўшыся схадзіць у тэатр (няхай мяне паб'юць), прызнаю: Радзівіл сапраўды не той. Не той, пра якога чытала ў кніжках. Не той, які па паданнях, атрымаў мянушку Пане Каханку за тое, што так пяшчотна звяртаўся да чалавека, перад тым, як яго павесіць... Ды колькі розных баек пра яго «баюць». Андрэй Курэйчык напісаў п'есу пра чалавека, які спачатку сядзіць і піша ліст пра тое, што вельмі сумуе па радзіме і просіць міласці ў царыцы, каб вярнуцца з высылкі. А потым у маёнтку прымае свайго караля, які дзівіцца, на што князь грошы траціць. Частуе яго стравамі. Паказвае тэатральную прэм'еру, вядзе на дзіўнае паляванне, калі страляюць соллю ў дупу людзям, якія сядзяць на дрэвах і каркаюць нібыта вароны. Дэманстратыўна пры каралі плаціць ім за «працу». А то яшчэ ідзе ў лабараторыю, дзе розныя вынаходніцтвы выспяваюць, каб вывесці сваіх людзей на перадавую арбіту. Ды хоць бы прырабіць ім крылы. Тыя крылы прымярае яго сястра Тэафілія. Але ёй яны чамусьці не пасуюць. Можа каб адпомсціць брату за такі смешны выгляд, яна (бо строгага нораву, як гаворыцца са сцэны, старая рэтраградка і інтрыгантка), ці таму што хоча адчуваць сябе гаспадыняй у хаце, вырашае ўступіць у змову з каралём. Выдае сакрэт кахання князя да актрыскі. Кароль абяцае будучай зорцы ангажэмент у сталіцы, шантажуе гэтым князя. Ён пазбаўлены магчыма апошняга кахання, аднак каралю не саступае: маўляў, усё адно ён слабы кіраўнік. І ў такім выпадку лепш раскідаць камяні, а потым збіраць іх наноў, сваёй вёскай. Ці горадам. Ці народам...

Згодна, Курэйчык проста падмяніў Пане Каханку — магчыма, Радзівілы нават разам усе не выглядалі б такімі «руковымі». Таму хутчэй гэта зборны вобраз беларускай шляхты, сярод якой столькі розных дзівакоў з прыгожымі марамі было. Семяновіч, які 400 гадоў таму сапраўды думаў пра палёты і марыў пра ракеты. Тышкевіч, які захапляўся археалогіяй і сам у зямлі шукаў розныя выкапні, з якіх потым стварыў музей... Ці зборны вобраз беларусаў, якім спакойна ў шчасці хочацца жыць, і за гэта не плаціць. Але мы ж не такія — ну зусім жа не такія. Мы дагэтуль не разумеем, навошта нейкія свае зоркі, мастакі, навошта навука, калі яна не навучылася сінтэзаваць золата, чаму трэба некуды ляцець. Бо ў імкненні да дасканаласці мы... рэалісты.

Я не заўсёды чакаю дасканаласці ад тэатра. Я рэалістка — дапускаю адхіленні. Разумею, што мастацтва можа ствараць міфы пра тое, чаго не было. Але колькі іх дапусціць на адзін квадратны сантыметр п'есы? І што можна дапусціць? Для мяне ў мастацтве дакладна недапушчальна хіба тое, што прыніжае чалавека, што бэсціць і калечыць душу, закранаючы асновы маралі. Усё іншае — можна абмяркоўваць. Што мы і робім.

Сёння пра дапушчальнасць містыфікацый у мастацтве разважаюць зацікаўленыя асобы: аўтар, гісторык, тэатразнаўца, літаратуразнаўца. Мы задавалі ім тры аднолькавыя галоўныя пытанні:

1. Ці варта ствараць гістарычныя містыфікацыі ў мастацтве, ці трэба ставіцца да гісторыі з трымценнем — як да скончанай формы ведаў?

2. Пытанне гістарычнай праўды ў мастацкім творы: ці варта да яе імкнуцца, калі герой — гістарычная асоба?

3. Што даюць грамадству гістарычныя міфы, створаныя ў кнігах, тэатры, фільмах?

Ларыса ЦІМОШЫК.

Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА.

«Мастак мае права на вольнае трактаванне падзей»

Так лічыць Валянцін МАЗЕЦ, кандыдат гістарычных навук, супрацоўнік Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі.

1. — Калі я глядзеў спектакль, то не думаў пра гэта. Лічу, што трэба напачатку развесці дзве значныя плыні. Першая: дасканалыя навуковыя факты. Гэта тое поле, дзе сеюць збажыну і збіраюць ураджай навукоўцы-гісторыкі. Але на іншым полі працуюць і збіраюць свой ураджай мастакі, паэты, пісьменнікі, а таксама тэатральныя дзеячы, якія праз гістарычныя падзеі ствараюць свае вобразы. Патрабаваць ад мастацтва дакладнага прытрымлівання літары гісторыі абсалютна немагчыма. Мастак мае права на творчы вымысел, і ўжо на аснове яго можа папулярызаваць тыя ці іншыя гістарычныя падзеі. Ён мае права на сваё ўласнае бачанне. Між іншым і гісторыкі не заўсёды могуць быць дакладныя: калі на нейкі момант маюць адны гістарычныя факты, могуць ствараць аднабокую карціну. І таму для ўсебаковай карціны трэба супастаўленні розных фактаў. Прад'яўляць прэтэнзіі да мастакоў, што яны нешта сказілі ці не так падалі той ці іншы факт, як можа падавацца чалавеку, які існуе ў гістарычным полі, — бессэнсоўна.

— Чаму гэты спектакль выклікаў столькі спрэчак сярод тых, хто захапляецца гісторыяй?

— Усё залежыць ад чаканняў. Калі чалавек ідзе на тую ці іншую пастаноўку, то звярнуўшы ўвагу на назву, звязаную з гісторыяй, даволі часта спадзяецца ўбачыць падрабязнае гістарычнае апісанне тых ці іншых падзей. Але маючы пэўныя чаканні, трэба разумець, што мастацтва можа быць нечаканым. Для таго каб успрыняць той жа спектакль, трэба асэнсаваць яго фабулу, галоўную ідэю, думку. Дзеля чаго ён быў пастаўлены? Альбо ён як дакументальныя аповесці ці фільм павінен суха перадаваць тыя ці іншыя падзеі ў храналагічным парадку — але гэта іншы жанр і адпаведна задачы.

Тут мы маем справу са спробай аўтараў, абапіраючыся на нейкія асобныя моманты гістарычнага мінулага, апеляваць да сённяшняга дня, да людзей, да іх свядомасці. І ты пачынаеш разважаць, якія думкі ўкладзены ў вусны тых ці іншых акцёраў. У гэтым выпадку гэта перш за ўсё апеляванне да праблемаў, якія актуальныя для сённяшняга грамадства. Я так адчуў.

2. Пытанне гістарычнай праўды ў мастацкім творы...

— Усё залежыць ад таго, якую мэту ставіць перад сабой аўтар. Калі ён стварае праўдзіва-гістарычны твор, то яму патрэбна максімальна прыбліжана да гістарычнай рэальнасці перадаваць падзеі. Спектакль не з'яўляецца падрабязным хыццяпісам Радзівілаў. Мае месца жаданне праз вусны той ці іншай асобы перадаць думкі, якія мае на мэце сам аўтар. Любы мастак — дзякуючы гэтаму і мастацтва будзе развівацца — мае права на свабоду творчасці, трактавання. Нельга патрабаваць строга прытрымлівацца, напрыклад, прынцыпам сацыялістычнага рэалізму, як было ў савецкія часы. Ды і ў гістарычнай навуцы адзін і той жа факт можна падаць па-рознаму, тут таксама можна параўнаць савецкія часы і сучаснасць, калі шмат што ў гісторыі сталі трактаваць па-іншаму.

Магчыма, у некага ўзнікла жаданне прыдрацца да сюжэта спектакля «Пане Каханку». Аднак перш за ўсё гутарка ідзе пра тое, што людзі — беларусы — годныя лепшага жыцця. У сюжэце адлюстравана спроба навучыць чалавека лятаць, праз гэта ўкладваецца думка пра неабходнасць пастаяннага імкнення да самаўдасканалення, да новых вышыняў. Дзеля гэтага і паказаны нейкія дзівацтвы — былі яны такія ці іншыя — не галоўнае пытанне. На маю думку, на тое і мастак, каб у алегарычнай, міфалагічнай форме перадаць тыя ці іншыя думкі.

3. — Гістарычныя міфы, створаныя праз мастацтва, якраз дапамагаюць выпрацоўцы нацыянальнай самасвядомасці ўвогуле і фарміраванню свядомасці чалавека ў прыватнасці. Таму што такія формы падачы міфаў прымушаюць кожнага асобнага чалавека задумацца пра свой узровень ведання гісторыі, пра свой магчымы ўнёсак у яе. Безумоўна, аўдыторыя, якая падкаваная гістарычнымі фактамі, кожную мастацкую містыфікацыю можа скептычна ўспрымаць, пры гэтым разумеючы, што для большасці людзей значна больш карысная спасылка на яе. Каб потым да той жа гісторыі звярнуцца на іншым узроўні.

Можна ўзгадаць працу Міколы Ермаловіча «Па слядах аднаго міфа», якая аднойчы раскрыла шырокім колам цэлы перыяд гісторыі Беларусі і падштурхнула на далейшыя даследаванні Вялікага Княства Літоўскага. На маю думку, міфы падштурхоўваюць, абуджаюць цікавасць да больш глыбокага асэнсавання свайго мінулага. Чалавека трэба штурхаць, бо ён напалову істота жывёльная, напалову — сацыяльная. Для таго каб чалавек стаў істотай у большай ступені сацыяльнай, якраз і патрэбна ствараннe міфаў.

«Гістарычныя фігуры прыцягваюць нібыта зоркі»

Упэўнена Таццяна АРЛОВА, прафесар, тэатральны крытык:

1. — Пытанне наконт стварэння міфу не зусім абгрунтаванае, таму што міф вельмі не проста стварыць. Міф — з'ява складаная, трэба мець вялікі талент, каб паўплываць на яго з'яўленне. Але гэты спектакль дае глебу казаць вось пра што: гісторыя Беларусі доўгі час была невядомая шырокай публіцы. Цудоўна, што тэатр і кінематограф звярнуліся да яе. На жаль ці на шчасце, не ведаю, былі вельмі кароткія гістарычныя звесткі пра Анастасію Слуцкую — адзін радок пра яе, дзякуючы чаму з'явіўся фільм. Аляксей Дудараў адзін з першых прыцягнуў увагу да гістарычнай тэмы праз тэатр. Але калі разабрацца, то і ў яго не ўсё дасканала. Наконт дакладнасці гісторыі яму прад'яўлялі шмат прэтэнзій. Я лічу, што ёсць станоўчы пачатак у тым, што звярнулі ўвагу на такую неардынарную гістарычную асобу як Радзівіл «Пане Каханку». І людзям хочацца пасля прагляду пачытаць што-небудзь пра яго.

Што датычыцца спектакля «Пане Каханку», то так атрымалася, што я глядзела яго разам са сваёй сяброўкай Надзеяй Фёдараўнай Высоцкай, вялікім спецыялістам-гісторыкам, якая цяпер мае дачыненне да рэстаўрацыі Нясвіжскага палаца. Яе ў гістарычнай частцы шмат што абурыла. Але яна была падкупленая акцёрскай ігрой. Для яе выкананне Расціслава Янкоўскага пераважыла ўсё астатняе. Янкоўскі — герой, умее іграць і трагічныя, і драматычныя ролі, але беларускага матэрыялу за яго акцёрскі лёс было мала, як і беларускіх роляў. І раптам у ім прабіўся такі добры гумар! Бо іграць ёсць што — гістарычны матэрыял дае каласальны патэнцыял.

Магчыма гэта адказ на пытанне: калі зроблена таленавіта, то можна заплюшчыць вочы на нейкія гістарычныя недасканаласці. Але калі б гэта было кіно, а не спектакль, то натуральна, хацелася б больш гістарычнай дакладнасці.

Напрыклад, калі Сяргей Кавалёў піша на гістарычныя тэмы, то ён капае рупліва і глыбока — бо гісторык і філолаг. Вядома ж, было б лепш, каб нашы маладыя драматургі больш пісалі на сучасную тэму: такіх п'ес нестае. А ў гісторыю лезці — трэба валодаць вельмі вялікім інтэлектуальным запасам, ведамі.

2. — Імкнуцца, напэўна, трэба, але гэта немагчыма. Таму што мастак заўсёды суб'ектыўны і прапускае праз сябе ўсе гэтыя гісторыі, і, натуральна, ён мяняе акцэнты. Так як некалі змяніў акцэнты Пушкін у гісторыі Моцарта і Сальеры. У выніку — шмат гадоў музыканты адмаўляліся іграць музыку таленавітага кампазітара Сальеры. Таму што ставілася пытанне рубам: «Талент ці забойца?». Вось доказ таму, што мастак сапраўды можа паўплываць на адносіны да гісторыі і выдатных асобаў.

Але гэта вельмі спрэчнае пытанне, тут не можа быць адназначнага рашэння. Вельмі цяжка аднавіць абсалютна да дэталяў, як усё было насамрэч у Радзівілаў. Так, яны недзе былі легкадумныя, недзе распускаліся, але ж яны і калекцыянавалі мастацтва, ствараліі культуру. Уршуля Радзівіл была звязаная з тэатрам. Мацей — з музыкай. Антоній сказаў сваё слова ў культуры.

Мне здаецца, ёсць яўная нацяжка ў тым, што п'еса ўсё-такі недасканаллая, аўтар быў не вельмі пераканаўчы. Гэтую п'есу рэжысёр і сцэнограф (яго заслуга вялікая) ператварылі ў мастацкі твор, удасканалілі. Магчыма, нехта не чуў пра самога Пане Каханку, не ведае пра яго — той будзе ўспрымаць яго тэатральную гісторыю як любую выдуманую.

3. — Я лічу, што карысць у тым, што прыцягваецца ўвага да нейкай з'явы. Напрыклад, калі выйшаў серыял паводле «Ідыёта» — людзі кінуліся чытаць Дастаеўскага. Выйшла экранізацыя «Майстра і Маргарыты» Булгакава — пацягнуліся да кніжак. Гэта пашырае кругагляд, пашырае і культурную прастору.

Я ў свой час прад'яўляла прэтэнзіі Дудараву наконт «Чорнай панны Нясвіжа». Пісала шмат наконт таго, што ён надта засяродзіўся на каханні, і з-за таго, што ўсё падпарадкаваў гэтай ідэі, былі моцна скажоныя факты аб той жа Барбары Радзівіл. Бо яна не была ні такой, як у п'есе, наіўнай, ні святой, а наадварот мела дрэнную жаночую рэпутацыю. Аднак прайшло шмат гадоў, а гэтыя спектаклі ідуць на «ўра», што ў тэатры Купалы, што ў тэатры імя Коласа, у іншых. Значыць, яны запатрабаваныя людзьмі, якія, магчыма, шукаюць у тэатры не толькі ведаў, але і атрымліваюць штосьці для сябе чыста па-чалавечы. Дык чаму б не прыцягнуць праз яго цікавасць да рэальных асобаў? Людзі, магчыма, сталі разбірацца, хто Радзівіл Руды, хто Чорны. Пацікавіліся, што зрабіў Жыгімонт... Гістарычныя фігуры самі па сабе прыцягваюць, нібыта зоркі.

У спектаклі «Пане Каханку» наша ўяўленне пра той час і яго герояў значна змешчана. Нікуды ад гэтага не падзенешся. Але як да гэтага ставіцца? Няўжо забараняць?.. Мне здаецца, значна горшы вынік бывае, калі нам паказваюць сапраўды нейкую пошласць. Калі з экрана ідзе пустая камедыя. Вось у такіх выпадках бывае крыўдна — ад гэтага густы пагаршаюцца. А ў выпадку са спектаклем «Пане Каханку» нават сама спрэчка, рэзананс, які ён нарадзіў, ужо карысны.

«Беларусь у мяне — у тройцы лідараў»

«Еўрабачанне-2010»

Аляксандр РЫБАК:



Фота Анатоля КЛЕЩУКА

УСЕ мы ведаем, якая гэта няўдзячная справа — усялякія прагнозы і прадказанні, датычацца яны надвор'я або вынікаў спартыўных спаборніцтваў. Менавіта таму, здаецца, беларусы выпрацавалі сваю ўласную тактыку — загадзя ставіцца да падзей так, быццам нічога добрага не чакаюць; а потым, калі што, можна будзе і прыемна расчаравацца...

Зрэшты, гэты метад выкарыстоўваюць не ўсе. Напрыклад, трыумфатар леташняга конкурсу «Еўрабачанне», нарвежац беларускага паходжання Аляксандр Рыбак, у дачыненні да сёлетніх беларускіх канкурсантаў, гурта «3+2», настроены вельмі аптымістычна, і не хавае гэтага:

— Мне вельмі падабаецца гэты гурт. Дарэчы, я раней ніколі не чуў беларускіх артыстаў, якія так добра спяваюць па-англійску, у іх выдатнае вымаўленне. Ну і сама мелодыя падабаецца — правільна, што песню памянялі. Гэта рашэнне прымалі арганізатары адбору? Малайцы! Песня «Butterflies» куды лепшая за першую. Толькі не трэба псаваць яе спецэфектамі, яна і сама па сабе вельмі насычаная энергетыкай. Шчыра кажучы, я вельмі здзіўлюся, калі беларускі гурт з ёй не трапіць у фінал. Беларусь сёлета ў мяне ў тройцы лідараў. Акрамя яе, падабаюцца «ўгарная» песня Германіі — думаю, гэта будзе ваш асноўны канкурэнт, — ну і Нарвегія, безумоўна. Мы сябруем з нарвежскім прадстаўніком Дзідрыкам, хоць ён вельмі не падобны да мяне, але гэта і добра: напрыклад, ён не баіцца казаць, што ён самы лепшы спявак у Нарвегіі... Словам, вось мае асноўныя фаварыты. Хоць сёлета канкурсантам будзе, безумоўна, вельмі цяжка нават прабіцца ў фінал — многа прыгожых балад і моцных выканаўцаў.

Дарэчы, Саша Рыбак разам з бацькамі 20 мая наведаў беларускую вечарынку, і там ужо асабіста выказаў кампліменты нашым удзельнікам. «Віншую з тым, што вы прадстаўляеце музычную культуру Беларусі на «Еўрабачанні», — выдаў пераможца леташняга конкурсу, і толькі потым, спахапіўшыся, дадаў удзельнікам гурта Алене Карповіч і Арцёму Міхаленку: «Ну і з тым, што вы жэніцеся!».

Сам Рыбак прызнаецца, што «Еўрабачанне», колькі б ні называлі яго пагардліва «шоу для хатніх гаспадынь», адыгрывае важную ролю ў жыцці — асабіста яму перамога ў конкурсе дала добры кар'ерны штуршок, дазволіла нарэшце сабраць для гастроляў уласны ансамбль — 4 хлопцы і 3 дзяўчыны-скрыпачкі; а на прыбыткі ад канцэртаў і продажу альбома спявак набыў сабе вялізную кватэру ў Осла. А сакрэт перамогі, паводле Рыбака, вельмі просты: «Усё атрымаецца, калі артыст ведае і ўсведамляе, дзеля чаго ён выходзіць на конкурсную сцэну. Прычым гэта пытанне трэба сабе задаваць за некалькі месяцаў, а не тады, калі шоу ужо адбываецца».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

«ШАНЦЫ ЁСЦЬ. Не падвялі б эмоцыі...»

Аляксандр Ціхановіч:

НАРОДНЫ артыст Беларусі, былы кіраўнік тэлевізійна-музычнага праекта «ЕўраФэст» (у фармаце якога ў нашай краіне адбываўся адбор на «Еўрабачанне» з 2006 па 2009 год), прызнаўся «Звяздзе», што за сёлетнім конкурсам не тое каб асабліва сочыць, але збольшага сітуацыю ведае. Прагнозы ж па звычцы робіць узважаныя:



— Я скажу так: шанцы ў нас ёсць, як заўжды. Нават, пэўна, большыя, чым калісьці раней. Бо ў нас вельмі ўдалы паўфінал — акружэнне простае, у ім даволі многа «слабых» песень, да таго ж нам пашанцавала з жараб'ёўкай — перадапошні нумар... Аднак у любым конкурсе, як і ў спартыўных спаборніцтвах, не ўсё залежыць ад удзельнікаў, вялікую ролю адыгрывае звычайнае шанцаванне. Бо прагназаваць загадзя можна што заўгодна, а выканаўцы нашы ўсё-такі маладыя, вопыту малавата, таму вельмі важна, каб падчас выступлення іх не падвялі эмоцыі. Памятаю, як у 2007 годзе, калі я выйшаў з каментатарскай кабіны і зазірнуў у «грын-рум», дзе чакаў абвяшчэння вынікаў наш Дзіма Калдун — проста куляй вылецеў адтуль, настолькі адчувалася напружанасць, наэлектрызаванасць атмасферы! Хваляванне ўсё адно будзе, ад гэтага нікуды не падзецца — але трэба накіраваць яго ў патрэбнае рэчышча, зразумець, што ў гэты момант за тваёй спінай краіна, што цябе бачыць практычна ўся Еўропа — сабрацца і выкласціся на 100 працэнтаў!

Радуе мяне тое, што нашы ідэі — тых, хто рыхтаваў беларускіх канкурсантаў у мінулы, пазамінулы і ранейшыя разы — не зніклі дарэмна. Бо, па вялікім рахунку, сёлета многае зроблена па ранейшых узорах: гэта датычыцца і выбару песні, звароту да моцнага расійскага прадзюсара, і камплектацыі прома-прадукцыі. Калі ўсё гэта дасць добры вынік, галоўнае для сёлетніх арганізатараў — не цягнуць коўдру на сябе, а ўлічваць, што гэта агульная заслуга. Выканаўцам жа і я, і ўся тая каманда, што займалася конкурсам раней, шчыра зычым удачы і поспеху. Ужо выхад у фінал будзе перамогай. Так што буду глядзець конкурс і буду ганарыцца беларускім калектывам, калі ўсё складзецца ўдала для нашай краіны.

«Тэатр — не месца для гістарычных лекцый»

Лічыць Андрэй КУРЭЙЧЫК, драматург:

1. — Гісторыя — гэта няскончаная форма ведаў, бо мы ўвесь час гэтыя веды ўдасканальваем, адкрываецца нешта новае, нават даследчыкам гісторыі. Але мастацтва не займаецца гісторыяй як такой, нават калі за аснову бяруцца нейкія гістарычныя калізіі. Мастацтва — гэта самавыяўленне творцы і люстэрка для грамадства, а для гэтага могуць быць выкарыстаныя любыя сродкі: гісторыя, сучаснасць, вымысел і гэтак далей. Шэкспір, які напісаў пра Антонія і Клеапатру ці Юлія Цэзара, напэўна, займаўся не гістарычнымі даследаваннямі, а драматургіяй, думаў, як перадаць сутыкненне чалавечых характараў.

Я лічу, што да гісторыі трэба ставіцца паважліва. Яе трэба вывучаць у школах, трэба пісаць гісторыяграфічныя працы, даследаванні. Але ў «Пане Каханку» мы не мелі на мэце аднавіць на сцэне рэальную гісторыю — гэта наўрад ці магчыма ўвогуле. Мы ж праз гістарычны антураж хацелі паказаць сучасным беларусам іх самых. Бо тэатр стварае мастацкія вобразы, раскрывае чалавечую псіхалогію, адлюстроўвае грамадскія працэсы, разважае пра іх. Дзеля гэтага тэатр існуе.

— У сусветным мастацтве вельмі шмат прыкладаў гістарычных містыфікацый, калі рэальныя асобы станавіліся героямі ў розумах народаў, сімваламі эпохі, краіны...

— Гамлет, прынц Дацкі, таксама быў рэальным, мы ведаем, што сапраўды існуе замак Эльсінор. Але Шэкспір зрабіў так, што ў п'есе да героя прыходзіць прывід — яўны вымысел. Ну давайце Шэкспіра абвінавацім ў гістарычнай недасканаласці. А яшчэ ў ягоных «гістарычных» п'есах героі вершамі размаўляюць! Як жа так? Сапраўдныя людзі так не размаўляюць! Шэкспір, з пункту гледжання маіх крытыкаў, вельмі дрэнны драматург.

— У Беларусі ваш падыход да гісторыі Караля Радзівіла выклікаў безліч спрэчак. Як вы лічыце, чаму?

— Людзям не падабаецца, калі разбураюць іх стэрэатыпнае, закасцянелае, рэтраградное мысленне. Яны змагаюцца не за гісторыю, а за ўласныя стэрэатыпы. Мяне абвінавацілі, што я зрабіў Радзівілаў п'янтосамі і шутамі. Але не сэксуальнымі вар'ятамі, як выставіў іх у сваёй рэцэнзіі Глеб Лабадзенка. Ён сцвярджае, што Пане Каханку мастурбіраваў перад гледачамі. Вы сабе гэта ўяўляеце? Гэтым выказваецца павага да Радзівілаў?! Вось ад чаго Пане Каханку дакладна перакруціўся ў труне.

2. — У падручніках гісторыі трэба шукаць гістарычную праўду. Якую гістарычную праўду, напрыклад, можна знайсці ў Булгакава, які распавёў гісторыю Ешуа і Понція Пілата? У Горына ў «Мюнхгаўзене», нават у Пушкіна ў «Моцарт і Сальеры». Аднак яны чапляюць менавіта сваім аўтарскім падыхо-

танне рубам: «Талент ці забойца?». Вось доказ таму, што мастак сапраўды можа паўплываць на адносіны да гісторыі і выдатных асобаў.

Але гэта вельмі спрэчнае пытанне, тут не можа быць адназначнага рашэння. Вельмі цяжка аднавіць абсалютна да дэталяў, як усё было насамрэч у Радзівілаў. Так, яны недзе былі легкадумныя, недзе распускаліся, але ж яны і калекцыянавалі мастацтва, ствараліі культуру. Уршуля Радзівіл была звязаная з тэатрам. Мацей — з музыкай. Антоній сказаў сваё слова ў культуры.

Мне здаецца, ёсць яўная нацяжка ў тым, што п'еса ўсё-такі недасканаллая, аўтар быў не вельмі пераканаўчы. Гэтую п'есу рэжысёр і сцэнограф (яго заслуга вялікая) ператварылі ў мастацкі твор, удасканалілі. Магчыма, нехта не чуў пра самога Пане Каханку, не ведае пра яго — той будзе ўспрымаць яго тэатральную гісторыю як любую выдуманую.

3. — Я лічу, што карысць у тым, што прыцягваецца ўвага да нейкай з'явы. Напрыклад, калі выйшаў серыял паводле «Ідыёта» — людзі кінуліся чытаць Дастаеўскага. Выйшла экранізацыя «Майстра і Маргарыты» Булгакава — пацягнуліся да кніжак. Гэта пашырае кругагляд, пашырае і культурную прастору.

Я ў свой час прад'яўляла прэтэнзіі Дудараву наконт «Чорнай панны Нясвіжа». Пісала шмат наконт таго, што ён надта засяродзіўся на каханні, і з-за таго, што ўсё падпарадкаваў гэтай ідэі, былі моцна скажоныя факты аб той жа Барбары Радзівіл. Бо яна не была ні такой, як у п'есе, наіўнай, ні святой, а наадварот мела дрэнную жаночую рэпутацыю. Аднак прайшло шмат гадоў, а гэтыя спектаклі ідуць на «ўра», што ў тэатры Купалы, што ў тэатры імя Коласа, у іншых. Значыць, яны запатрабаваныя людзьмі, якія, магчыма, шукаюць у тэатры не толькі ведаў, але і атрымліваюць штосьці для сябе чыста па-чалавечы. Дык чаму б не прыцягнуць праз яго цікавасць да рэальных асобаў? Людзі, магчыма, сталі разбірацца, хто Радзівіл Руды, хто Чорны. Пацікавіліся, што зрабіў Жыгімонт... Гістарычныя фігуры самі па сабе прыцягваюць, нібыта зоркі.

У спектаклі «Пане Каханку» наша ўяўленне пра той час і яго герояў значна змешчана. Нікуды ад гэтага не падзенешся. Але як да гэтага ставіцца? Няўжо забараняць?.. Мне здаецца, значна горшы вынік бывае, калі нам паказваюць сапраўды нейкую пошласць. Калі з экрана ідзе пустая камедыя. Вось у такіх выпадках бывае крыўдна — ад гэтага густы пагаршаюцца. А ў выпадку са спектаклем «Пане Каханку» нават сама спрэчка, рэзананс, які ён нарадзіў, ужо карысны.

дам. Мы альбо прымаем яго, альбо не. Так і з маёй п'есай. Калі чалавек прыйшоў глядзець падручнік гісторыі ці ўласныя аб ёй стэрэатыпы, то ён не туды патрапіў. Тэатр — не месца для гістарычных лекцый.

Тэатр звяртаецца да эмоцыі гледача. Ён павінен стварыць у гледача адчуванне нейкага трапятання ад жыцця, якое разварочваецца на сцэне. Станіслаўскі казаў пра тэатр: «Жыццё чалавечага духу на сцэне». Мы гэта і імкнуліся зрабіць. «Пане Каханку» — гэта мая мара пра сапраўднага беларуса. Чалавек адмаўляецца ад супрацоўніцтва з нягоднікам, хоць нягоднік займае вышэйшае становішча.

— У ваш адрас гучалі папрокі, што героі на сцэне размаўляюць сучаснай мовай.

— Тыя людзі, якія чакаюць ад сучаснага тэатра старадаўняй мовы, старадаўніх касцюмаў — гэта людзі, якія на стагоддзі адсталі ад сучаснай тэатральнай культуры. Бо гэта пра тэатр, які даўно сышоў — у Маскве ён сышоў, у Еўропе, у Амерыцы. Ужо Шэкспіра ці Пушкіна ставіць касцюміравана — гэта дрэнны густ і пошласць. На жаль нашы крытыкі засталіся ў тэатры сацрэалізму і маюць вельмі дрэнны густ. Хай пабачаць спектаклі Някрошуса, Любімава, Донелана. У Любімава Гамлет пад гітару пеў у сучасным касцюме, і што? А ў Пікаса людзі з кубоў намаляваныя, і што? Давайце забаронім нерэалістычнае мастацтва!?

3. — Яны не столькі пра гістарычных перканажаў, колькі пра сучасных людзей, бо на іх накіраваныя. Для мяне асабіста гэта так. Для мяне барон Мюнхгаўзен Захарава — гэта сучасны чалавек, які расказваў пра сучаснае грамадства, а не пра Германію XVIII стагоддзя. Нас не датычыцца ўжо — было яно так, ці было па-іншаму. У мастацтве, якое ствараецца цяпер, хвалюе толькі сучасны нерв. І гэты сучасны нерв можна ўскрываць рознымі спосабамі. Таму любая сённяшняя пастаноўка, любая п'еса (пра што б яна ні пісалася) — гэта люстэрка сучаснага грамадства. Гэта меркаванне сучасных мастакоў — рэжысёра, сцэнографа, драматурга, акцёраў. Гэта пра тое, што баліць зараз, а не два стагоддзі таму.

А калі казаць, што даюць такія творы людзям, у тым ліку і спрэчныя — магчыма, жаданне вывучыць тую ж гісторыю. Даведацца пра яе герояў. Паразважаць пра іх. Магчыма, прыняць, паважаць іх. Бо мець сваіх герояў павінен кожны народ. Мастацтва падштурхоўвае звярнуцца да гісторыі сваёй краіны, зразумець, што гэтая краіна была. І чым яна з'яўляецца сёння.

— Ці будзеце вы яшчэ звяртацца да гісторыі?

— Я ўвесь час звяртаюся да гісторыі — у мяне ёсць «П'емонцкі звер», п'еса «Скарына», якая таксама пра сённяшні час, хоць і паказвае XVI стагоддзе. Я пішу толькі пра сябе і пра сучаснае беларускае грамадства.

Магчымасць гіпатэтычнага погляду на гісторыю

Пакідае Пятро ВАСЮЧЭНКА, пісьменнік і літаратуразнаўца, які ў тым ліку даследуе міфы.

1. — Павінны быць міфы, павінна быць дакладная белетрызацыя гісторыі — адно другому не перашкаджае. Без палёту думкі, без палёту фантазіі не можа існаваць сапраўдная гістарычная навука, у якой самыя смелыя гіпотэзы часам спраўджваюцца. Як, напрыклад, была адкрытая рэальная Троя, альбо Крыцкі лабірынт. З іншага боку, патрэбныя і мастацкія рэчы, якія ў дакладных формах аднаўляюць атмасферу часу.

— Які прастор фантазіі можна дазволіць аўтару?

— Гэта залежыць ад устаноўкі аўтараў. Калі аўтары загадзя мяркуюць ствараць фантазію на тэму гісторыі, яны яе і ствараюць. У такім выпадку мы не можам ад іх патрабаваць дакументальнай дакладнасці. Калі аўтары збіраюцца аднавіць дакладна атмасферу таго часу, не трэба забывацца ні на што. Ні на тое, што запалак у той час не было, ні на іншыя дробязі. Мяркую, што ў тым выпадку была аддадзена перавага фантазіі. Але Пане Каханку вярнуўся ў наш літаратурна-мастацкі ўжытак. Гэта значыць толькі адно: мы чакаем новых твораў, якія паказваюць гэтага складанага персанажа, пра якога я прачытаў між іншым навуковы даклад на канферэнцыі ў Жодзіне. Інакш кажучы, у беларускім мастацкім кантэксце гэты вобраз толькі пачынае разгортвацца. І могуць існаваць розныя яго версіі.

2. — Мастацкая практыка дапускае вольнае абыходжанне з гістарычнымі постацямі. Настолькі вольнае, што не снілася нашаму дастаткова традыцыйнаму мастацтву. Але ў мастацкай літаратуры павінна быць усё: і рэалістычныя версіі гістарычных персанажаў, і стварэнне арэолу, міфа пра яго, хоць міф таксама павінен грунтавацца на нейкай гістарычнай праўдзе. Зразумела, калі б я пісаў сваю версію «Пане Каханку», то напісаў бы яе інакш.

— У беларускай літаратуры былі раней вялікія аўтары, якія працавалі на стварэнне міфу. Але гэта не выклікала абурэння, Караткевічу, напрыклад, даравалі шмат што...

— Караткевіч таксама дастаткова вольна абыходзіўся з гістарычнымі фактамі, але ён перадаваў дух эпохі, дух часу, не звяртаў увагі на дробязі. Янка Брыль наракаў на тое, што некалі рабіў заўвагі адносна дэталяў, анахранізмаў у яго творах. А ён толькі смяяўся, нічога не перапраўляў. Гісторыю нашу ён паказваў не столькі ў рэалістычным, колькі ў рамантычным плане. Але, безумоўна, дэталёва вывучаў час, яго атрыбуты і гэтак далей. А што датычыцца сённяшняга часу, каб нешта падобнае існавала, трэба маштаб творцы. Караткевіч адзін можа на паўстагоддзя. Ёсць пісьменнікі, якія ў розных формах адлюстроўваюць гісторыю, адны ў форме містыфікацыі, другія спрабуюць рэалістычна яе адлюстраваць, як Леанід Дайнека. Трэція ідуць шляхам Караткевіча, гісторыю рамантызуюць. Іншыя белетрызуюць. А творца, які ўсё жыццё прысвяціў бы гістарычнай прозе, гістарычнай драматургі, яшчэ павінен вырасці.

— Ці здолеў змяніць грамадства Караткевіч?

— Караткевіч цэлае пакаленне беларусаў абярнуў у бок цікавасці да беларускай гісторыі, беларускага слова. З гэтым ён справіўся. Што датычыцца працы з гістарычным матэрыялам: нават містыфікацыі павінны тварыцца пасля таго, як аўтар дасканала вывучае дэталі часу, яны бяруцца з дакументаў, а не з галавы. Фантазіі і міфы вырастаюць на глебе рэальных фактаў.

— Апошнім часам да нас прыйшла гісторыя больш дасканалая, чым паказана ў творах Караткевіча. І чалавек у нейкім сэнсе апынуўся на раздарожжы: каму верыць, ці звяртацца тады да літаратуры?

— Мы жывём у XXI стагоддзі, у крыху іншых варунках. Патрабаваць ад літаратуры большага, чым яна можа даць, немагчыма ў гэтых умовах. Альбо павінна прыйсці постаць, у маштабе таленту роўная Караткевічу.

3. — Грамадству гэта дае ўпэўненасць у сабе, у сваёй гістарычнай тоеснасці. Гэта дае палёт фантазіі. Гэта рухае да гістарычнага пошуку. Міфы, створаныя на аснове рэальнасці, часам спраўджваюцца. Гэта дае магчымасць гіпатэтычнага погляду на гісторыю.

БЕЛАРУСКА СТАЛА ТРЭЦ

МАГІЯ ЗОРАК

Апошнім часам усе проста памяшаліся на гараскопах. Кітайскія, японскія, цібецкія, зараастрыйскія, задыякальныя... Гараскопы друідаў, кветкавыя, фінансавыя, медыцынскія, дзіцячыя гараскопы, гараскопы кулінарныя... І, нарэшце, любоўныя гараскопы, эратычныя, гараскопы на сэксуальную сумяшчальнасць. Адна мая сяброўка, нарыклад, і кроку не зробіць на ніве кахання, не параіўшыся папярэдне з якім-небудзь віртуальным астролагам. Першае пытанне, якое яна задае ўпадабанаму мужчыну, апынуўшыся з ім адзін-на адзін — хто ён па знаку Задыяка? І пакуль той, не адчуваючы ніякага падвоху, выкладвае ёй усю праўду пра год, месяц, дзень і нават час свайго нараджэння, у яе галаве ўжо вымалёўваецца ўвесь «вектар», ці лепш сказаць, «крывая» іх будучых узаемаадносінаў. Дапусцім, ён паведамляе, што нарадзіўся 10 студзеня. «Ага, — думае яна, — значыць, гэта Казярог». Далей уключае свой унутраны калькулятар і падбівае плюсы і мінусы. «Казярогі — людзі кансерватыўныя і прыземленыя, але разам з тым, надзвычай патрабавальныя... Мужчыну-Казярогу патрэбная сапраўдная прынцэса, але паколькі прынцэсы сустракаюцца не на кожным кроку, то Казярогі заўсёды знаходзяцца ў пошуку... Казярог звычайна прамалінейны і не церпіць пустой балбатні. Затое падчас дрэннага настрою яго хлебам не кармі, а дай паздзекавацца з якіх-небудзь агульнапрынятых маральных нормаў. Завязваючы стасункі з такім мужчынам, неабходна захоўваць вялікую асцярожнасць — дастаткова адзінай памылкі, і ён развітаецца з вамі без ваганняў...».

«Не-не, — думае мая сяброўка. — Прыземленыя і асцярожныя кансерватары, ды яшчэ з такімі прэтэнзіямі — дакладна не мой варыянт. У мяне і сваіх прэтэнзій гаць гаці». І чакае. Вось ужо пятнаццаць гадоў, з таго самага моманту, як развіталася з мужам — Вадалеем. У свой час іх аб'ядноўвала бурная страсць, але кіпень выпарыўся, і яны вельмі хутка надакучылі адно аднаму. Цяпер яна «ўкручвае мазгі» ўсім сваім знаёмым — каб не паўтаралі яе памылак і будавалі адносіны выключна «па навуцы».

Увечары, перарабіўшы хатнія справы, набіраю яе нумар.

— Кацярына, не спіш? — пытаюся. — І я не сплю. І ўжо не першую ноч... Быццам бы ўсё добра, але чагосьці не хапае... Словам, асабістае не клеіцца...

— Ты што, пасварылася з мужам?

— Не пасварылася.

— Ён з табой не размаўляе?

— У тым і рэч, што размаўляе. Але не чуе...

— У яго праблемы са слыхам?

— У яго праблемы са зрокам — ён мяне не заўважае. І з пачуццём гумару, і ўвогуле...

— Ну што ж, будзем лячыць! — ажыўляецца сяброўка.

— Каго? — насцярожваюся я.

— Зразумела, цябе. З заўтрашняга дня ты пачнеш будаваць стасункі з Дзімам выключна па навуцы, дакладна выконваючы рэкамендацыі астролагаў. Крок улева, крок управа прыраўноўваюцца да ўцёкаў. Зразумела? Тады запісвай адрас сайта.

І навошта толькі я ёй тэлефанавала? Магла ж здагадацца, чым скончыцца размова... Раздражнёна кідаю трубку і кладуся спаць. Прачынаюся рана, цягнуся на кухню — гатаваць сняданак. Камп'ютар прынцыпова ігнарую. Але праходзіць хвілін пятнаццаць, і цікаўнасць бярэ верх над голасам розуму. Уключаю камп'ютар, заходжу на азначаны сайт, адкрываю старонку пад назвай «Каханне паводле астралогіі», чытаю: *«Ідэальны дзень для таго, каб прадэманстраваць каханаму глыбіню сваіх пачуццяў. Праявіце кемлівасць, здзівіце яго, прыдумайце што-небудзь арыгінальнае. Апошнім часам вашы адносіны азмрочваюць сваркі — зрабіце ўсё дзеля таго, каб памірыцца»*.

Які пасаж!.. Некалькі дзён таму мая «палова» і сапраўды прыцягнулася дадому далёка за поўнач (дакладней, пад раніцу), патлумачыўшы, што ў іх інстытуце праводзілі конкурс прыгажосці, а яго загадам кіраўніцтва прызначылі членам журы. Прыйшлося, маўляў, адбываць мерапрыемства да канца. Як жанчына выхаваная, я не стала распачынаць сварку. Пацікавілася толькі, каго прызначылі мозгам журы. Ён пакрыўдзіўся не на жарт, і вось ужо некалькі дзён запар мы паказальна не размаўлялі адно з адным, не жадаючы ісці на кампраміс і дамаўляцца.

І пасля гэтага я павінна дэманстраваць яму глыбіню сваіх пачуццяў?.. А з іншага боку, на што толькі ні пойдзеш дзеля эксперыменту...

Набіраю нумар яго мабільнага — аператар паведамляе, што «абанент часова недаступны». Тэлефаную на працу. Трубку бярэ сакратарка і гучным шэптам просіць не турбаваць Дзмітрыя Пятровіча, таму што ў яго важнае пасяджэнне.

— А гэта вас з гарадской пракуратуры турбуюць, — «уключаю» голас салідная дзелавой дамы. — Дзмітрый Пятровіч патрэбны нам па неадкладнай справе.

Праз дзесяць секундаў ён бярэ трубку. Па голасе чуваць — хвалюецца... Імгненна «пераключаю» голас на Брыджыт Бардо (а можа, Мэрылін Манро), гэткую спакусніцу без тармазоў:

— Мілы, табе не надакучыла гуляць у маўчанку?.. Я даўно хацела табе сказаць, што мой ложак занадта вялікі для мяне адной. У колькі ты сёння вернешся, мой любы?

На другім канцы праводу — працяглая паўза. Потым — кароткія гудкі... Праз паўхвіліны ён тэлефануе мне на мабільны, і як бы між іншым, здалёк, цікавіцца, дзе я знаходжуся, што раблю, які ў мяне настрой і да т.п. Карацей кажучы, паводзіць сябе так, быццам ніякіх захадаў з майго боку не было.

— Дык што ты там гаварыла пра халодны ложак? — нарэшце наважваецца ўдакладніць ён.

— Ну, вядома ж, гаварыла, — пагаджаюся я. — Гаварыла, што гэты двухспальны «палігон», куплены табой яшчэ напярэдадні вяселля, даўно ўжо трэба было памяняць на нешта больш кампактнае, напрыклад, на якую-небудзь раскладную канапу.

Ён цэлую хвіліну абдумвае мой адказ, але так і не знаходзіць патрэбных слоў.

...Раніцай наступнага дня я зноў заходжу на старонку ўжо знаёмага сайта, позначаную фрывольным сардэчкам. *«Блізкі чалавек мае патрэбу ў вашай пастаяннай увазе. Сёння можаце смела хваліць яго нават за нязначныя ўчынкі, дзякаваць, гаварыць кампліменты»*.

Ну, няхай будзе па-вашаму, кампліменты дык кампліменты. Ледзь дачакаўшыся абедзеннага перапынку, пачынаю вызвоньваць сваю «палову». Ён адказвае адразу, але голас нас-

цярожаны...

— Прывітанне, мілы, гэта зноў я, — паведамляю ўрачыстым тонам. — Нічога не здарылася, проста хачу падзякаваць табе за ўсё добрае. Па-першае, за тое, што раніцай ты не пакінуў мне кавы — тая, у бляшанцы, была апошняй... Па-другое, ты зноў скарыстаўся маёй зубной шчоткай, за што асобны дзякуй. Па-трэцяе, ты забыўся зачыніць у пакоі фортку, і Барсік выскачыў праз акно на двор. Мне прыйшлося з паўгадзіны шукаць яго пад праліўным дажджом... І яшчэ. Табе вельмі да твару блакітная кашуля, падараная, як ты сказаў, тваёй мамай. Хоць мама, як высветлілася, пра гэты падарунак не здагадваецца...

Я, зразумела, магла б сказаць і больш. Але, як кажуць, добранькага патрошкі... Увечары ён прыйшоў дадому раней чым звычайна, прынёс дзве бляшанкі кавы і дзве новыя зубныя шчоткі. Сказаў, што абдумаў маю прапанову наконт пакупкі канапы і не мае нічога супраць... Шчыра кажучы, я была ўражаная — не столькі яго паводзінамі, колькі ўзроўнем прафесіяналізму складальнікаў астрапрагнозу. Патэлефанавала сяброўцы, падзякавала за каштоўную параду. Яна падбадзёрыла: маўляў, яшчэ не тое будзе, толькі не збочвай, не адхіляйся ад узятага курса, і вынікі не прымусяць сябе чакаць.

Яны і не прымусілі. *«Падарыце яму шчырую ўсмешку!* — Літары на экране зіхацелі і адліваліся золатам, нібыта падмаргвалі. — *Скажыце аб тым, што каханне — гэта галоўнае ў вашых адносінах, а ўсё астатняе — проста часовыя непаразуменні, на якія не варта звяртаць увагу!»*.

Натуральна, такое прызнанне нельга было рабіць па тэлефоне... Я адпрасілася з працы, купіла па дарозе дадому дарагое віно, прыгатавала святочную вячэру, накрыла стол новым абрусам, паставіла прыгожы посуд і стала чакаць.

Ён прыйшоў позна, чымсьці расстроены і ўзрушаны. Я выйшла з залы ў кароткім халаціку леапардавай афарбоўкі і, не адхіляючыся ад інструкцыі, падарыла яму такую шчырую ўсмешку, на якую толькі была здольная. Потым узяла яго за руку і ўжо адкрыла рот, каб абязброіць фразай наконт першаснасці кахання і другаснасці часовых непаразуменняў... Але ён нечакана бухнуўся на калені і сказаў, што не варты такой жанчыны, як я — чулай, далікатнай, высакародная і г.д. і да т.п. І папрасіў адпусціць яго ...да віцэ-міс інстытуцкага конкурсу прыгажосці, побач з якою ён не адчувае сябе такой пачварай...

Я не ведала, што трэба рабіць у азначанай сітуацыі — віртуальныя астролагі не далі з гэтай нагоды ніякіх рэкамендацый. І таму адпусціла яго... А назаўтра па старой звычцы зноў зазірнула на сайт.

«Выпрабаванні выпадаюць на долю кожнага чалавека, — бясстрасна суцяшаў мяне нябачны суразмоўца. *— Цяпер надышла ваша чарга. Не падайце духам, не страчвайце веру ў лепшае. Памятайце, што пачуцці, загартаваныя выпрабаваннямі, робяцца больш моцнымі і трывалымі»*.

Ну трэба ж!.. І адкуль толькі яны маглі пра гэта ведаць?..

Наталля УЛАДЗІМІРАВА.

ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «ПАДПІШЫСЯ НА «ЗВЯЗДУ»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Падпішыся на «Звязду» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 22 мая па 30 верасня 2010 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на трэці квартал або другое паўгоддзе 2010 года.

2. Арганізатар Гульні — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» (далей — Арганізатар), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — установы «Рэдакцыя газеты «Звязда» і складаецца з наступных рэчаў:

№ п/п	Назва	Колькасць (шт.)	Цана за шт. з ПДВ (руб.)	Усяго з ПДВ (руб.)
1.	Электраправ SCARLETT SC-1130 S Green	7	53 280	372 960
2.	Кухонны камбайн Белвар КЭМ-36/220-4-26, РБ	7	154 310	1 080 170
3.	Тэлевізар «Віцязь» 54 CTV 760-7, г. Віцебск	7	337 300	2 361 100
4.	Мікрахвалевая печ Daewoo KOR-4125 A	1	203 544	203 544

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» складае 4 017 774 (Чатыры мільёны семнаццаць тысяч семсот семдзесят чатыры) беларускія рублі.

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Падпішыся на «Звязду» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на трэці квартал або другое паўгоддзе 2010 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на трэці квартал або другое паўгоддзе 2010 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Рэдакцыі ў перыяд падпісной кампаніі на трэці квартал або другое паўгоддзе 2010 года выразаная з газеты запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая друкуецца ў газеце «Звязда» да двух разоў на тыдзень у перыяд з 22 мая па 26 чэрвеня 2010 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або якія паступілі ў рэдакцыю пасля 2 ліпеня 2010 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні Арганізатар стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» (далей — Камісія) у наступным складзе:

Здановіч Уладзімір Аляксандравіч — намеснік галоўнага рэдактара ўстановы «Рэдакцыя газеты «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — намеснік начальніка ўпраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Доўнар Валянціна Аркадзьеўна — загадчык аддзела пісьмаў установы «Рэдакцыя газеты «Звязда»;

Дабравольскі Анатоль Васільевіч — вядучы рэдактар тэхнічны ўстановы «Рэдакцыя газеты «Звязда»;

Дзевойна Алена Уладзіміраўна — рэдактар юрыдычнага аддзела ўстановы «Рэдакцыя газеты «Звязда».

10. Камісія кіруецца ў сваёй дзейнасці рэгламентам (раздзел V гэтых Правілаў).

11. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

V. РЭГЛАМЕНТ РАБОТЫ КАМІСІІ

12. Камісія ажыццяўляе кантроль за захаваннем вызначаных правілаў правядзення рэкламнай гульні, вызначае пераможцаў Гульні, якія выйгралі прыз, разглядае скаргі і спрэчныя пытанні, якія ўзнікаюць у ходзе правядзення Гульні.

13. Пасяджэнні Камісіі вядзе старшыня. Пасяджэнні Камісіі з'яўляюцца правамоцнымі пры наяўнасці большасці членаў з яе зарэгістраванага складу.

14. Члены Камісіі абавязаны: прымаць удзел у пасяджэннях Камісіі, забяспечваць у ходзе Гульні адпаведнасць парадку яе правядзення гэтым Правілам, вызначыць пераможцаў Гульні, якія выйгралі прызы, прымаць удзел у разглядзе скаргаў удзельнікаў пры іх наяўнасці, падпісваць пратаколы пасяджэнняў Камісіі.

15. На пасяджэнне Камісіі ў якасці назіральнікаў без права галасавання могуць запрашацца ўдзельнікі Гульні, прадстаўнікі незалежных арганізацый.

16. Усе рашэнні Камісіяй прымаюцца шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў старшыні і членаў Камісіі, якія прысутнічалі на пасяджэнні. У выпадку роўнасці галасоў «за» і «супраць» голас старшыні Камісіі з'яўляецца вырашальным.

17. Рашэнні Камісіі афармляюцца пратаколам, які падпісваецца ўсімі прысутнымі на пасяджэнні членамі Камісіі.

VI. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ

18. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 6 ліпеня 2010 года ў 12 гадзін у памяшканні Арганізатара Гульні па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

19. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

20. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца па адным электрапрасе, кухонным камбайне і тэлевізары.

У сувязі з тым, што Мінская вобласць стабільна забяспечвае найвялікшую колькасць падпісчыкаў, для гэтага рэгіёна дадаткова разыгрываецца адна мікрахвалевая печ.

21. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні або прадстаўнікоў незалежных арганізацый. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

22. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 16 ліпеня 2010 года ўключна ў газеце «Звязда».

Арганізатар у тэрмін да 16 ліпеня 2010 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

VII. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

23. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал або другое паўгоддзе 2010 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал або другое паўгоддзе 2010 года.

24. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал або другое паўгоддзе 2010 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

25. Тэлевізары і мікрахвалевую печ дастаўляе і ўручае пераможцам Арганізатар Гульні ў тэрмін да 30 верасня 2010 года ўключна з папярэднім паведамленнем аб канкрэтнай даце праз публікацыі ў газеце «Звязда».

26. Астатнія прызы выдаюцца пераможцам у тэрмін да 30 верасня 2010 года ў памяшканні Рэдакцыі па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, за выключэннем выхадных і святочных дзён. Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў за атрыманнем прыза, Арганізатар не аплачвае.

Па просьбе пераможцаў гэтыя прызы могуць быць дастаўлены ім, калі яны пражываюць у мясцовасці, блізка размешчанай ад месца жыхарства пераможцаў, што выйгралі тэлевізар або мікрахвалевую печ.

27. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

28. Пасля 30 верасня 2010 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VIII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

29. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

30. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, фотаздымкі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Арганізатарам Гульні ў любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць Арганізатару Гульні.

31. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» да пачатку рэкламнай гульні апублікоўваюцца сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

32. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 287 19 68.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі Правілаў правядзення рэкламнай гульні № 1694 ад 13.05.2010 г., выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

ЛЕПШЫХ ПАШТАЛЬЁНАЎ І РАБОТНІКАЎ «САЮЗДРУКУ» ЧАКАЮЦЬ ПРЫЗЫ!

Рэдакцыя газеты «Звязда» ў чарговы раз праводзіць конкурс «Прыз — рупліваму паштальёну» на лепшую арганізацыю падпіскі на газету «Звязда».

Умовы конкурсу тыя ж, што і раней — прызамі будуць узнагароджаны па тры лепшыя паштальёны з кожнай вобласці і горада Мінска, у якіх рост колькасці падпісчыкаў на другое паўгоддзе 2010 года (але не менш чым на тры месяцы) склаў не менш за 7 чалавек.

Прызы:

лепшыя паштальёны выйграюць у якасці прыза па адным пыласосе «Віцязь» ПС-107, г. Віцебск, коштам 142 000 рублёў (з улікам ПДВ);

паштальёны, якія занялі другое месца, выйграюць па адным тостары FF-5370 коштам 70 932 рублі (з улікам ПДВ);

паштальёны, якія занялі трэцяе месца, выйграюць па адным электрачайніку FA-5401-2 коштам 65 520 рублёў (з улікам ПДВ).

Розыгрыш прызоў — 10 жніўня 2010 года.

Інфармацыю пра лепшых паштальёнаў чакаем у тэрмін да 6 жніўня 2010 года ад РУП «Белпошта», куды намі накіраваны зацверджаныя Правілы правядзення конкурсу.

Звяздоўскімі прызамі — цеплавентылятарамі FA-5567 коштам за адзінку 83 088 рублёў (з улікам ПДВ) — будуць узнагароджаны таксама па адным лепшым (па выніках рэалізацыі нашай газеты ў першым паўгоддзі 2010 года) кіяскёры або работніку спецыялізаванага гандлёвага пункта РУП «Белсаюздрук», РУП «Брэстаблсаюздрук», РУП «Віцебскаблсаюздрук», РУП «Гомельаблсаюздрук», РУП «Гроднаблсаюздрук», ААТ «Магілёўсаюздрук», РУП «Мінскаблсаюздрук».

Інфармацыю пра лепшых работнікаў чакаем да 6 жніўня 2010 года.

АДЧУЦЬ ДУХ БЕЛАРУСКАГА МЯСТЭЧКА

Настаўніца вясковай школы распрацавала ўнікальны турыстычны маршрут для школьных груп. Журналісты «Звязды» пратэсціравалі яго частку

Мы самі ўзялі на сябе смеласць назваць маршрут унікальным, таму на стопрацэнтную праўдзівасць дадзенага сцвярджэння не прэтэндуем. Але... адна з нас мае вопыт выхавання траіх школьнікаў, кожны з якіх практычна штогод выбіраўся на нейкую экскурсію: Хатынь, Мір — Нясвіж, Дудуткі, Полацк, Белавежская Пушча, Лідскі замак, Бярэзінскі біясферны запаведнік, Вязынка... Сайты турыстычных цэнтраў і тураператараў прапануюць для школьных груп каля паўсотні экскурсій па Беларусі на розную тэматыку — ад ваенна-патрыятычнай да прыродазнаўчай. Аднак ніводны з гэтых маршрутаў не падобны на той, што распрацаваны ў Тальцы. Ды і настаўнікі, якіх мы апыталі, пацвердзілі: пра падобнае для школьнікаў яны не чулі.

У чым жа справа? Напэўна, у збегу абставінаў. Наталля Ільінічч, настаўніца гісторыі Талькаўскай сярэдняй школы, аўтар кнігі «Талька і наваколлі» і кіраўнік школьнага этнаграфічна-краязнаўчага гуртка, два гады рыхтуецца распачаць аграгурыстычную дзейнасць. Яна зарэгістравалася, распрацавала маршрут... Свой дом Наталля перабудоўвае для таго, каб турысты — сям'я альбо невялікая група, чалавек 8-10, — змаглі тут спыніцца, пераначаваць, пэўны час пажыць. На пачатку 2008 года Наталля ўзяла крэдыт для рэканструкцыі свайго дома. Абклала яго сілікатнымі блокамі і павялічыла, прыбудавала мансардны дах (там будзе дзве спальні і камінная зала), веранду з асобным уваходам, ізаляваны гасцявы пакой, закупіла абсталяванне для санвузла, памяняла вокны і дзверы, паставіла лазню... Але крэдытных грошай не хапіла, каб усё закончыць, і Наталля аказалася ў складанай сітуацыі. У недабудаваным доме яна не можа прымаць туристаў. А каб узяць яшчэ адзін мэтавы крэдыт для развіцця аграсядзібы, ёй трэба распачаць турыстычную дзейнасць.

Спачатку Наталля разгубілася, маўляў, дзеля таго і прашу крэдыт, каб усё дарабіць, закупіць веласіпеды, пасцельную бялізну і тады ўжо запрасіць першых гасцей. З гэтай нагоды яна і звярнулася ў «Звязду» (а да гэтага звярталася ў банк, раён, вобласць...). Аднак журналісты, сустрэўшыся з самой Наталляй, а таксама з прадстаўнікамі банка і мясцовых уладаў, прапанавалі гаспадыні... пачаць. І пачаць з тых, каму не патрэбна сядзіба, але каго могуць зацікавіць маршруты. Школьнікі натуральна і лагічна першымі прыйшлі ў галаву. Тым больш што нагамі падлеткаў талькаўскія сцежкі ўжо выпрабаваныя. Неабходнасць у прыёме падобных груп і робіць прапанову талькаўскай настаўніцы ўнікальнай. Вялікія грошы такія экскурсіі не прынясуць, але яны могуць наблізіць ажыўленне аграгурыстычнай дзейнасці ў Тальцы.

Наталля ўпэўненая, што гэта патрэбна не толькі ёй. Хоць і ёй, як настаўніцы вясковай школы, колькасць дзяцей у якой увесь час змяншаецца, вельмі важна мець нейкія перспектывы на будучыню. Вясковы турызм, як вядома, прыносіць дадатковы прыбытак не толькі гаспадару сядзібы, але і яго суседзям, якія прадаюць турыстам свае вырабы і паслугі (мёд, катанне на кані, сувеніры...), наймаюцца ў будаўнікі. Турысты садзейнічаюць ажыўленню ўсёй мясцовасці, бо яны заходзяць у магазін, наведваюць музей, карыстаюцца грамадскім транспартам.

У сваім лісце ў «Звязду» Наталля Валянціна ўпералічыла 10 прычын, чаму аграсядзіба «Талькаўская» павінна быць створаная:

1.Талька — лепшае месца для адпачынку. Тут рэкі Таль, Свіслач, возера Грымячае, прыгожыя сасновыя бары, балоты, поўныя ягад і грыбоў, чыстае паветра, цішыня.

2. Сядзіба будзе спрыяць адраджэнню і развіццю вёскі...

3. Мая дачка, будучы менеджар па турызме, зможа працягнуць маю справу.

4. Увесь час, што я працую ў школе, а гэта 24 гады, мы з фальклорна-краязнаўчым гуртком вучняў ходзім у турпаходы па родным краі, займаемся даследчай працай у архівах і на мясцовасці, вядзём школьны краязнаўчы музей...

5. У 2007 г. у інтэрнэце з'явіўся сайт пра нашу мясцовасць www.talka.info...

7. Асаблівасцю нашай сядзібы стане рэканструкцыя народных святаў — Каляды, Гуканне вясны, Юр'я, Купалле.. .

8. Сядзіба зможа працаваць і з замежнымі турыстамі...

9. У нас цудоўны малады сад, агарод, карова, куры...

10. Беларуская кухня — другая асаблівасць нашай сядзібы...

— Калі наш праект будзе ажыццёўлены, — дадае Наталля, — выйграюць усе. Краіна атрымае яшчэ адну вясковую міні-гасцініцу, у якой за невялікія кошты будуць адпачываць і знаёміцца з мясцовымі традыцыямі і ладам жыцця беларусы і замежныя турысты. Талька атрымае стымул для развіцця, а наша сям'я зможа прымяніць свае ўменні, веды і сілы на добрую справу і гэтым зарабіць сабе на жыццё.

Дарэчы, тое, што Талька — лепшае месца адпачынку, лічыць не адна толькі настаўніца гісторыі. У

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

30-я гады тут летаваў Якуб Колас з сям'ёй, і потым да канца сваіх дзён ён рэгулярна наведваў гэтыя мясціны. Дагэтуль у Тальцы захаваўся дом, у якім жыў паэт з жонкай і сынам. Малодшы сын Міхаіл Канстанцінавіч таксама добра памятае і любіць гэтыя масціны. Колас апеў Тальку і наваколле ў паэме «Міхасёвы прыгоды»:

Талька — слаўная рачушка,
Грунт яе пясчаны,
Бераг мяккі, як падушка,
Дзірваном засланы...

Дарэчы, адна з петляў «зялёнага маршруту» прадугледжвае наведванне мясцін, якія любіў Колас, якія ўвайшлі ў яго вершы: таямнічае возера Грымячае, паляна Ласіныя ямы, мясціны, дзе калісьці стаяла маленькая вёсачка Загібелька, лясная варта.

Але дачнікі ведалі і любілі гэтыя мясціны яшчэ да Коласа. Наталля мае цікавыя ўспаміны пра 20-я гады XX стагоддзя аднаго з жыхароў Талькі. Яшчэ адна пятля маршрута расказвае пра саму Тальку, яе гісторыю, людзей, паданні. Узнікненне мястэчка — так называлася цэнтральная частка Талькі — абавязана яўрэям. У XIX стагоддзі тут жыло толькі іудзейскае насельніцтва, а хрысціяне — у Слабодцы і Рудні. Сёння ў Тальцы няма ніводнага яўрэя, але засталася памяць пра іх, показкі, захаваліся і яўрэйскія вуліцы. Памятаюць Тальку і яўрэі — выхадцы з гэтага месца... У Тальцы захавалася шмат старых драўляных будынкаў, сярод якіх вылучаецца двухпавярховы дом чыгуначнікаў пры станцыі, пабудаваны ў XIX стагоддзі (у ім дагэтуль жывуць людзі).

Наталля правяла журналістаў «Звязды» якраз па гэтым маршруце, самым кароткім. Наша вандроўка заняла каля трох гадзін. І справа нават не ў тым, што цікава было даведацца пра тое, што сто гадоў таму тут працавала капялюшная майстэрня, ваўначоска, кузня, млын, маслабойня... Што вось у гэтым доме знайшлі скарб, а вось там была сінагога. Самае галоўнае, мы, няспешна крочачы па гэтай каларытнай і яшчэ поўнай жыцця вёсачцы з прыгожымі яскравымі дамкамі, мостам цераз разлітую Таль, драўлянай школай з садам, старымі дрэвамі і буслам, быццам пагрузіліся ў іншае вымярэнне. У гэтым вымярэнні распускаюцца пупышкі на дрэвах, у ім рэчы захоўваюць памяць пра людзей, час тут запавольвае свой бег, а паветра напоўненае адчуваннем вечнасці.

З гэтых мясцін родам Іосіф Жыновіч, славуты цымбаліст, імя якога носіць Нацыянальны аркестр народных інструментаў, ім жа створаны ў 40-я гады. Дагэтуль жывуць у вёсцы Арэшкавічы людзі, якія памятаюць і сям'ю Жыновіча, і яго самога. У Тальцы нарадзіўся і жыў да 17 гадоў народны артыст БССР, акцёр тэатра і кіно Іван Шаціла. У 50-я гады ў Талькаўскай школе працавалі пісьменнік Міхась Скрыпка і літаратуразнаўца Ларыса Кароткая. Ёсць каля Талькі вёска Паддзягцярная, адкуль родам два Героі Савецкага Саюза — Алена Мазанік, якая падклала міну ў ложак генеральнага камісара Беларусі Вільгельма Кубэ, і Мікалай Чэпік, які загінуў у Афганістане.

Пра маршрут «Талькаўскія скарбы» можна распавядаць доўга, бо ён багаты, як наша гісторыя, і непаўторна прыгожы, як нашы масціны. Самае галоўнае, што ёсць цікавы апавядальнік і знаўца, ёсць жывыя сведкі і ахоўнікі ведаў, традыцый, майстэрства. Але лепш за ўсё — выпрабаваць.

— Мы гатовыя быць першымі, — запэўніла класны кіраўнік 7 «а» класа Мінскай гімназіі-каледжа мастацтваў Людміла Пагодзіна. — Адпачыць на прыродзе, пабачыць новыя мясціны і шмат чаго пра іх даведацца — не сумняваюся, дзецям гэта спадабаецца і запомніцца.

Адна з галоўных асаблівасцяў Талькаўскага маршрута для школьнай групы — магчымасць паехаць на экскурсію-пікнік невялікай групай. Да Талькі можна даехаць на электрычцы, а значыць, заказваць аўтобус на 43 чалавекі няма неабходнасці. Гэта вельмі важна, бо адна з мэтаў такіх паездак — аб'яднаць дзяцей, зрабіць іх сябрамі. А калі едуць некалькі розных класаў, дасягнуць гэтага цяжка.

За свае паслугі правадніка і экскурсавода Наталля збіраецца з групы (у любым складзе) браць з разліку па 20 тысяч рублёў за дзве гадзіны. Яна мяркуе, што якраз столькі часу спатрэбіцца, каб давесці турыстаў да галоўнага пункта самай кароткай пятлі маршруту і па дарозе расказаць і паказаць шмат чаго цікавага і незвычайнага. Пасля адпачынку і абеду на прыродзе група ўжо самастойна можа вярнуцца да электрычкі.

Атрымліваецца, што для класа са сталічнай школы ў 20 чалавек паездка ў Тальку будзе каштаваць па 9 тысяч для кожнага плюс выдаткі на пікнік. Для параўнання: трохгадзінная экскурсія па Мінску (30 км) каштуе сама мала 17 500 рублёў для аднаго чалавека, пры ўмове, што ўся група налічвае 40 школьнікаў. Гэта таксама без улік харчавання. Таннасць — другая асаблівасць паездкі ў Тальку.

А яшчэ — большая свабода ў часе. Электрычкі з Мінска ў Тальку і назад ходзяць амаль штогадзінна, гэта значыць, дзеці могуць самі выбраць, колькі ім сядзець ля вогнішча альбо гуляць у пляжны валейбол, і ў якім тэмпе вяртацца на чыгуначную станцыю.

Што ж, застаецца спадзявацца, што прапанова талькаўскай настаўніцы і сапраўды зацікавіць патэнцыйных турыстаў, дзякуючы чаму нашы дзеці атрымаюць магчымасць адчуць водар гісторыі роднай зямлі, а Талька набудзе другое сваё жыццё.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
в. Талька Пухавіцкага раёна.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 2 ліпеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць электрапрас, кухонны камбайн, тэлевізар або печ ЗВЧ. Роз

СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



2			8					
8				6		3	1	9
3		5	1		4		2	
9			3					
							5	
		3			7			
4		7	9		9		3	
	3				6	8	9	2
		8			5			

СУДОКУ. У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожнym радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клетці, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Цяльцам варта асцерагацца інтрыг, а Шалям — зорнай хваробы

ВАЕН. Вы поўныя новых ідэй і натхнёна будуеце планы на будучыню? Не забудзьцеся абмеркаваць іх з блізкімі людзьмі — яны дапамогуць пазбегнуць недакладнасцяў і нават памылак. У панядзелак пажадана не рабіць сур'ёзных крокаў. Аўторак шчодры на падманы. Чацвер і пятніца зусім не прыдатныя для актыўных дзеянняў. У нядзелю не гневайцеся з-за дробязяў, будзьце больш мудрымі і цярплівымі.

ЦЯЛЕЦ. У пачатку тыдня давядзецца напружана працаваць, каб дабіцца жаданага выніку. Прыслухайцеся да голасу інтуіцыі і знайдзіце ключык да сэрца начальства, тады з'явіцца магчымасць прасоўвання па службе. Ад далёкіх паездак і камандзіровак у чацвер і пятніцу лепш адмовіцца, бо яны не апраўдаюць вашых надзей. Бліжэй да канца тыдня асцерагайцеся інтрыг, якія могуць закруціцца вакол вашай персоны.

БЛІЗНЯТЫ. На працягу амаль усяго тыдня вам будзе шанцаваць, так што лепш засяродзіцца на галоўным. У панядзелак з начальствам лепш не сустракацца: вам захочацца яго пакрытыкаваць, а яму — праверыць якасць вашай работы. У аўторак трэба быць больш добразычлівымі, чым звычайна — тады навакольныя людзі дапамогуць у многім. Пачынаючы з чацвярга з'явіцца рэальная магчымасць рэалізаваць свае планы, але для гэтага давядзецца прыкласці некаторыя намаганні.

РАК. Ініцыятыўнасць і сабранасць — вось якасці, якія проста неабходныя, каб кіраваць сітуацыяй. У аўторак пажадана дзейнічаць толькі законнымі шляхамі. Давядзецца кантраляваць сябе, свае эмоцыі, а гэта будзе не так проста. Інтэлектуальнае пачынанне ў першай палове тыдня прынясе поспех, а блізкія людзі могуць чакаць ад вас прыняцця важнага рашэння — не расчароўвайце іх.

ЛЕЎ. Жыццё, падобна, становіцца вясёлкавым. Варта лавіць момант і радавацца таму, што адбываецца. Цяжкасці таксама могуць з'явіцца, але іх не варта баяцца. Можаце адначасова праяўляць ветлівасць і настойлівасць, а менавіта гэта — каштоўны ключ да поспеху. У сераду, як відаць, варта сабрацца і адстаяць свае правы на працы. На гэтым тыдні паспяховай будзе барацьба са шкоднымі звычкамі: вы не толькі справіцеся з імі, але і дапаможаце іншым людзям.

ДЗЕВА. Зможаце пераадолець падсвядомыя страхі і вырашыць праблему, якая палохала. У сераду не бойцеся праявіць адкрытасць і прыняць чужы пункт гледжання: з вамі стане лягчэй знайсці агульную мову, і навакольныя могуць пайсці насустрач. У пятніцу тэрмінова прымайцеся за важныя праекты. У суботу не ганяйцеся за прывідамі — лепш планамерна ажыццяўляць задуманае.

ШАЛІ. Смеласць і рашучасць дазволяць рэалізаваць планы і пашырыць магчымасці. Можа ўзнікнуць спрыяльная сітуацыя, якая дазволіць больш імкліва прасоўвацца па службовай лесвіцы. Толькі не падхапіце зорную хваробу. Пастарайцеся не адмаўляць у дапамозе людзям, якія да вас звярнуліся.

СКАРПІЁН. Варта адказацца ад вострых адчуванняў: цяга да рызыкі пройдзе, а вось наступствы могуць сапсаваць жыццё надоўга. Зоркі рэкамендуюць кіравацца толькі асабістым здаровым сэнсам. Настае час прадэманстраваць таленты, якія даўно хаваеце: магчыма, навакольныя пераглядзяць сваё стаўленне да вас. У пятніцу непрадбачаныя абставіны могуць парушыць планы. У суботу не варта бурна рэагаваць на нязначныя, але аб'ектыўныя заўвагі з боку блізкіх людзей.

СТРАЛЕЦ. Вы цудоўна выглядаеце — проста на піку формы. Так што ёсць рэальная надзея, што ўдача ад вас цяпер не адвернецца. У панядзелак і чацвер варагодныя канструктыўныя і шматабяцальныя дзелавыя сустрэчы. Яны, калі пашанцуе, адкрыюць перад вамі цудоўныя перспектывы. У аўторак павышаная працаздольнасць дазволіць справіцца з многімі справамі, якіх назапасілася. Вынікі ж у многім будуць залежаць ад акуратнасці.

КАЗЯРОГ. Каб тыдзень прайшоў плённа і спакойна, пастарайцеся пазбягаць размоў і спрэчак з навакольнымі, нават калі яны датычацца вашай прафесійнай кампетэнтнасці. Варта чакаць з'яўлення нязначных цяжкасцяў, якія звязаны, перш за ўсё, з працай. Калегі не заўсёды будуць пра вас самага лепшага меркавання, але да іх слоў не варта прыслухоўвацца. Дзейнічайце самастойна і толькі ў выключных выпадках шукайце чужой парады.

ВАДАЛЕЙ. Асноўную частку часу паглыне работа. У панядзелак пажадана паставіць перад сабой канкрэтную мэту і дакладна прытрымлівацца яе. Гэты дзень можа аказацца цікавым і насычаным падзеямі. Важна правільна размеркаваць сілы і энергію. Сярэдзіна тыдня — цудоўны момант для стварэння падмурка будучага прасоўвання па кар'ернай лесвіцы. Аўторак і серада — спрыяльныя дні для сяброўскіх сустрэч.

РЫБЫ. Пажадана не спяшацца, прытрымлівацца пэўных правілаў і стрымліваць унутраныя супярэчлівыя парывы. У пачатку тыдня магчымыя праблемы з начальствам. На працы можа з'явіцца канкурэнт. Будзьце больш актыўнымі і прадбачлівымі, інакш вашы пазіцыі могуць пахіснуцца. Перагледзьце некаторыя прынцыпы. Выхадныя прымусяць пахвалявацца, але гэтыя хваляванні будуць прыемнымі.

Віншую **з днём нараджэння** любаю дачку **Вольгу Валянцінаўну КУШНЕР** з Оршы. Жадаю моцнага здароўя і радасці ў жыцці.
Тата.

З рынку адклікаюцца некалькі найменняў растваральнай кавы

На стужках інфармацыйных агенцтваў з'явілася навіна пра тое, што кампанія «Нестле» адклікае з рынку некалькі найменняў растваральнай кавы, у тым ліку і ў Расіі.

Паведамлялася, што ў якасці папераджальнай меры адкліканню падлягае растваральная кава Alta Rica, Cap Colombia, Estet, Kenjara і Espresso. Гэта імпартуемыя прадукты са спецыяльнай серыі кавы Neskafe вагой 100 грамаў, якія ўпакоўваюцца ў слоікі асаблівага тыпу, пакрытыя пластыкавай абалонкай. Некаторыя з гэтых слоікаў могуць патрэскацца падчас транспарціроўкі, у выніку чаго могуць утварыцца дробныя часцінкі шкла. Гэтае адкліканне не распаўсюджваецца на іншыя прадукты лінейкі Nescafe, якія ёсць у продажы на расійскім рынку. У расійскім офісе кампаніі ТАА «Нестле Расія» ўдакладнілі, што клиенты «Нестле» ў Расійскай Федэрацыі ўжо праінфармаваныя пра гэтае рашэнне, іх папрасілі прыпыніць продаж названых прадуктаў і вярнуць іх кампаніі. А што ў сувязі з вышэйагучаным адбываецца ў Беларусі? З гэтым пытаннем мы звярнуліся ў прадстаўніцтва ў нашай краіне ТАА «Нестле Расія».

Учора нам патлумачылі, што прадстаўніцтва кампаніі «Нестле» ў Рэспубліцы Беларусь абвяшчае пра добраахвотнае адкліканне, у якасці папераджальнай меры, тых жа найменняў растваральнай кавы, што і ў Расіі. Гэтае адкліканне не распаўсюджваецца на іншыя прадукты кампаніі Nescafe, што ёсць у продажы на рынку ў Беларусі.

«Гаворка ідзе толькі аб прадуктах, што ўпакаваныя ў слоік спецыяльнага тыпу. Кампанія будзе працаваць над зменай формы ўпакоўкі, найперш чым прапануе гэты прадукт на рынку». Прадстаўніцтва прыносіць свае прабачэнні спажыўцам і клiентам за прычыненыя нязручнасці. Кліенты і партнёры ў нашай краіне ўжо паінфармаваныя пра такое рашэнне. **Далей прадстаўніцтва заклікае ўсіх спажыўцоў, у каго ёсць такія прадукты, устрымацца ад іх спажывання і звязацца з афіцыйным дыстрыб'ютарам прадукцыі кампаніі «Нестле» на тэрыторыі Беларусі ТДА «Мостра-груп» па тэлефоне +375 17 389 06 00 для ўдакладнення працэдуры кампенсацыі кошту набытых тавараў.**

Сяргей РАСОЛЬКА.

Былы начальнік Бабруйскага аддзела ДАІ падазраецца ў хабарніцтве

Упраўленне Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Магілёўскай вобласці распачало адразу дзве крымінальныя справы за атрыманне хабару асобай, якая займае адказнае становішча, і падбухторванне да хабарніцтва. Гэтыя крымінальныя справы датычацца былога начальніка аддзела ДАІ УУС Бабруйскага гарвыканкама.

Следства вызначыла, што ў снежні 2009 года гэты чалавек пры пасярэдніцтве 40-гадовага непрацуючага бабруйчаніна атрымаў 200 долараў за станоўчае вырашэнне пытання аб здачы экзаменаў на атрыманне вадзіцельскага пасведчання.

Потым ён звольніўся з праваахоўных органаў, але ў сёлетнім сакавіку па папярэдняй змове з пасярэднікам схіліў работніка камерцыйнага прадпрыемства даць хабар 200 долараў за атрыманне вадзіцельскага пасведчання. Пры атрыманні хабару пасярэднік быў затрыманы.

Ва УДФР паведамілі, што былы начальнік аддзела ДАІ арыштаваны, вядзецца следства.

Ілона ІВАНОВА.

Ну вось, дарагія нашы чытачы, мы і дажылі да сапраўднага лета. Як час ляціць, здаецца, толькі новы год адзначалі, а ўжо Сёмуха! На Сёмуху раней абавязкова гатавалі караваі. Цяпер пякуць усё смачненькае — піражкі, слоенкі, пернікі, коржыкі. Таму мы з вамі таксама сёння будзем пячы пірог і гатаваць святочны абед, на які трэба па традыцыі склікаць гасцей.

Судак фаршыраваны

Нам спатрэбіцца: тушка судака, і для фаршу: 2 ст. лыжкі грэцкіх арэхаў, 1/2 сталовай лыжкі разынак, зяленіва, чайная лыжка алею.

Рыбу разраэаем па брушку. Вымаем вантробы і асцярожна аддзяляем хрыбет так, каб знешняя абалонка: галава, скурка рыбы, большая частка філе, тулава з плаўнікамі і хвастом былі цэлымі. Рыбу нацерці соллю. Цяпер у поласць брушка кладзём фарш і зашываем ніткай. Рыбу выкласці на бляху. Паліць алеем. Паставіць у духоўку. Падчас выпечкі, перыядычна паліваць рыбу.

Рыба ў часночным соусе

Вазьміце: 700 г філе тлустай рыбы, 1/2 шклянкі лімоннага соку, 7 зубкоў часнаку, 1 ст. лыжку алею, соль, зяленіва.

Філе выкласці ў каструлю, заліць падсоленай гатаванай вадой і патушыць на слабым агні 3-4 хвіліны, затым акуратна дастаць шумоўкай так, каб рыба не развалілася. Пасля ахаладжэння пакласці ў эмаліраваны посуд, заліць лімонным сокам і вытрымаць у халадзільніку 1,5-2 гадзіны.

Прыгатаваць соус: расцерці здробнены часнок з соллю, дадаць алей, заправіць сокам лімона. Пры падачы на стол рыбу заліць часночным соусам і ўпрыгожыць зяленівам.

Суп з хатняй локшынай

Нам спатрэбіцца: 1 цыбуліна, па адным корані морквы і пятрушкі, 2 ст. лыжкі алею, спецыі, соль. Для лакшыны: 1 шклянка мукі, соль, крыху гатаванай астуджанай вады.

Цыбулю і дробна нашаткаваныя карані спасераваць у алеі і ўвесці ў кіпячую падсоленую ваду. Дадаць спецыі. У кіпячы булён засыпаць локшыну. Варыць 5—10 хвілін. Прыгатаванне локшыны з мукі, вады, солі: старанна замясіць пластычнае крутое цеста. Цеста раскачаць вельмі тонка. Даць раскачаным пластам крыху падсохнуць, разрэзаць на палосы і дробна нашаткаваць. Нявыкарыстаную локшыну высушыць і захоўваць у слоіку пад пергаментнай накрыўкай.

Пірог з чорнымі парэчкамі

Вазьміце: 250 г мукі, 150 г цукру, 10 г ванільнага цукру, 1/4 чайнай лыжкі солі, 100 мл алею, 160 г замарожаных чорных парэчак (можна выкарыстаць любыя ягады, якія вы замарожвалі).

Ягады размарозіць. У міску прасеяць шклянку мукі, дадаць соль, цукар, ванільны цукар, 6 ст. лыжак ледзяной вады, алей. Перамяшаць, дадаць астатнюю прасеяную муку з содай (на кончыку нажа). Замясіць эластычнае цеста, загарнуць у плёнку, паставіць у халадзільнік на 1 гадзіну. Духоўку ўключыць на 180 градусаў, форму змазаць алеем. Цеста падзяліць на 2 часткі: адну — большую, другую — крыху меншую.

Раскачаць большую частку, выкласці ў форму, зрабіць борцікі.

У ягады дадаць муку і цукар, перамяшаць. Зверху размеркаваць начынку.

Раскачаць меншую частку цеста, накрыць пірог зверху, акуратна зашчыпаць краі, змазаць пірог алеем з дапамогай пэндзліка, пасыпаць цукрам, у сярэдзіне зрабіць невялікую адтуліну для выхаду пары. Выпякаць пірог хвілін 30—35, ён дрэнна падрумяньваецца, таму не варта ператрымліваць яго ў духоўцы, праверыць толькі на гатоўнасць само цеста, праткнуўшы зубачысткай. Астудзіць пірог крыху ў форме, затым перакласці на талерку.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

МЕНЮ ЗДАРОЎЯ

Паравое харчаванне

Сёння ў модзе імкненне пераслiць лішнія кілаграмы і заўчасную старасць, захаваць здароўе і бадзёры выгляд. Адзін са спосабаў перамагчы ў гэтай барацьбе — ужыванне ежы, прыгатаванай на пары. Пра карысць такога харчавання сказана шмат, тым не менш пытанні застаюцца. Не сакрэт, што ежа, прыгатаваная на пары, — самая дыетычная. Дык наколькі смачна, хутка, практычна і карысна гатаваць такім спосабам ежу?

Карысць ежы, прыгатаванай на пары

Прадукты амаль не губляюць вітамінаў і мікраэлементаў, свайго натуральнага колеру і формы пасля апрацоўкі парай. Ежа атрымліваецца прыгожай, духмянай, сакавітай і смачнай.

Менавіта такая ежа з'яўляецца цалкам дыетычнай стравай, бо змяшчае мінімум тлушчаў. У гэтых стравах застаецца максімум водараствараль ных мінералаў і вітамінаў (С, А).

Каларыйнасць пры гэтым нашмат ніжэйшая менавіта дзякуючы адсутнасці высокакаларыйных алею і масла, якія да таго ж утвараюць у працэсе смажання шкодныя для арганізма канцэрагены. Паравая ежа — гэта выдатны варыянт для тых, хто марыць пахудзець без фізічных практыкаванняў. Харчуючыся штодня такой ежай, вы не будзеце зведваць пачуцця голаду, але пры гэтым зможаце і скінуць некалькі кілаграмаў.

Хуткасць прыгатавання

Дзякуючы сучасным кухонным прыборам, а менавіта мікрахвалевай печы і параварцы, часу на прыгатаванне здаровай і смачнай ежы траціцца зусім мала. У параварцы адначасова можна гатаваць некалькі страў і не хвалявацца пра тое, што стравы могуць прыгарэць. Гэта моцна эканоміць час, а смакі розных страў пры гатаванні не змешваюцца. Існуе і самы просты спосаб прыгатавання ежы на пары, калі, напрыклад, у вас няма спецыяльнай параваркі: каструля з вадой, на якой зверху знаходзіцца друшляк ці спецыяльная рашотка, шчыльна зачыненая накрыўкай.

Практычнасць прыгатавання

Працэс прыгатавання на пары не патрабуе пастаяннага назірання. Няма неабходнасці нешта перамешваць і пераварочваць — ежа гатуецца раўнамерна. Пара не асядае на кухонных рэчах і не ўтварае тлушчавых плямаў на мэблі.

Асаблівасці прыгатавання

Не трэба занадта дробна наразаць прадукты, інакш можа атрымацца слізкая аднародная маса. Для забеспячэння лепшага тэрміну прыгатавання і раўнамернага ўздзеяння пары прадукты трэба закладваць не вельмі шчыльна. Існуе пэўная група прадуктаў, якія гатаваць у параварцы нельга, — пераспелыя і злёгку сапсаваныя садавіна і агародніна, бо для паравога гатавання прадукты павінны быць у сырым выглядзе цэлымі і шчыльнымі.

Гатаваць у параварцы можна многае — катлеты, агародніну, рыбу. У паддоне для прыгатавання агародніны ўтвараецца вельмі карысны булён.

Каму рэкамендуецца паравая ежа

Паравая ежа асабліва карысная для людзей, якія пакутуюць ад захворванняў страўніка і кішэчніка. Гэта найлепшая дыета пры язве страўніка і дванаццаціперснай кішкі, гастрытах, захворваннях сардэчна-сасудзістай сістэмы, калі для паніжэння ўзроўню халестэрыну ў крыві выключаюцца тлушчы і вострыя стравы.

Для дзяцей і людзей старэйшага веку паравая ежа неабходна таму, што яна лягчэй засвойваецца, чым ежа, прыгатаваная іншымі спосабамі.

ЦІКАВА ВЕДАЦЬ

Дапаможа карыца

Карыца — смачны спосаб змагацца з халестэрынам. 1-2 ч. лыжкі карычневага парашку на дзень дастаткова, каб панізіць колькасць цукру ў крыві і трымаць сасуды ў тонусе. Павялічваецца здольнасць клетак усмоктваць і перапрацоўваць глюкозу. У выніку кроў па сасудах цыркулюе хутчэй. З карыцай можна гатаваць не толькі смачныя булачкі, смела дадавайце яе ў салаты ці да мясных страў. А таксама можаце накапаць крыху масла карыцы ў аромалямпу — і дыхаць, пакуль гатуеце вячэру.

-2660-

МАЛЕНЬКІЯ ХІТРАСЦІ

Выбіраем махровы ручнік

Калі вы хочаце, каб новы махровы ручнік добра ўсмоктваў вільгаць і не губляў мяккасці, пры набыцці звярніце ўвагу на наступныя моманты.

Усмоктванне

Прачытаўшы на этыкетцы, што ручнік зроблены з бавоўны, не цешце сябе ілюзіямі: бавоўна бавоўне не роўня. Лепш за ўсё ўсмоктваюць вільгаць ручнікі, выраблены з егіпецкай і пакістанскай бавоўны. На ўсмоктванне ўплывае таксама і тып пражы — яна бывае адзіночная, двайная, кручаная і зачэсаная. Менавіта апошняя спраўляецца з вільгаццю лепш за ўсё.

Шчыльнасць

Чым вышэйшая шчыльнасць ручніка, тым даўжэй ён паслужыць. На этыкетцы шчыльнасць не пазначаецца, таму арыентуйцеся на вагу — добры ручнік не можа быць надта лёгкім. Напрыклад, махровы ручнік памерам 70х140 см і шчыльнасцю 500 г/кв.м (добрая шчыльнасць) будзе важыць каля 500 г.

Наяўнасць сінтэтыкі

Яе дадаюць, каб ручнік быў мяккім навобмацак. На гэтым станоўчыя якасці сінтэтыкі заканчваюцца: з-за яе ручнік горш усмоктвае ваду. Пакольскі на этыкетцы не пазначаецца, ці ёсць у складзе ручніка сінтэтыка, праверыць гэта можна адным спосабам. Купіце невялікі ручнік з упадабанай серыі і ўжо дома правядзіце ім па мокрай паверхні, пажадана шкляной. Калі на ёй засталіся разводы, значыць, у ручнік дададзена сінтэтыка, калі паверхня стала сухой, можна набываць спакойна і вялікі ручнік з гэтай серыі.

Выснова: якасны махровы ручнік — гэта 100 % бавоўна без сінтэтыкі, выраблены з зачасанай пражы з даўжынёй ворсу 5 мм, шчыльнасцю не менш чым 500 г/ кв. м.

Ворс

Даўжэй за ўсё служыць ручнік з ворсам у 5 мм. Больш доўгі ворс стварае ўражанне гушчыні, але вельмі хутка лямчыцца і губляе свой таварны выгляд. Ад ручніка з кароткім ворсам (менш за 3-5 мм) не чакайце добрага ўсмоктвання вільгаці, а з часам ён становіцца жорсткім.

ЯК ДАГЛЯДАЦЬ

Прытрымліваючыся гэтых правілаў, вы падоўжыце прыгожае і пушыстае жыццё вашага ручніка.

Мыццё

Перад першым выкарыстаннем ручнік абавязкова памыйце: ён стане больш пушыстым, будзе лепш усмоктваць вільгаць, ды і ў мэтах гігіены гэта неабходна.

Тэмпература мыцця для махровых вырабаў не павінна перавышаць 60 °С, пральную машыну лепш загружаць не менш чым на 70 %. Акрамя таго, мыйце ручнікі парашком для каляровай бялізны на сыраднях абаротах (не больш за 800), інакш могуць выцягнуцца вочкі.

Вялікія дозы кандыцыянера адмоўна адбіваюцца на вільгацепаглынальных уласцівасцях ручніка. Аднак кандыцыянеры, у склад якіх уваходзіць сілікон, павялічваюць здольнасць ручніка ўсмоктваць вільгаць.

Прасаванне

Каб захаваць пушыстасць ручнікоў, не прасуйце іх, а проста сушыце натуральным спосабам. Калі вы вырашылі ўсё ж папрасаваць ручнікі, то абавязкова выкарыстоўвайце адпарвалнік і прасуйце праз вільготную тканіну. Тэмпература награвання праса павінна быць не больш за 150 °С.

-2661-

ТРАЕЦКАЯ ПАМІНАЛЬНАЯ ВЯЧЭРА

Траецкая субота займала ў сістэме памінання продкаў вельмі важнае месца. Пра гэта сведчыць характар падрыхтоўкі да самога свята: ён у пэўнай ступені нагадваў перадвелікоднае абнаўленне хаты і падворка. Хлопцы старанна вымяталі двор, гаспадыня з дочкамі прыбралі ў хаце: абнаўлялі фіранкі, вешалі новы ручнік-набожнік, выбіралі попел у печы. Асаблівая ўвага надавалася чырвонаму куту.

● Як на Восеньскія Дзяды, так і на Траецкія гаспадыня гатавала няцотную колькасць страў, сярод якіх зноў-такі былі тыя, якія з'яўляліся абавязковым атрыбутам усіх жалобна-памінальных сталоў: перш за ўсё бліны, асабліва грэчневыя, ячная або пшонная каша, яечня, просвірка, купленая ў храме, або яе вясковы абрадавы эквівалент — «канон» («канун») з крышанага хлеба, размочанага ў вадзе з мёдам. Калі выпякалі хлеб пшанічны, то ў «канон» дадавалі тоўчаны мак. Адной з абавязковых памінальных страў быў ягадны кісель.

● Правядзенне святочнай урачыстасці адбывалася за вялікім сямейным сталом, які ставілі не так, як заўсёды — паралельна асноўным слівым лініям, уздоўж сцяны ад двара, а, наадварот, пад трэцяй — радаводнай — бэлькай: ад чырвонага кута і ўздоўж сцяны ад вуліцы. У чырвоным куце садзіўся гаспадар, злева ад яго — жаночая палавіна сям'і, справа мужчынская. Памінальная вячэра пачыналася з малітвы і рытуальнага запрашэння душаў памерлых продкаў да сумеснага сталавання: «Мама, дзеду, прадзеду, і ўсе душачкі, каторыя ёсць на гэтым месцы бывалі, хлеба і солі зажывалі, просімо да абеду!» . Заўважым, што ў некаторых сем'ях пералік радаводных пакаленняў — мама, дзядуля, прадзед і інш. — меў характар дакладнай канкрэтызацыі: імёны даўно памерлых сваякоў былі «запісаны» («упісаны» на другой бэльцы хаты, якая і выконвала ролю радаводнай кнігі. Таму і гэты жалобны стол ставілі ўпоперак хаты, непасрэдна пад бэлькай. На самым пачатку па чарзе пускалі абрадавую кашу або «канон»: кожны з прысутных браў з агульнай місы па тры лыжкі. Затым адбывалася самае галоўнае абрадавае дзеянне, якое было квінтэсенцыяй, сімвалам памінальнай трызны, знакам спаянасці, луччасці, непадзельнасці розных пакаленняў людзей — жывых і памерлых. Гэтым амулетам-абярэгам і адначасова знакам родавай непарыўнасці была чарка, якая перадавалася зноў-такі па чарзе і была за сталом толькі адна.

● Часцей за ўсё асноўныя стравы-закускі таксама падаваліся ў адной місе, з якой кожны браў па старшынству. Але першую лыжку ўсе прысутныя (і абавязкова кожнай ад стравы) адкладвалі ў агульную місу, якую затым ставілі ў адной з рытуальных зон хаты: на покуці, на парозе або на падаконніку.

● Вячэра працягвалася нядоўга. Людзі елі моўчкі, гаварыць дазвалялася толькі старэйшым членам сям'і, якія дзяліліся успамінамі аб дзядах-прадзедах, засяроджваючы ўвагу на больш важных падзеях і на тых постацях, жыццё якіх ужо даўно «абрасло» легендамі.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

22 мая

1706 год — шведскія войскі штурмам авалодалі Лідскім замкам і разбурылі яго; былі спалены гарады Нясвіж, Клецк, Полацак, Навагрудак, узарваны Навагрудскі замак, абложаны горад і крэпасць Ляхавічы. Шведы прайшлі па тэрыторыі цэнтральнай Беларусі, руйнуючы маёнткі шляхты, якая падтрымлівала саюз з Расіяй.



1906 год — амерыканскія вынаходнікі і пілоты браты Райт запатэнтавалі першы самалёт.

«Хто ўмее задавальняцца нямногім, той па-сапраўднаму багаты».

Карла Гальдоні (1707—1793), італьянскі драматург.

Усміхнемся!

Стандартная сітуацыя — на скрыжаванні спыняецца 600-ы і ў яго ззаду заязджае «Запарожац». Новы рускі (НР) выйшаў з «Мерседэса»:

— Мужык, ты што?..

— Ды, разумееш, тармазы не працуюць. Выбачай.

Падумаў НР, усё адно з уладальніка «гарбатага» ўзяць няма чаго і зноў сеў у сваю машыну. На наступным скрыжаванні сітуацыя паўтараецца. НР нават з машыны выходзіць не стаў. Ізноў скрыжаванне, ізноў «Запарожац» целуе зад «мэрса». НР выходзіць і кажа:

— Чуеш, мужык, я тут направа паварочваю. Далей выкручвайся як хочаш.

☺

Калі ў спрэчцы нараджаецца прапанова выпіць, значыць, спрэчка яшчэ не скончаная.

☺

Мужык пасля свайго вяселля прыходзіць на працу. Калегі:

— Ну і як першая шлюбная ноч?

— Не памятаю! Я прытомнасць страціў ужо пасля таго, як яна вейкі адклеіла.

☺

Добра — гэта калі экзамен здадзены на «тры». Выдатна — гэта калі з першага разу.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.57	21.16	16.19
Віцебск —	4.40	21.13	16.33
Магілёў —	4.47	21.07	16.20
Гомель —	4.51	20.56	16.05
Гродна —	5.13	21.30	16.17
Брэст —	5.21	21.23	16.02

Месяц

Першая квадра 21 мая.
Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Іосіфа, Ісая, Мікалая.*

К. *Алены, Рыты, Юліі, Рамана, Урбана, Эміля, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 2455. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12